*Без вачэй тваіх добрых, ясных*
*Пуста, холадна на зямлі.*

*Без шчырай тваёй усмешкі*
*Пуста, холадна на зямлі.*

*Без пяшчоты рук тваіх цёплых*
*Пуста, холадна на зямлі.*

*Без падтрымкі тваёй надзейнай*
*Пуста, холадна на зямлі...*

*Л. Гарановіч*

# Пагавары са мной...

Памяці Віталя Гарановіча

Мінск, «Кнігазбор», 2015

УДК 821.161.1
ББК 84(4Беи)
П12

Укладанне
Лілія Гарановіч

Сям'я Віталя Гарановіча выказвае падзяку настаўнікам СШ № 3 г. Глыбокае і Глыбоцкай раённай гімназіі, Ю. П. Калбасічу

**Пагавары са мной...** : Памяці Віталя Гарановіча / укл. Л. Гарановіч. — Мінск : Кнігазбор, 2015. — 296 с.
П12 ISBN 978-985-7119-24-0.

Кніга «Пагавары са мной...» — гэта спроба сабраць разам творы пісьменніка Віталя Рыгоравіча Гарановіча (1952–2012), а таксама матэрыялы, прысвечаныя яму.

**УДК 821.161.1**
**ББК 84(4Беи)**

**ISBN 978-985-7119-24-0**

© Гарановіч Л., уклад., 2014
© Афармленне. ПУП «Кнігазбор», 2014

## Гарановіч Віталь Рыгоравіч

Нарадзіўся 7 студзеня 1952 года ў вёсцы Ермакі Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. З 1959 па 1967 год вучыўся ў Ермакоўскай васьмігадовай школе. У 1969 годзе закончыў Хоўхлаўскую СШ. На працягу 1970–1972 гадоў служыў у Савецкай Арміі ў Прыкарпацкай ваеннай акрузе. Пасля арміі некаторы час працаваў у выдавецтве «Вышэйшая школа», а затым на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» ў Мінску. З 1973 па 1977 год — студэнт філалагічнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Пасля заканчэння інстытута працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Задарожскай васьмігадовай школы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. З 1979 па 1983 год узначальваў Кіраўскую сярэднюю школу на Глыбоччыне. На працягу 1983 па 2004 год — дырэктар СШ № 3 горада Глыбокае. У 2004 годзе выбраны старшынёй Глыбоцкага райкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

Друкавацца пачаў рана. У школьны час вершы змяшчаліся на старонках рэспубліканскага часопіса «Бярозка», раённай газеты «Святло камунізму». У гады службы ў арміі актыўна супрацоўнічаў з рэдакцыяй ваеннай газеты «Слава Родины» Прыкарпацкай ваеннай акругі. Студэнтам філфака дру-

каваўся ў інстытуцкай газеце «Савецкі настаўнік». У 1978 годзе выступіў з падборкай вершаў у рэспубліканскім часопісе «Маладосць». У гэтым самым годзе з'явілася першая публікацыя вершаў на старонках штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». З гэтага часу рэгулярна друкуецца ў раённым, абласным і рэспубліканскім друку.

Неаднаразова ўдзельнічаў у літаратурных семінарах у Каралішчавічах. У 1997 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў першы зборнік вершаў «Беразвечча», які быў адзначаны складальнікамі анталогіі беларускай паэзіі XX стагоддзя «Краса і сіла»: «…хоць запозненая, але яркая кніга». Кніга была станоўча ацэнена беларускай крытыкай.

Наступныя лірычныя зборнікі: «Святло блакіту» (2002), «Саракі» (2007), «Нараджэнне вады» (2011) выйшлі ў выдавецтве «Беларускі кнігазбор». Гэтае ж выдавецтва ў 2003 годзе выпусціла зборнік песень «Глыбоцкі вальс» (у сааўтарстве з самадзейным кампазітарам Г. Шаколай).

Лаўрэат літаратурнай прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2009 года (прэмія прысуджана за кнігу вершаў «Саракі»).

Памёр 17 красавіка 2012 года. Пахаваны на могілках вёскі Рабунь Вілейскага раёна.

# Ён будзе жыць у памяці нашчадкаў

## Незабыўны

Здаецца, ён кажа мне:
«Дажджы палеткі прамыюць
І шыбы ў родным акне.
Глядзі ў прастору, Марыя,
Звіні на думнай струне.
Звіні, паэтка, у неба —
Пачуе, мабыць, хто-небудзь.
На белым свеце няма мяне.
Ці там сумуюць, ці не?
Калі б я жыў — закружыў
Вырай у небе веснім
Песняй…
Пра Саракі».

Споўнілася два гады, як не стала паэта Віталя Гарановіча. Ён быў сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў. Пра яго мала пісалі, толькі ў раённай газеце…

Сумуем. Помнім. Памяць чуе голас брата. І таксама чуе голас Віталя Гарановіча. Я з ім гаварыла пра тугу, пра свой стан душы. Пра што не магла пагаварыць з іншымі. Ён слухаў і разумеў. У віры рознага смутку, які выпаў на маю душу, не паспела забраць з рук Віталя кнігу «Нараджэнне вады» і сказаць яму — ад сябе, свайго ўспрымання, захаплення — пра ягоны метафарычны талент. Чалавеку трэба гаварыць

хвалу, прызнанне жывому. І ствараць удзячнасць Богу за нас на белым свеце. Бо белы свет — нам падарунак, і мы нешта значым для Творцы і з’яўляемся падарункам сваёй чалавечай грамадзе. Калі жывём зацікаўлена, удзячна, шчодра і светла-зычліва.

Віталь Гарановіч меў захапляльную душу. Быў чалавекам працы і гаспадар свайго дому. Ён — працаўнік на ніве беларускай асветы. Паэт, які рос, дакранаючыся да ўсіх граняў працоўнага чалавечага жыцця. І душой рос, дакранаючыся да неба зямнога. Ён назіральны. Яго іскрынка, дадзеная звыш, заўсёды разгаралася ад старання душы, праз думку выяўлення. І праз разумны давер таксама. З рукапісам зборніка «Саракі» Віталь звярнуўся да мяне як да стылёвага рэдактара. І што цікава — прыняў усе мае праўкі, скарачэнні. Не згадзіўся толькі з адной заўвагай, дзе, відаць, хацеў даць вобраз раздолля. У гэтым яго даверы хавалася відушчая згода. Бо заўсёды майстру трэба нехта другі, каб пачытаў і заўважыў. Паэт Гарановіч стварыў простыя і нечаканыя вобразы. Ён быў каштоўным настаўнікам для вучняў. А для паэтычнага чытача — скарбам для захаплення. Сёння я чытаю зборнік «Нараджэнне вады». Ёсць вершы — суцэльныя, цудоўныя метафары, у якіх адлюстроўваецца здзіўленне светам прыроды. Ачалавечаныя вобразы лагодзяць чытача, які адчувае ягонае «сонца, як гаючы крэмень», хоць і «ступіць восень у прыроду з маладзіком на галаве». І пры ўсім лірызме паэт Гарановіч хвалебна, ганарова пяе славу Радзіме. Размашысты ў радках, шчодры ў фарбах хвалы. Віталь Гарановіч у вершах рамантычна-ўзнёслы, аб’ёмны, маляўнічы і жыццярадасны.



Душа ягоная, здаецца мне, у высі.
Дзе прамянёў святла не затушыць.
Падняў сыноў. І вершы засталіся
Для новай захапляльніцы-душы.

*Марыя БАРАВІК.*
*«Літаратурная Беларусь», 30 мая 2014 года*

## Яго Беразвечча

І сягоння з непрыцішаным болем бяру з кніжнай паліцы яго невялічкі па аб'ёме і такі ёмкі па змесце першы паэтычны зборнік, выпушчаны ў свет выдавецтвам «Мастацкая літаратура» напрыканцы мінулага стагоддзя — у 1997 годзе. «Беразвечча» — гістарычна дакладную назву мае кніга паэта. На Глыбоччыне, якая стала крыніцай творчага натхнення незабыўнага Віталя Рыгоравіча Гарановіча, гэтае назоўнае слова вядома сваім шчымотным трагізмам кожнаму жыхару; па дарозе на азёрны Браслаў, ва ўрочышчы Барок, ёсць брацкая магіла, якая дала апошні прытулак тысячам нашых суайчыннікаў і паўтары тысячы італьянцаў, якія былі расстраляны фашыстамі ў 1942 годзе.

Ахвяр самотная паляна,
Гадамі сцёртыя груды.
Тут беларусам і рымлянам
Стаў бор як чорны знак бяды.
На гэтым месцы ўсім балюча
Будзь літасцівым, час, прашу
Тут памяць, быццам дрот калючы,
Сціскае сэрца і душу.

Мне выпала быць выдавецкім рэдактарам гэтае кнігі. І ў сваім горычным слове-ўспаміне пра сябра мушу праз гады прызнацца: не прахалоджана-планавай была для мяне праца над рукапісам будучага зборніка вершаў, а пачуццёва-кранальнай, прасветленай таленавітасцю паэтычных радкоў, самім душэўным хараством роднага слова. А з шэрагу магчымых назваў зборніка сышліся на «Беразвеччы», вырашыўшы, што гэта сама Глыбоччына — яе трагічная памяць.



Неўзабаве пасля выхаду ў свет першай кнігі паэта адбылася яе прэзентацыя ў актавай зале трэцяй глыбоцкай школы. А на ўспамін аб гэтай літаратурнай сустрэчы Віталь Рыгоравіч пакінуў на тытульнай старонцы «Беразвечча» наступны аўтограф:

*Цяпло сяброўскае рукі,*
*Як і каханне, лёс даруе.*
*Шчаслівы, хто яго адчуе*
*Душэўны дотык трапяткі...*

*Мікалай Міхайлавіч! Гэта табе ад сэрца. З удзячнасцю Віталь Гарановіч. 15.02.1997. Глыбокае.*

Багата разоў мне выпадала бываць і ў Глыбокім, і на Глыбоччыне. І заўсёды сустракаўся з Віталем Гарановічам, не абмінаў яго трэцюю школу, дзе ён доўгі час працаваў дырэктарам. Гэта была сапраўды ўзорная беларуская школа, дзе працаваў калектыў педагогаў-аднадумцаў, па-сапраўднаму заклапочаных будучым лёсам нашай Айчыны. Спадзяюся, што сам гарановічаўскі дух, яго дырэктарскія турботы і сягоння не выстылі ў яе сценах, зберагаюцца і прымнажаюцца яго паслядоўнікамі. Летась, падчас Свята беларускага пісьменства, мне выпала зноў пераступіць парог гэтае школы, прыгадаць яе незабыўнага дырэктара і нашага слыннага паэта ў сябрыне вядомых пісьменнікаў свету, пажадаць глыбачанам, каб тое, што зроблена за жыццё Віталем Рыгоравічам і ў паэзіі, і ў прафесійнай дзейнасці, не сцерлася з памяці.

*Мікола МЯТЛІЦКІ,*
*лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.*
*«Веснік Глыбоччыны», 17 красавіка 2013 года*

## Яго прызванне — быць паэтам

З Віталем Гарановічам пазнаёміўся завочна ў 1977 годзе; на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» была змешчана падборка ягоных вершаў, а ў біяграфічнай нататцы адзначалася: настаўнік Задарожскай школы Глыбоцкага раёна.

У кожнага свая дарога жыцця. Хтосьці стаў шафёрам, хтосьці механізатарам, а цікаўны і дапытлівы Віталь выбраў прафесію настаўніка. Філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага ён закончыў у 1977 годзе, па размеркаванні трапіў на Глыбоччыну, якая стала для яго другой малой радзімай. Тут Гарановічы звілі сваё сямейнае гняздо, выгадавалі трох сыноў. Менавіта тут выспеў, узмужнеў самабытны талент паэта, і, можа, па гэтай прычыне ён столькі цудоўных вершаў прысвяціў гэтаму дзіўнаму куточку беларускай зямлі. «Глыбокае», «Азёры Глыбоччыны», «Беразвечча», «Глыбоцкае танга», «Глыбоцкі вальс»… Ужо даўно вершы гэтыя на слыху, а ўсяго на глыбоцкія матывы паэт напісаў больш за дзясятак твораў.

Працуючы настаўнікам, пасля — дырэктарам (калектыў СШ № 3 Віталь Рыгоравіч узначальваў больш за 20 гадоў), паэт не меў шмат часу для творчасці. А калі знаходзіў яго, то тварыў няспешна, удумліва, падбіраючы слоўка да слоўка.

У 2007 годзе ў адным са сталічных выдавецтваў выйшла ў свет кніга выбраных вершаў Віталя Гарановіча «Саракі», у якую ўвайшлі творы з ранейшых зборнікаў — «Беразвечча», «Святло блакіту» — і новыя. Паэт на той час ужо працаваў старшынёй райкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. А праз два гады яму прысудзілі прэмію Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.



У тым, што на глыбоцкай зямлі ў паэта шмат прыхільнікаў і сяброў, пераканала ягоная творчая вечарына, праведзеная па ініцыятыве раённага каардынацыйнага савета старшынь прафсаюзных камітэтаў. І трэба сказаць, што прафсаюзныя лідары пастараліся: мерапрыемства атрымалася цёплым, шчырым, лірычным. «Не прыйсці на сустрэчу з чалавекам, які столькі год адпрацаваў у школе, а цяпер узначальвае раённую прафарганізацыю работнікаў адукацыі, які сваімі творамі праслаўляе Глыбоччыну, я не мог, — адзначыў старшыня райвыканкама Алег Морхат. — Дзякуй вам, Віталь Рыгоравіч, за ваш талент, моцнага здароўя і новых вершаў!»

*Алесь ЖЫГУНОЎ.*
*«Вестник», 30 красавіка — 6 мая 2010 года*

## Бярозавік Віталя Гарановіча

Душа твая высока —
У чысціні нябёс.
…Апошні слоік соку
З кладоўкі я прынёс.
Ты кожнаю вясною
Збіраць яго любіў.
Апекаваўся мною,
Каб я здаровы быў.
Я піў твой сок салодкі,
Не чэзнуў без пары.
Як здорава усё-ткі,
Калі жывуць сябры!
…Адкуль увесну сцюжа
На кветкі, на плады
І стаўся сок твой, дружа,
Прагорклы ад бяды?

*Алесь ЖЫГУНОЎ*



## Настаўнік, прафлідар, паэт

Гэта быў вельмі светлы і чулы да людзей чалавек. Аказваў падтрымку членам прафсаюза, асабліва ветэранам працы, абараняў інтарэсы работнікаў устаноў адукацыі. Пасяджэнне абласнога савета ветэранаў педагагічнай працы прайшло ўпершыню ў Глыбокім з удзелам гарадскіх і раённых ветэранскіх арганізацый. І невыпадкова. Гэта зямля для Віталя Рыгоравіча стала яго другой радзімай (першая — вёска Ермакі Маладзечанскага раёна, дзе ён нарадзіўся). Пасля заканчэння філалагічнага факультэта педагагічнага інстытута імя П. М. Машэрава ў 1977 годзе ён прыехаў на Глыбоччыну настаўнічаць. Спачатку працаваў у Задарожскай васьмігодцы, а потым быў прызначаны дырэктарам глыбоцкай сярэдняй школы № 3, якую ўзначальваў больш за 20 гадоў. Менавіта на Глыбоччыне, па словах пісьменніка і сябра Алеся Жыгунова, выспеў, узмужнеў самабытны талент Віталя Гарановіча як паэта. Яго шматлікія вершы і песні неаднаразова гучалі на пасяджэнні савета. Напрыклад, гімн Віцебскай абласной прафарганізацыі работнікаў адукацыі і навукі, які выканаў хор ветэранаў Чыгуначнай раённай арганізацыі г. Віцебска. Як расказала цяперашні старшыня райкама прафсаюза Наталля Вайцюль, першы зборнік Віталя Гарановіча «Беразвечча» выйшаў у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 1997 годзе і названы па аднайменным вершы. Паэт сэрцам успрыняў трагедыю савецкіх і італьянскіх ваеннапалонных, якія былі знішчаны ў Беразвецкім лагеры смерці, створаным захопнікамі ў верасні 1941 года ў Глыбокім. Тут было загублена каля 27 тысяч ваеннапалонных. Затым — «Святло

блакіту», «Саракі». «Менавіта за зборнік вершаў «Саракі» яму было прысуджана званне лаўрэата прэміі ФПБ у галіне літаратуры, — паведаміў намеснік старшыні Віцебскага абкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Генадзь Рудзёнак. — У той час ён ужо ўзначальваў раённую арганізацыю галіновага прафсаюза. Гэта быў вельмі светлы і чулы да людзей чалавек. Аказваў падтрымку членам прафсаюза, асабліва ветэранам працы, абараняў інтарэсы работнікаў устаноў адукацыі». У снежні 2011 года, якраз да 60-гадовага юбілею, Віталь Рыгоравіч выдаў зборнік «Нараджэнне вады». На жаль, ён аказаўся апошнім…

*Любоў ТРАПЕЗНІКАВА*



## Віталь Гарановіч — у вершах і песнях застаўся

Няма ягонага жыцця?
Чытайце, як глядзіць з лісця,
З палёту птушкі ў вышыні,
З вады крынічнай з глыбіні.
Душа…

Бурштынам слова свеціць
І як крышталь звініць,
Ты лепшая у свеце,
Я веру: будзеш жыць!

Так сказаў Віталь Гарановіч пра мову родную. А ці не раней, у вершы «Мая просьба», увесь матыў скіраваны да беларусаў. І калі цытаваць, то трэба ўвесь верш:

Народзе, прашу: не формай салдата,
Не срэбрам адкупнай багатай рукі,
А праўдай і мужнасцю адваката
Мову сваю зберажы на вякі.

Слова Скарыны і песню Купалы,
Мову-салоўку, гаворку-брую
Абарані ад знішчальнай навалы,
Ўклаўшы у слова душу сваю.

Змове шыпячых, глухіх, выбуховых
Поўнагалосся струной загучы.
Толькі ад гэтага наступу мовы
Ў цень пададуцца ўсе крумкачы.

Мова вывела ягоную душу на вольную волю зіхацець вобразамі ад захаплення прыродай. Найпрыгажэй гучыць паэтычны матыў менавіта тут,

дзе прастор уважліваму воку і шукальнай колераў думцы.

Няма яго для сустрэчы, каб павітацца з намі за руку, вачамі ў вачах высветліць трывогу за нашу чалавечую завісласць у матэрыяльным свеце і духоўнай беднасці. І адначасова ўзаемна падтрымаць веру ў незнікальнасць святла і ззяння роднага слова. Але ёсць жа вершы, дзе Віталь Рыгоравіч жывапісна-падрабязна, узнёсла, шырока адлюстраваў рэчаіснасць асабістым бачаннем. Гэтаяназіральнасць так і сцвярджала: «Вобраз спее ў думках-мроях… / То сягае у вышыні, то прастор скародзіць. / І ў радок блакітна-сіні з-пад пяра пяройдзе».

Пра што яшчэ? Вось яны, вершы з зіхоткімі радкамі — параўнаннямі і метафарамі: *«Кідае лівень, як арэхі, / Цяжкія кроплі у ваду», «У рызах слупы, як зімы святары, / Выйшлі на лета маліцца», «Зоркі, як плешкі цвікоў / У хмарах блішчаць, як у латах», «Каўнерыкі белых стрэх / Крахмаліць мароз зацята. / Стажок, як з рагожы мех, / Расшчодрыўся пахам мяты»*.

І «маладзік, як матылёк…» — такія вось вобразныя тонкасці. Нават «дождж прадзецца на вечным калаўроце»; «…Свідруе восеньскія сцежкі джалам з лісця малады віхор», гром, «пасадзіўшы месяц на лапату, кіне ў зорнасць і пралье слязу…» і г. д.

Вучні 3-й глыбоцкай школы мелі ў свой час дзівосна багатага мастацкім мысленнем настаўніка роднай мовы і літаратуры, хто ўласнымі вачыма падгледзеў у прыродзе мілыя падрабязнасці. Таму, што любіў. І балюча адзываецца тое, што беларуская школа, створаная некалі Гарановічам, ператварылася ў рускамоўную.



А Віталь Рыгоравіч працаваць умеў ад сумлення і захаплення. І па-гаспадарску. І пісаць умеў патрыятычна і рамантычна. Гэта і не забываюць некаторыя настаўнікі, нагадваюць вучням пра любоў былога дырэктара і настаўніка-паэта. Таму і адзначылі вечарынай яго памяць, у другой вясне без яго (3 траўня). Заіскрыліся вершы на вуснах вучняў. Прагучалі хвалююча песні з грудзей юных і Ганны Шаколы — кампазітаркі і выканаўцы твораў.

*Марыя БАРАВІК, сябра СБП.*
*«Вольнае Глыбокае», травень 2014 года*

## Да Дня пісьменства, Віталь Гарановіч, 2012 год

Педагог па адукацыі. Працаваў дырэктарам беларускамоўнай глыбоцкай школы. Адзін з аўтараў калектыўнага зборніка «Далягляды» (1991 год). У 1997 годзе выйшаў яго паэтычны зборнік «Беразвечча», творы ў якім з’яўляюцца трагічнай памяццю народа, усхваляванай памяццю сучасніка. Метафарычная паэзія Віталя Гарановіча — гэта чуйны рэзанатар душы і пачуццяў, усяго таго, з чаго творыцца хараство чалавечай душы. Акрамя таго, Віталь Гарановіч— аўтар кніг «Саракі» (2007) і «Святло блакіту» (Беларускі кнігазбор, 2002). У пачатку студзеня 2012 года выйшла апошняя кніга Віталя Рыгоравіча «Нараджэнне вады». Праз тры месяцы аўтар памёр. Вечная памяць Чалавеку і Творцу!



## Святочная песня

Гэта апошні верш Віталя Гарановіча, які ён прысвяціў Дню беларускага пісьменства. Пакладзены на музыку самадзейным кампазітарам Ганнай Шакола, ён стаў песняй, што прагучыць на свяце.

Прымаюць свята сёння глыбачане,
І будзе мова родная гучаць
Над хвалямі іскрыстымі Кагальнага
І чайкай вольнай ў вышыні лунаць.
Імя тваё узнёсла прамаўляе
Ўся Беларусь і кожны чалавек.
Глыбокае на дзень сталіцай стала
Пісьма славян ў гісторыі навек.
Папрыгажэў, пахарашэў у свята,
Змяніўся воблік, стаў адметным твой,
Бо шчыравалі дзень і ноч упарта,
Каб любаваўся кожны тут табой.
І з вышыні пярсцёнкам заручальным
Глядзяцца твае ў свята берагі.
На роднай мове песні над Кагальным
Гучаць акордам сёння дарагім.

## Віталю Рыгоравічу

«Спусцілі ўсіх сабак», —
Нарада ў зале ідзе.
«Усё не гэтак, не так», —
Прысуд — нібы на судзе.
А ты сядзіш за сталом,
Задумны, асветлены твар,
Выводзіш у сшытку пяром,
З ім дзеліш свой талент і дар.
Ты пішаш пра рэчку і луг,
Пра край, даражэй што няма…
Ўздыхнуў, пераводзіш зноў дух.
…Нарада прайшла нездарма.

*08.08.2007*



## В. Г. Гороновичу посвящается

Давно открылись таланты
Нашей глубокской земли.
Есть певцы, поэты, музыканты
И почитатели старины.
Много фамилий известных
В крае нашем сошлось,
Но есть один — природы вестник,
Ему поэтом стать пришлось.
И написать четыре книжки,
И каждую — в свой юбилей.
Так вот из Виталия-мальчишки
Вырос наш глубокский соловей.
Пел он, и душа его искрилась,
А мы читаем строчек глубину;
Как ручеёк родится,
Как превращается в волну…
Писал он с тургеневским размахом,
Природы белорусской соловей.
Он был и остаётся птахом,
Жаль, покинул нас в свой яркий юбилей.

*Т. С. РУСЯНОВСКАЯ,*
*ветеран Прошковской средней школы*

* * *

Вам дарована Вашым лёсам
Называцца сынам салдата.
Атрымала прапіску ў вершах
Ваша бацькоўская хата.
Там на вокнах цвітуць бальзамінкі,
У гародчыках пахне мята
І шануецца Дзень Перамогі
Як найлепшае майскае свята.
Слова мастацкае Ваша
Асвечана Божаю ласкаю,
Здзіўляе мужнаю праўдай
І чароўнай каляднай казкаю.

*М. Я. ЛІТВІН,*
*настаўніца сярэдняй школы № 1 г. Глыбокае*



## Памяці В. Р. Гарановіча

Зямля цяплом вясны сагрэта,
Бо красавік ў правы ўвайшоў…
Не стала на зямлі Паэта —
Ужо у Вечнасць ён пайшоў.

Пра Будслаўскую Божу Маці,
Што апякае нас усіх,
Пра спеў, што чуў у роднай хаце,
Пра луг, што толькі для дваіх,

Пра горад, што з царквой, касцёлам
Паміж азёрамі ляжыць,
Пра глыбачаначку, што ў школу
Шторанак хуценька бяжыць,

Пра краявіды і світанні,
Пра ўсё, што лёс наканаваў,
Пра скарбы мовы і каханне
Так шчыра ён заўжды пісаў.

І, можа, нават там, дзе Вечнасць,
Куды ўжо Бог яго прызваў,
Радкі сваіх любімых вершаў
Анёлам ціха ён чытаў.

Хоць век зямны і хуткацечны,
Ды ў дзецях доўжыцца жыццё…
Пайшоў Паэт, пайшоў у Вечнасць,
У Вечнасць, а не ў забыццё.

*З. І. АКУЛЁНАК,*
*настаўніца Станульскай школы*

## Як гасціў!

Хлебам-соллю вітаў,
Як ўсміхаўся адкрыта, шчасліва!
Сябра наш — сівы голуб Віталь.
Усё жыццё ён — на школьнай ніве.

Росціць жыта. І рве асот.
Не апошні ён і не першы.
Патаемна ад ўсіх столькі год
Па начах піша споведзі-вершы.

Ў яго думках — такі прастор!
Ў яго сэрцы — такая адкрытасць!
Ён сінечу вачэй ўзяў з азёр…
Ад бацькоў — працавітасць.

Ён дырэктар, настаўнік, паэт,
Праўдалюбцаў ўзначальвае Лігу.
І нарэшце ў руках — першацвет —
Яго першынец — Звонкая кніга.

Калыхаў нашу зямлю трус —
Ды з руінаў не раз паўставала.
Дзякуй шчыры табе, Беларусь,
Што дастойных сыноў ты раджала.

У сядле яны моцна сядзяць.
І пад імі не дыбяцца коні.
Хай жа зоры над імі гараць,
Хай жа моцнымі будуць далоні!

Не зманула экзотыка, даль,
Не кранула паглядам млявым.
На зямлі — гаспадар Віталь.
І зямныя ягоныя справы.

*Святлана ЛОБАЧ. 14.02.1997, Мінск*

# Вершы, якія не ўвайшлі ў зборнікі

## Ва ўнісон зіме

А дзе белыя ночы твае,
Будзень-снежань? Цябе пытаю.
Дай святла мне ці вочы свае,
Свет душы я вярну табе маем.

Мне так сонца зімой не стае,
Я з прыродай на час паміраю.
Дзе сябры-аднадумцы мае?
Мне у холад так іх не хапае.

Снежань сёння скупы на снягі,
А жыццё — на спагаду і ласку.
З лёду, рукі нібы, берагі
Зноў надзелі на возера маску.

Ды слата у душы, як туман,
Лета лёгкай наміткай у сэрцы.
Хай няшчырасць, як хітры падман,
Вострым болем ўначы адзавецца.

## Малады снежань

Прайшла і восень, нібы лета,
У рэках чуцен стогн вады.
З букетам ссохлых рыжых кветак
Выходзіць снежань малады.
Ўздыхне марозна, снегам мяккім
Аздобіць першапутку след.
Для хмараў правядзе зарадку,
На гоні ўскіне белы плед.
А пройдзе час — і завіруха
Буслянкі спора замяце.
І выйдзе месячык паслухаць,
Як будзе вецер вар’яцець.
Стажкі ля хатаў як прысоскі,
Дзе пад платамі гурбаў стос.
Ды акварэлькі зімняй вёскі
Напіша інеем мароз.



* * *

Вясны закончана прэм’ера,
І траўня скончаны сюжэт.
Ўзышоўшай зоркаю Венера
Ўпадзе у чэрвеня букет.

Расу распырскаюць крыніцы,
Старанна змыўшы кожны след.
І дня жывыя завушніцы
Зноў жаўруком звіняць у свет.

Дзе сон-трава ля зверабою,
Дзе цішыня ля перуна.
З-пад навальнічнага прыбою
Прагляне неба цаліна.

І здыме пробу з грэчкі пчолка,
Асветліць жыта васілёк.
Дзе ў небе першая вясёлка
Бы зноў ажыўшы матылёк.

* * *

Калі жыццё звяло у нерат,
У тлуме страчаны гады,
Устань з паўколенц, йдзі наперад
І не шукай назад сляды.

Жыццё — чатыры пары свету:
Зіму сваю ты пераржыў,
Ступі ў вясну насустрач лету
І ўвосень не заўваж мяжы.

* * *

Пабыць стоўпнікам у святы,
Як сябры святкуюць.
Жыць пад аўрай роднай хаты,
Дзе сыны такуюць.

Лёгка дыхаць, светла думаць
Без тастоў і хмелю.
З лёгкім сэрцам і без суму
Смакаваць нядзелю.

Каб душой раскашавацца
Без граніц чужога.
Суздром радасць дзе ад працы
Вызначана Богам.



* * *

У завіруху бабінага лета
Развесіць восень кужаль на платы,
Журбою вераснёвага балета
Прыблізіць нас да снежаньскай слаты.

А потым вецер вымеце прысады,
Аголіць маладыя спарышы.
Туман на рэчцы, вылезшы з засады,
На поўні паплыве капелюшы.

Асенні дождж, бы шчупальцы кальмара,
Саб’е ў каўтун засохлую траву.
І восень, снежня прапусціўшы хмару,
Уцісне ў плечы сонца галаву.

* * *

Ноч змусіла усё жывое,
Што тоіць дзень ў высокі ліпень.
Ў здранцвелым студзеньскім спакоі
Сам месяц вершнікам на ліпе.
Дзе старадрэвін млосным скрыпам
Мароз свой рэй вядзе з табою.

Як праз ігольчатае вушка,
Імкне праз комін нітка дыму.
Дзе вечар ценем Папялушкі
Ўміг растварыўся за дзвярыма.
Дыхне, нібы цяплом Гальфстрыма,
Зноў печ, закрытая на юшку.



## Камета веку

Сярод жарствы вясенніх зорак
Любая згубіцца ракета.
Нібы з бутэлькі цёмнай корак,
Рванула новая камета.

«Камета веку» ў нашым небе
Бы залатая мілавіца.
Зямлянам большае патрэбы
Няма, каб толькі падзівіцца

На цуд бязмежных нетраў свету,
Бы немаўлятка Хейла-Бопа.
У мроях кожнага паэта,
Бяссонніцай усёй Еўропы.

Паміж зямлёй і сонцам свечкай
Ў вачах самотнай Беларусі…
Як сведка тайнага, як сведка,
Малюся вершамі, малюся.

* * *

Бы з крэсіва ўспыхваюць znічкі
І б’юць у цемрадзь стрэлам халастым.
Дзе месяц ціхаходам невялічкім
Прастуе у сузор’ях залатых.

І затрапеча раніца жар-птушкі
Крыламі, дзе разлёгся небакрай.
На туману пуховую падушку
Ускіне сонца цёплы каравай.

І дзень пад стаць размашыстаму дубу
Наўкол раскіне голле-прамяні.
І стрэлкі па-асенняму зноў кругу
Свой час адмераць ў поўнай цішыні.



* * *

З развагай пачварнаю вораг
Вяршыў права звера-суддзі.
Гарэла сядзіба, як порах,
З жывымі у хаце людзьмі.

А пушча — лавец на капканы,
Дзе смерць сустракаў ваўкалак, —
Нібы родны дом партызанам
І лецішча збройных атак…

Зарослыя мохам дарогі
Да колішніх месцаў глухіх.
Сустрэне лес Дзень Перамогі
Ў шэсць поўных дзясяткаў сваіх.

* * *

Светлая ноч, не заснуць, не спачыць —
Прыстань чароўнага маю.
Поўня на белага бэзу плячы
Зноў пяцізорку шукае.

Змену начную бяссонніцай чмель
Зумканнем ў шкло адкрывае.
Ў сховах альтанкі, каштуючы хмель,
Твар свой дзяўчына хавае.

Споведзь святла у нямой цішыні —
Провады мая ў прыроды.
Додзень Венеры патушыць агні,
Скончыўшы чэрвеня роды.



* * *

Калі зялёная галінка
Прадзе намітку з павуцінкі,
Ў блакітны паясок ракі
Глядзяцца з неба жаўрукі.
А выхад кожнае крыніцы
Напояць ліўнем навальніцы
Цяплом зямным узімку лозы
Ручай атуляць ад марозу…
Паўторыць цыкл свой з году ў год
Прырода ў вечнасці сусвету.
Вясна зачнецца ў крыгаход,
А восень бабіным зноў летам.

* * *

Адплыло сцягамі павуцінне,
Анямеў без выраю прастор.
Хмар паўночных, нібы жабурынне,
Скалаціў, усчаўшыся, віхор.

Першы сівер маразы-падранкі
Прывядзе на белых туманах.
Кіне з лёду на балоце санкі,
Дзе кустоў халодная сцяна.

Маладзік быццам у жнівень конік,
Што задумаў скочыць з вышыні.
Зорны коўш, нібы зімы пагоня,
Зноў запаліць да вясны агні.



* * *

Зімовы дзень, нібы луска, бліснуў
І патануў у поцемках змяркання.
І маладзік, нібы рыбак блясну,
Цягнуць ноч будзе ў небе да світання.

Каўшы Мядзведзіцы як жоўтыя кашы,
Пакінутыя звечара для бульбы.
Вятры сыграюць восені маршы
І адшліфуюць першаснегу гурбы.

Дыханнем ранак хукне маладым,
І хатні дух праз коміны праб’ецца.
І павядуць да студні зноў сляды,
Як да зямлі зняволенага сэрца.

## Па крузе жыцця

Пахне снегам, як сенам,
Белы зімні мурог.
Мабыць, спадчыны гены
Даў прыродзе сам Бог.

Холад роўны спякоце,
Як лісток і лядзяш.
У жыцця калаўроце —
Лістапад і капяж.

У людзей пакаленні,
У прыроды пара.
Ды спляліся карэнні
У крыніцах-вірах.

Раўнадзенства ад сонца
І ад поўні ўначы.
Да жыцця ўсё бясконца
Падбірае ключы.



## Ад восені да вясны

Скародзяць скразнякі у парку
Зноў лістападам жаўталіст.
Гарацъ кастры, нібыта зварка,
І калькай лёгкай чарналіст.

Губляе зноў прывабнасць восень,
Змываюць колеры дажджы.
І ўжо марозу дрэвы просяць,
Наскрозь прамокшы ад імжы.

І думкі светлыя навее
Сам снежань, хоць і неўмалот.
Яшчэ спачатку на завею,
Для рыбакоў на першы лёд.

На шыбе студзеня карэнне,
Як свечка, люценя лядзяш.
Адносна лета са спазненнем
Нядоўгі, нібы дзень, кірмаш.

На снег падобныя сарокі
Павернуць хвост на Саракі.
І пацяплеюць зноў аблокі,
У гнёзды вернуцца шпакі.

Расою додзень раней будзе
Бяліць начы сатканы плед.
І на зямлі зялёнай грудзі
Ўпадзе адцвіўшы першацвет.

* * *

А ў памяці дзяцінства, нібы ранне.
Смалісты пах, вянок над новым зрубам,
І губкі спін, як пасля чорнай бані.
Ды самакрутка, што глытаюць губы.

Улазіны, а шчасця — што не ўлазіць
У дзверы, нібы ў рай, аж скача сэрца.
Нядзеля ў хаце, маці ў печы смажыць
З паспешкай сала жоўтае з кубельца.

Жыццё, як дзень, мільгнула векам сталым.
Кубелец той раструшчаны машынай…
Ўваччу, як дом, стаіць кубелец з салам,
Прысыпаны лугоў даспелых кмінам.



## Вачыма рыбака

Качкі дзікія плывуць,
Бы дазор, па возеры.
Ранак на спіне вязуць
Летні асцярожна.

Разразаюць цішыню
Дзюбамі-дзідамі.
Быццам неба глыбіню
Мераюць начамі.

Лебедзь белы — цар вады,
Сцеражэ лябёдку.
Месяц ранкам маладым
Зазірае ў лодку.

Заклявала. Паплавок
Знік ў вады сінечы.
У імгненне ўслед рывок —
І акунь трапеча…

* * *

Вясна з зімой у пацягушках:
Адна падсочыць сок з бяроз,
Другая ў снежныя падушкі
Хавае хвошчу чорны нос.

Удзень вясна вярбой махае,
Разносіць коцікавы пах.
І бродзіць сіла маладая
Пад вечар ў белых туманах.

Ноч падкрадзецца ціхай зебрай,
Ўладарaць холад і спакой.
І посах месяца у срэбры
Ракі зноў рыбкай залатой.

Зноў ранкам дзень з начы ачнецца,
Шчэ тлеюць зоры ў вышыні.
Ды сонца, як прыроды сэрца,
Наўкол выплёсквае агні.



* * *

Пабыць на Нарачы увосень,
Дзе хвалі-сходцы на вадзе
І лета зношаныя восі
Пыляцца ў ссохлай лебядзе.

А вецер, справіўшы абнову,
Кідае лісце з-за спіны.
Макрэчу плёсаў тумановых
Капаюць рыльцамі чаўны.

Без чаек вісне наваколле,
Як бубен сцёрты і глухі.
Халодны месяц ноч праколіць,
Нібы з хмар шые кажухі.

Ды неба божаю кароўкай
Трапеча крыльцамі на дне…
Вудой, як моцнаю вяроўкай,
Трымае ранак зноў мяне.

* * *

Астравок асакі
У заснежанай далі.
Гурбы, як паплаўкі,
Што наўсцяж раскідалі.

Ў сховах лёду вясло,
Як шчупак у здранцвенні,
Снегам, быццам бы шклом,
Сыпанула са жмені.

Пабялеў і сам дзень
Пад зажураным небам.
Толькі восені цень
Выглядае з-пад снегу.



## Вераб’іная ноч

Доўга не кладзецца
У калыску ночы
Дзень, то птушкай б’ецца
У ваконцы-вочы.
Фарбай белай поле
Беліць, бы ласіны.
Сочыцца праз голле,
Як праз дно карзіны.
Там, дзе сонца кропляй
Капнула да рання,
Выглядаюць копы,
Як прывіды-здані.
Позна ладзяць ловы
У паўзмрочнай цішы,
Днём не ўбачыш — совы
Ці лёткія мышы.
Вераб’іным скокам
Лета ночку мерыць.
Захад светлым вокам
Над зямлёю зеўрыць.

* * *

Ратоўны круг — мая надзея
На непражыты ў шчасці год.
Калі, адолеўшы завею,
Вясну сустрэне мой народ.

Не ў ланцугах шчытоў і касак,
А на гасцінцы дабрыні.
Не ў атачэнні твараў-масак,
А ў аўры зорнай цішыні.

Нам так патрэбен лад сягоння
І тым, што ў часе маладым
Пад старажытнаю Пагоняй,
Ці пад жытнёвым Гербам тым.



* * *

Я стрываю ад холаду.
А птушкі стрываюць,
Што на поўдзень
не ведаюць шляху, як я?
Бо зямлю Беларусь
ў сваім сэрцы хаваю,
Бо пад крыламі птушак
Радзіма-зямля.
Ад сяўні маразоў
і ад зеўры кілімаў
Не збягу да вясны,
не падам лету «SOS!».
Беларусь, я цябе халаднечай
не кіну,
Ты і вера мая, і любоў,
і мой лёс.
Дачакае снягір палян росных,
о, радасць!
Прычасціцца і дзяцел
жывіцай сасны.
Рэхам гай прывітаюць
ізноў птушаняты —
Стрэлкі вечнасці круціць
гадзіннік зямны.
Людзі — птушкі. Іх гнёзды —
не райскія кушчы,
А Радзімы адной
благаславёны куток,
Дзе спляла карані
Белавежская пушча,
Дзе бацькоўскіх магіл
здзірванелы грудок.

* * *

Цяпло сяброўскае рукі,
Як і каханне, лёс даруе.
Шчаслівы, хто яго адчуе
Душэўны дотык трапяткі.

Не слоў сказаных скразнякі
І не пагляд вачэй лісліўых,
Не веер рухаў мітуслівых,
А шчырасць блізкае рукі.

Не болю ад ляза хлусні
Ці беспрытомнасці ад здрады,
А руху сэрцаў буду рады
У пракавечаныя дні.



* * *

Нялёгкай справай ягамосці
Даць азначэнне маладосці.
Пачну: з жыцця самой крыніцы,
Ва ўсе часы якой дзівіцца.
Магчыма, з сонечным праменнем,
З прыроднай цвёрдасцю камення.
І з вышынёй раскутых мар,
З энергіяй, што дасць пажар.
І разам з тым з святой пашанай
Да старцаў і да ветэранаў.
Ды абярэгам слоў радзінных
Сівою даўніной Радзімы.

* * *

Чалавек на дабрыню як донар,
Вызначальным у яго не рэчы.
Ад пчалы і птаха ўзяць да скону
Ўсю ахвярнасць і падставіць плечы.

Хто ў душэўнай апынуўся змозе,
Ты яму як сведка не патрэбен.
Яго цень на сонечнай дарозе
Не ўратуе пустых слоў малебен.

Калі ж грэх адолеў славалюбства —
Ты нішто ні для сяброў, ні родных.
Калі ў сэрцы без трывогі пуста,
То ў душы ты дзьмухавец сягоння.



* * *

Заблытаюся ў валасах дзявочых
У сне, ды не ў жыцця гульбе.
Наш час стаміўся быць прарочым
І для мяне, і для цябе.

Імкнуць гады ў стагоддзя зломе,
Шукаю свой юначы след.
Мы не шчаслівейшыя сёння,
Мы сэрцаў пажаданы свет.

Не з волі божае кароўкі,
Не чар чароўнае рукі,
А пад святлом Венеры-зоркі
Нас блаславілі Ермакі.

* * *

Калені твае нібы свечкі,
Аблітыя воскам начы.
Рукамі прыкрытыя плечкі,
Радзімка на голым плячы.

Пачуццяў, як бэзу суквецце,
Ў вачах невідзімкай акно…
І ўсё забываеш на свеце,
І п’еш маладое віно.

Нектар цудадзейнае сілы,
Як хмель, кроў ў нагах разалье…
І толькі ледзь чутнае «мілы»,
І вострыя пальцы твае.

* * *

Ты мяне кахай
Сонечным паглядам.
Ў час, як юны май
Цалаваўся з садам.
У цвіцення час,
У душы кіпення
Ты праверыў нас,
Нашае цярпенне.



* * *

Ты сказала: «Бывай»,
Адказаў: «Да сустрэчы».
Толькі сведкам быў май,
Толькі сховай быў вечар.

Начных вокнаў святло
Як сустрэчы імгненне,
Бо каханне было
Нам крынічным струменем.

Хоць грымеў ўгары гром
І сляпілі маланкі,
Ахінала нас ноч
Шаліноўкай цыганкі.

* * *

Хмелем маладым
Кружыць пах галовы.
Хай цвітуць сады
І гучаць зноў словы:
«Любы, дарагі,
Я цябе кахаю».
Робяць зноў кругі
Журавы над краем.
Ўзыдзе ранак зноў
Летняю парою,
Недагледзім сноў
Мы тады з табою.
Вечнасцю жыцця
Здасца нам сустрэча,
Сэрцаў пачуцця
Нам прадоўжыць вечар.



* * *

Твае валасы — залацістая ноч
На белых маіх далонях.
Заблытаўся вечар ля нашых ног
Зімою, бы вэлюмам, сёння.

Гарачыя позіркі, месяц ўгары,
Вакол нас мяцельны вырай,
Ты сэрцам дрыготкім са мной гавары
Ля сэрца майго шчыра.

Заблудзімся разам ў шырокіх вятрах,
Разбудзім пад соснамі ранак…
Сустрэнем матулю сваю у дзвярах
І ўзыдзем на родны ганак.

* * *

Лона ракі, як жаночае лона,
Лёгкім пушком закранутае хмар.
Хвалі, нібы эрагенныя зоны,
Ценю імкліва скідаюць вуаль.

Вецер, надзеўшы нябачную маску,
Слаба такуе на лодкі вясле,
Марна растраціўшы шал свой і ласку
З ноччу-каханкай адной па вясне.

Ды бабылём паблукаўшы па свеце,
Дыхае ледзьве на пух асакі.
Быў ураган, а цяпер і не вецер,
Ціха ляжаць на вадзе паплаўкі.



* * *

Прадкажы мне, зязюля, гады,
Забяры хоць палову ў ворана.
Ды аддай яму столькі ж бяды,
Што мне лёсам дарована.

Можа, сонца пашле свой прамень
І запаліць ў вачах радасць іскраю,
Стане светлым жыцця майго дзень,
А надзея зноў яваю блізкаю.

* * *

Сэнс жыцця ў прыроды нязменны —
Быць у форме спрадвечна сваёй,
Паўтараючы моцныя гены,
Што дараваны небам, зямлёй.
Моцнасць дрэвам — ствалом і карэннем,
Хуткасць птушцы — сваім апярэннем,
Чалавеку, што вызначыў Бог.

* * *

У моцнага ветру — моцны дух,
У яркага сонца — яркі талент.
Калі няма гэтых якасцей дзвюх,
Чалавек асобай не стане.



* * *

Калі чалавек нараджаецца,
То ў гэтым ёсць вечнасць быцця.
Калі чалавек усміхаецца,
То гэта ёсць радасць жыцця.

Будзь, лёс, для жывых літасцівы
І верай асвечаны, час.
Якое багацце — шчаслівым
Быць хочацца кожнаму з нас.

* * *

Без спасылкі, што малады,
З поўнай меркай сталага веку
Я адказнасць трымаю заўжды
Перад годнасцю чалавека.

Я зрываю гадзін абручы,
Спыняю ход халастым секундам.
Я да кроплі хачу зберагчы
І запоўніць працаю будні.



## Фантазія зімы

Разнясла зіма свае хусціны,
Разаслала ў цёплым лазняку,
Разагнала веерам гусіным
Над ракой шаптуху-асаку.

Светлы цюль на васільковым лузе,
Б’юцца хвалі белыя ў стагі.
Месяцовы дыск над полем кружыць,
Выпаўзаюць цені з-пад нагі

А зіма спраўляе наваселле
Пад вясёлы скрып старой сасны,
Зазвіняць зноў завірух вяселлі
Аж да самых коцікаў вясны.

## Дырэктар

Школа — твой твар і сумленне,
Гонар твой, выбраны лёс.
Ў юнацтва ішлі пакаленні,
Дзяцінства цвіло басанож.

Букетамі восеньскіх кветак
Са свежаю фарбай стала
У сэрцы гарэзай-падлеткам
Любімая школа жыла.

Ты быў дырыжорам навукі
І майстрам дзіцячай душы,
Калі, нібы ветразі, рукі
Ўзнімалі свае малышы.

Ды ўсё ж хваляваўся не меней
За кожны праведзены ўрок.
Будзіў маладое натхненне
Трывог несціханы званок.

Ля роўных маршчын акуляры
Вачам зберагалі святло
Спрадвеку дзецям шкаляры
Жыцця аддавалі цяпло.



* * *

Першы восеньскі дзень
Нас надвор'ем вітае.
Хмараў скінуты цень,
Бо пара залатая.

Бо пара для дзяцей
І бацькоў, педагогаў.
Бо у свеце святцей
Не сустрэнеш нічога.

Школьны чысты пагляд
У дзіцячыя вочы.
Зноў сустрэчы тут рад,
Хто вучыцца ахвочы.

Каб праз чвэрць ці трыместр
Несці дзённік дахаты.
Каб у ім было месца
Для дзясятак багата.

Калі ласка, на ўрок
У класы роднае школы.
Кліча зноў нас званок,
Першы, самы вясёлы.

* * *

Урок роднай мовы.
Лады дзеясловаў.
Лад загадны —
Камандны.
Чалавек-робат.
На сэрцы холад.
Не скажы. Не аспрэч.
Не пярэч.
Лад умоўны —
Шматслоўны.
Ніякай аддачы.
Пры пэўнай умове,
Удачы…
Зажылі б дастойна.
Час застойны.
Абвесны лад —
З сэрцам у лад.
Галоўнае вымярэнне —
СУМЛЕННЕ.



* * *

Тут мова матчына саткала
Гаворак родных галасы,
Каб потым вершамі Купалы
Гучаць у розныя часы.

З карэннем векавечных вязаў
Паэтаў пераплёўся род.
І на Купалле кожным разам
Сюды збіраецца народ.

Дзе неба на зялёных шатах
І лета аж за травакрай.
Над кожнай вязынскаю хатай
Гучыць цымбалаў звонкі грай.

Як клятва мове і Купалу,
Гучыць паэтаў кожны верш.
Купалле святам лепшым стала,
Ды днём паэзіі найперш.

* * *

Набіў аскому я бананам,
Ды, атравіўшы абанянне,
Я басанож каторы ранак
Шукаю ў бульбе зноў каханне.

Ды ем са смакам з бульбы клёцкі,
Што стравай першай ў кожнай хаце.
І толькі бульбы сняцца вочкі.
«Гады мае — маё багацце».

* * *

Быў маладзейшы — тост за Любу,
За Галю, Надзю, за каханне
Я прамаўляў; цяпер за бульбу,
І ўжо ніяк за Свету з Таняй.



## Нарач

Збірае Нарач да сябе крыніцы,
Што б’юць жывіцай з-пад каранёў-жыл.
І хвалі, як асколкі бліскавіцы,
Ўразаюцца у летні небасхіл.

Прыносіць ранак ў тумановым ранцы,
Калі жніво скрадзе кароткі цень.
Надточыць ноч дзяўчыне-нарачанцы,
Надрэзаўшы вясёлкай хмарны дзень.

Зімовых дачакаўшыся вакацый,
Напоўніцца бялюткай цішынёй.
Антэны вудаў рыбаковых рацый
Наладзяць перамовы з глыбінёй.

## Маё Глыбокае

Хто ні едзе, адкрые відарысы,
І ад самай Варганскай гары
Горад мой падплываючым парусам
Вам асветліць цянётаў двары.

Тут пад квадраю новай стагоддзі
Раскідалі ўздоўж вуліц муры.
Дзе не кроў, а крыніцы на сподзе
П’юць у келлях сваіх камары.

Над святынямі голасна чайцы,
Шлюбна звоняць бажніцаў званы.
Шпіляў цягнуцца белыя пальцы,
Дзе аблокаў плывуць дываны.

Беларускасці крэўныя гены
У нашчадках вякуюць чалом.
Глыбачан маладых пакаленні
Нематы не затуканы сном.

К чужадалі паўднёвай граніцы
Правядзе Су вяковым крылом.
Уздыхне цёплым полем пшаніцы,
Вулкай, збегшыся з блізкім сялом.



## Беларусь

Тут дыхаць вольна, дзе шырокі Нёман
Парушыў неруш векавых крыніц.
Тут лёгка полю у дажджоў палоне
Пад светлай знічкай цёплых навальніц.

Жывецца песням, радасна вяселлям,
Тут даўгалецце — спадчыны выток.
Чабор і верас — цудадзейным зеллем,
Прапіскай жытняй — сіні васілёк.

Дзвіны Прыдзвінне, памяць аб Скарыне,
Паэтаў край і боль зямлі з вайны.
Світае Нарач на снягоў пярыне,
Ухутаўшы туманамі чаўны.

У небе зорак залатыя межы,
Нібы над Сожам Гомеля агні.
Тут непрыступнасць сценаў Белай Вежы
І Белавежскай пушчы карані.

### * * *

Беларусь! Ты завеш
да сябе
Зорным бляскам
расы на вярбе,
Вечным водарам
свежай раллі
І званамі,
што зноў загулі
На адноўленай
высі царквы.
Пахам скошанай
муравы
Мілагучнасцю
мовы дзядоў
І стрывожанай цішшу
кладоў…
Калі хопіць на тое
жыцця,
Да цябе я дарогу
знайду
І ў любое надвор'е
прыйду.

*2000*



## Лес і лёс

Лёс, як лес, — у ім няма дарогі,
Па якой ты пойдзеш напрасткі.
Лёс табе наканаваны Богам,
Вечнай тайнай для цябе які.
Лёс, як лес, — з цянётамі гушчару,
З блікам неба праз узоры хмар.
Дзе спакой і бура уладараць,
Дзе жыцця свайго ты гаспадар.
Лёс і лес карэннем знітаваны,
Павянчаны ў радасці крыляць.
Калі лесу на жыццё адданы,
Лёс твой будзе выбару спрыяць.

*2007*

## Вясна і вайна

Закляніла неба ад «стэлсаў» над Сербіяй,
Над роднаю Крывіяй клін журавоў.
Весні Вялікдзень над светлымі вербамі,
Спаленых цень паплавоў.

Вольныя крылы ў бусла над хатаю,
Гнёзды-буслянкі не трушчыць вайна.
Там жа пачварай ракета крылатая,
З выраю смерці яна.

Сіпнуць сірэны, і плачам дзяціным
Вулкі заходзяцца нема, двары.
Над Беларуссю клёкат буслiны,
Пахнуць жывіцай бары.

Зернетка прагне да глебы ўзаранай,
Як немаўлятка да маці грудзей.
Там кожны выбух сочыцца ранай,
Смерць забірае людзей.

У неба сутонні грамы маладыя,
Траўнем, як сном, адкрасуе зноў век.
Сведкамі сталі сёння жывыя,
Збройна як чыніцца здзек.

*1999*



## Першага верасня

Ветразь верасня — белы бант
Зноў плыве на падворку школы.
Першакласніца — музыкант,
І ў руках зноў званок вясёлы.

Самалёт павуцінку ўгары
Выпускае пад гул матора.
Сэрца з сэрцам пагаварыць
Хоча сёння ў дзіцячым моры.

Што ні клас, то сяброўскі рой,
І настаўніца нібы маці.
Першы раз і апошні свой
Год вітаюць на ведаў свяце.

Крэйды школьнай свежы радок
І радок у вучнёўскім сшытку.
Пачынае сукаць у клубок
Час вучэльні ўрокаў ніткі.

## Антырэквіем

Заклік быўшых неўміручых
Прагучаў напрыканцы:
Галадранцы, гоп да кучы,
«Сацылізм» аддаў канцы.

Беззаконнасці варункі,
Нібы кветка для пчалы.
Пацяклі у сквапных слюнкі
На службовыя сталы.

Пад шумок людскіх стагнацый,
Абязболіўшы душу,
Пачалі з прыхватызацый
Дружнай спайкай мурашу.

У дзяржаўную кішэню
Лезуць смела «змагары».
Пракурорскія ж мішэні
Для зялёнай машкары.

Форды, нісы і таёты —
Пераменаў камуфляж.
Спекулянцкім калаўротам
Барахолаўкі шабаш.

Каб на рынак, не ў звярынец,
Дзе ўладарыць шайкаў спрут.
Ачышчай жыцця гасцінец,
Мой бацькоўскі мілы кут.

*1993*



## Крыўскае слова

Мова мая — вуснаў крыўскае слова,
Песняў забытых няспеты радок.
Згубленай ў горадзе звоніш падковай,
Кроснаў у вёсцы не ткany уток.

Метрыкай вечнай — кнігі Скарыны,
Ў келлі хрышчоная, як немаўля.
Полацкім крыжам святой Еўфрасінні
Жыць блаславёна пасля.

Зведаўшы славу і час каранацыі,
Болей жа церпіш папрок.
Поўнагалосся, выразніца нацыі,
Лёс не прадкажа прарок.

Ў сэрцы паэтавым песняй няспетай,
Ў фарбах жыві мастака.
Сум мой асветлі папараць-кветкай,
Словам гаючым радка.

*1998*

## Хатынь

Хатынь! Наш гонар і наш боль,
Журба Радзімы-Беларусі,
І вечна твой гарыць агонь,
Да долу сцелючыся ў скрусе.

Паўсюль чарнеюць камяні,
І кожны знак бяды — магіла.
Не веру, што ў ліхія дні
Тут смерць равеснікаў касіла.

Май незабудкаю ў душы,
І лета мірнае паўвека…
А дрэвы — болей спарышы,
І лес навокал, як калека.

Спытай пра тую даўніну,
Раскажуць што? Наўрад, бо дрэвы
Згубілі слых і анямелі
Ад перажытага ў вайну.

Вядзе павольна гід мяне,
Як па алеі Вечнай славы,
І кожны тут як на вайне,
І ў сэрцы быццам шрам крывавы.



* * *

Прыходзіць восень залатая,
Кастрычнік свой адлічыць дзень.
Прырода кветкамі вітае
І з лісця дываны кладзе.

У арэоле днём адлітым
Яму паклон б’юць каралі.
Йдзе чалавек з вялікай літары,
Настаўнік крочыць па зямлі.

І сад антонаўкі салютам
Да долу гулка ападзе.
І журавы фанфараў гукам
Пратрубяць пра святочны дзень.

Ды ў гэты час праменні сонца
Да ног гірляндай пакладзе.
І дзень той доўжыўся б бясконца:
Настаўнік па зямлі ідзе!

## Жанчынам

На крылах лепшае пары
Штогод Вам сонца дзень прарочыць.
Святочны у календары
І самы што ні ёсць Жаночы.

З прычыны гэтае, сябры,
Усмешкай хай іскрацца вочы,
У сэрцах хай гараць кастры,
І ні хмурыначкі уночы.

Хай накануе век Вам лёс,
Што толькі праведнаму гожы.
Жанок займіце вечны пост,
І толькі вернасці, о Божа!



## Хрэсніцы

Ўжо замоўклі дзявочыя кросны
І шаптуха-пара адышла.
Нібы доўжыцца час высакосны,
І з каханым шчэ хмель не спіла.

На свабоду сваю, як аселіцу,
Маеш права прапіскай жыцця.
Ды трымаюць бацькоўскія Селеўцы
У абдымках сямейных дзіця.

Не журыся самотаю, хросніца,
На пражытай табою мяжы.
Калі ў сэрца адзіны папросіцца,
Ты вузельчык тады завяжы.

## Жаніцьба Цярэшкі

Студзень гурбы з ветрам вершаць,
Замятае сцежкі.
Жаніх першы, хлопец лепшы,
Вяселле Цярэшкі.

Прыйшло йгрышча, дуда грае,
Вогнішча палае.
Ў плоце жэрдкі лічаць дзеўкі,
Лёс свой выбіраюць.

Падбіраюць бацька, маці
У Каляды пару,
Каб у дзеўках не застацца
Ва узросце сталым.

Хлопец вывераным скокам
«Вішаньку» зрывае.
«Не будзь, лава, так высока», —
Словы прамаўляе.

На прыпеўкі і пацешкі
Ноч багатай будзе.
Кожнай Мар'і па Цярэшку
Наваражаць людзі.



## На гары Маяк

Вужом сцяжына. Зрэдку павароты.
Здаецца, на аблокі завядзе.
Чаўны здалёк — як скінутыя боты.
Вуграмі хвалі б'юцца на вадзе.

А вышыня над чашай седлавіны
Глядзіць вачыма ніцавокіх зор.
І сцеле дыму белую прасціну
Паэтамі раскладзены касцёр.

Світанак з прыазернае Слабодкі
Пакліча зухаватых рыбакоў,
Каб срэбрам лускі зноў усыпаць лодкі,
Усцешыць слабажанскіх маракоў.

Гара Маяк — вышэй палёту чайкі.
Бы птушка, сам над стромаю крыляй.
Хачу, каб стаў нацыянальным паркам
Ад Браслава да Турава мой край.

## Мелодыі вясны

Зоркі гаснуць,
Адплывае маладзік.
Золак ясны
З росаў сцеле свой ручнік.
Сон, як мроя,
Зноў знікае са святлом,
Дзе з табою
Пілі шчасце мы нагбом.
Веснім ранкам
Пакідаеш зноў мяне,
Дзе світанкам
Цёплы промень на сцяне.
Ты знікаеш —
Птушка радаснага сну —
Белым маем
Упрыгожыла вясну.
Вечар буду
З Мілавіцаю чакаць,
Каб у змроку
Твае вусны цалаваць.
Вецер поўні
Зноў раскрые парасон
І, як сёння,
Прынясе чароўны сон.
Не засмужыць
Цень нядоўгае начы.
Толькі б воблік
Твой надоўга зберагчы.



* * *

Мелодыю душы спраду
З дажджу пялёсткаў белым маем.
У сэрцы нота маладая,
І сад, зацвіўшы, на мяду.

Я да цябе вясной прыйду
Прысадамі з настоем хмелю,
Дзе салаўёў гарластых трэлі
Выводзяць мая каляду.

Мелодыю душы спраду
З таемных гукаў у сукveццях,
Калі, заблытаўшыся, вецер
Прыгоніць хмараў чараду.

Сустрэну, як сваю бяду,
У чорным вішняку падворак,
І рой апаўшых з неба зорак
Жарствой люстэрка на ваду.

* * *

Мой народ — як дзічка ў полі,
Людзі — моцныя плады.
Ім вабней пад сонцам волі,
Чым няшчырыя рады.
Зацвісці ў маі марозным,
Калі труціць дым сады.
Дзе пялёсткі, нібы слёзы,
На дзірван ляцяць руды.
Дзіды гойстрай абароны
Распусціўшы убакі,
Асвяціць лістком зялёным
Ноч, дзе спяць маладзікі.
Не аддаць вятрам-айчымам
Павуцінкі белай ніць.
Не таму заве Айчына,
Каб выгнаннікамі жыць.



* * *

Нібы заяц,
Што ўскочыў у лодку Мазая
Ад смерці,
Адолеўшы страх, да жыцця
Так і ты, чалавек,
Дажываючы век,
Як апошнюю св**а**ю,
На якой шчэ стаіш,
Забіваеш
На высокім штылі пачуцця.
За жыццё,
Як саломінку,
У вечна зямным акіяне
Ты трымаешся хваткай
Смяротнай
З адчаем…

*Красавік 2012 г.*

* * *

У гэты дзень, у гэты час
Хай лепшай будзе вам дарога,
Да шчасця, што ўратуе вас,
Здароўя, што паслана Богам.

Жывіце, радуйце сям'ю
Сваёй прысутнасцю шчэ доўга,
Як сонца цеплынёй зямлю,
Сагрэйце родных словам добрым!



## Будслаўская пілігрымка

Як сонца расквеціць прыродныя краскі,
Імкнуць пілігрымы штолета сюды
У думках пра Бога, да Маці Будслаўскай
Мацнее іх вера, шырэюць рады.

*Прыпеў:*

З малітвай у сэрцы з куточкаў Радзімы
Нясуць слова Божае ў свет пілігрымы.
І лёгкай здаецца вандроўкі дарога,
Калі пілігрымка прысвечана Богу.

Ім пешшу прайсці да Будслаўскай святыні,
Каб Маці Марыі увагу прыняць.
Ля кожнага дома малітвай гасцінна,
Як боскіх анёлаў, іх будуць вітаць.

*Прыпеў.*

Нібы ручайкі з невычэрпнай крыніцы,
Сцякаюцца вернікі ў Будслаў святы.
Удзень і уноч на абраз памаліцца
З адкрытай душою, як сёстры, браты.

*Прыпеў.*

## Вясенні вальс

Нехта ў сяле іграе,
Музыка ад бяды.
Вальс маладога гаю,
Вальс веснавой вады.

*Прыпеў:*

Вальс баяніста пальцаў
Мроіцца у цішы
Яблыні белым танцам,
Вальсам маёй душы.

А музыкант іграе,
Ладам акорд і бас.
Вальс — гэта хто кахае
Вас у расстання час.

*Прыпеў*.

Музыка не змаўкае,
Танец чаруе нас.
Стань незабудкай-маем,
Нашай сустрэчы вальс.

*Прыпеў*.



## Вясна — пара кахання

Вясна — пара кахання,
Душы сонцаварот.
Зіма, як час расстання,
Прыходзіць кожны год.

*Прыпеў:*

Вазьмі мой боль, каханы,
Няхай дваім баліць.
Зноў туманы пасланы
І восень залаціць.

Хай «бабіна» зноў лета
Цяплом нас ахіне.
Ды толькі усё гэта
Як казка для мяне.

Малітваю прадвесня
Званочак ручая.
Я для цябе як песня,
Ды толькі не твая.

*Прыпеў.*

Зноў поле шчасця ўзыдзе
Надзеяю-травой.
І снег расстання сыдзе,
Каб разам быць з табой.

*Прыпеў.*

А лета, як спатканне.
Зязюль кування час
Адмерае каханне
Нядоўгае для нас.

*Прыпеў.*

# Нарысы

## Белы лебедзь

Сярэдзіна 70-х. Дом літаратара, мора кветак, шчаслівы твар Алеся Асташонка. Толькі што закончыўся спектакль «Камедыянт», і мы, група філфакаўцаў Мінскага педінстытута імя М. Горкага, узрушаныя ўбачаным, прабіраемся да выхаду… І раптам у канцы залы, сярод пісьменнікаў, я ўбачыў Алеся Пісьмянкова, убачыў упершыню. Ён выдзяляўся сваёй экстравагантнай шавялюрай. Па тым часе маладыя філфакаўцы ўніверсітэта стала заявілі сябе ў перыёдыцы, і нам, студэнтам філфака, але другога інстытута, што месціўся насупраць, праз дарогу, заставалася толькі зайздросціць…

Другому спатканню з Алесем я абавязаны Міколу Мятліцкаму, але яно адбылося ўжо праз 18 год. У тое гарачае лета 1996 года я з групай пісьменнікаў знаходзіўся на Браслаўскіх азёрах. Жылі ў калгаснай дачы (хоць дачай з вялікай нацяжкай можна назваць) на беразе возера Струста. Мясціны тут цудоўныя: лес, азёрны плёс, узгоркі, серпанцін дарог, якія цягнуцца ўверх, да гары Маяк.

Аднойчы, калі мы ў чарговы раз варылі духмяную юшку на кастры, Мікола паведаміў, што заўтра прыязджаюць сюды Алесь Пісьмянок (так яго зваў Мятліцкі) і Толя Зэкаў. Я быў гэтай сустрэчы вельмі рад, бо быць у кампаніі з такімі вядомымі «мэтрамі»

прыгожага пісьменства заўсёды ганарова. Раніцою я разам з Вадзімам Спрынчанам накіраваўся ў лес (праўда, кожны меў сваю мэту на гэты конт: я па грыбы, а Вадзім — у лясное падарожжа з высечаным і абструганым для гэтага кіем). Адышоўся ад свайго лецішча парадкам, бо заблудзіўся нават, і вярнуўся да месца нашай стаянкі акурат у абед, дзе я і даведаўся, што Пісьмянкоў і Зэкаў ужо паелі і цяпер практыкуюцца на беразе Струсты ў «рыбным паляванні». Я рушыў туды, каб абмыцца і, канешне ж, убачыць на свае вочы знакамітых паэтаў. На месцы купання было бязлюдна, і калі я бултыхнуўся сваім не малым целам у возера, то воддаль, на рукатворным мосціку, я ўбачыў Алеся, які засяроджана рыбачыў і, як мне здалося, не звяртаў ніякай увагі на інародную масу ў вадзе. Потым, калі мы ціснулі адзін другому рукі з выпадку ўсталявання сяброўства, ён весела прызнаўся, што спачатку быў моцна здзіўлены: адкуль узяўся ў гэтых мясцінах спадар Шарэцкі. Я сапраўды меў падабенства з вядомым палітыкам сваёй сівой галавой і чорнымі брывамі.

Сваёй прысутнасцю Алесь унёс у нашу творчую кампанію чалавечую цеплыню і адкрытасць. Той векапомны вечар перарос у кароткую ноч, дзе так шмат было сяброўскіх жартаў, паэтычных экспромтаў і цікавых «адкрыццяў» з жыцця пішучай брацііі. За адну ноч былі спалены ўсе дровы, якія складалі «нз», нарыхтаваны Вадзімам Спрынчанам.

Прыгадваецца яшчэ адзін эпізод. Па просьбе паэтаў старшыня калгаса распарадзіўся арганізаваць рыбалку для гасцей, з невадам і дзвюма лодкамі. Кураратарамі прызначыў мясцовых рыбакоў, тутэйшых



маскалёў, якія раней працавалі ў калгаснай рыбалавецкай брыгадзе, а цяпер знаходзіліся на пенсіі.

Прасмаліўшы дно ў лодках, рыбакі далі дабро на выхад «у мора», а каб рыба лавілася «вялікая і малая», зрабілі па «сотцы», на рыбацкае шчасце. Пасля чаго адзін з пісьменнікаў застаўся на беразе сцерагчы вопратку, не маглі выйсці з «брыгадай» і двое з чатырох «куратараў». Рыбалка доўжылася больш за дзве гадзіны. Трэба было бачыць шчаслівы загарэлы твар Пісьмянкова, каб пераканацца, што гэта адно з яго любімых хобі. Пры набліжэнні невада да берага ўсё гучнейшым і гучнейшым станавіўся яго камандзірскі голас з адценнем незадаволенасці новаспечанымі рыбакамі, бо сапраўдныя майстры лову ад гарачыні сталі нямымі і ў прафесійных дзеяннях абмежаванымі. А калі невад аказаўся на беразе, то ў ім рыбы засталося няпоўныя два вядзерцы. Вугры, шчупакі, ляшчы «паказалі хвост» заўзятарам, як толькі адчулі мелкаводдзе. Другі кароткатэрміновы заплыў, але ў іншае месца, зрабілі двое адпачыўшых рыбакоў з Пісьмянковым. Меней чым праз гадзіну яны вярнуліся са шчупаком у рост чалавека. Ніхто так не радаваўся, як Алесь. Здавалася, што ён быў на сёмым небе. А як ён быў удзячны за рыбалку старшыні калгаса! Пра сяброўства Пісьмянкова і старшыні Мікола Мятліцкі засведчыў у вершы «Землякі», які ўвайшоў у калектыўны зборнік «Браслаўшчына азёрная мая»:

Сапранкоў гадуе колас
Ды цярэбіць лайдакоў.
Вершы думае уголас
На дасвецці Пісьмянкоў.

Зусім натуральна склаліся адносіны Алеся з цёткай Броняй, якая пражывала па суседству з жытлом пісьменнікаў. Ён падоўгу мог гутарыць з гэтай немаладой жанчынай, якая пабачыла многа на сваім вяку. Пад уражаннямі ад сустрэч напісаўся, відаць, верш «Стараверы». У ім Пісьмянкоў катэгарычны ў вызначэнні веры ў шырокім сэнсе слова:

Старавер, бо людзям веру.
Веру, злосць — часовы госць.
Веру ў светлыя намеры,
У дабро і прыгажосць.
І таму, што мы па веры
З цёткай Броняй сваякі,
Зараз лебедзь самы белы
Да маёй плыве рукі.

Душа яго заўсёды імкнулася ў гэтыя бяскрайнія азёры.

Праз два гады мы (я, Алесь і Валодзя Ягоўдзік) зноў пабывалі на гэтым возеры, але на супрацьлеглым яго беразе. Тады Алесь і Валодзя цэлы тыдзень пражывалі на дачы ў маіх знаёмых, рыбачылі, парыліся ў лазні… Хоць амаль кожны дзень ішоў дождж, яны падоўгу з вудамі бавілі час у ціхіх затоках, дзе і лодцы спакойна, і паплаўку. І потым, калі прайшло шмат часу, Алесь усе гады імкнуўся наведаць «бабу Броню». І нават у апошні год свайго жыцця ён папрасіў мяне, каб я даведаўся нумар хатняга тэлефона гэтай жанчыны…

Праз год яму спаўняецца толькі 50. А ў дзень яго смерці я забег на хвілінку ў рэдакцыю «Вожыка». Дзверы рэдактарскага пакоя былі расчынены, Алесь з кімсьці гутарыў па тэлефоне. Кіўком галавы запрасіў мяне ў кабінет, жэстам прапанаваў прысесці. Пасля заканчэння тэлефоннай размовы падышоў, прывітаўся за руку, спытаў пра жыццёвыя і літаратурныя справы. Даведаўшыся, што я на двухтыднёвых курсах дырэктараў школ у Мінску, прапанаваў разам схадзіць у сераду ў Літаратурны музей на сустрэчу з выдаўцамі кнігі «Тарас на Парнасе». Напісаў нават запіску, каб я не забыў. Я спяшаўся на заняткі, а ён узяў падшыўку нумароў «Вожыка» і дэманстраваў па старонках, якія пісьменнікі друкуюцца ў часопісе. Быў ён у той час нейкі ўзрушаны, эмацыянальны. Я ўжо быў пакінуў кабінет і выйшаў у калідор, а ён за руку стаў цягнуць назад. І гаварыў, гаварыў, гаварыў… Прапанаваў (ці то прасіў?) сустрэцца яшчэ раз, як скончацца заняткі, бо ён будзе на рабоце позна. Вучэбны дзень на курсах скончыўся каля 17 гадзін вечара. І я з сябрамі паехаў на выставу ў Мастацкі музей. Вярталіся ў пачатку восьмай гадзіны, ішлі пад вокнамі рэдакцыі, дзе ў гэты час паміраў Паэт. Была пятніца.

*Віталь ГАРАНОВІЧ*

## Па хвалях маёй памяці

У сталым веку прыгадваюцца табе мілыя малюнкі дзяцінства, такога непаўторнага і фантастычнага, быццам дзіцячае кіно, якое прагледзеў ты ў маладым ці юным узросце. І яно з вышыні пражытых гадоў здаецца ў шмат чым падобным на вясёлыя карцінкі жыцця далёкага, хоць і нялёгкага пасляваеннага часу...

На памяці і тыя эпізадычныя фрагменты, якія запалі на ўсё жыццё, звязаныя з маленскімі гадамі ў Ермакоўскай сямігодцы і настаўніцкай працай Івана Васільевіча Козела, беларускага драматурга, аўтара знакамітай і вельмі папулярнай у 60-я гады «Папараць-кветкі». Яна была настолькі любімай у народзе, што яе некалькі месяцаў запар паказвалі па беларускім тэлебачанні па заяўцы гледачоў. Тады, помню, у Сенькаву хату сходзіліся ці не ўсе ермакоўцы паглядзець яшчэ і яшчэ раз згаданую п'есу ў выкананні артыстаў Беларускага тэатра юнага гледача.

Ці не тады назвалі рэстараны ў Маладзечне і Мінску крылатым эпітэтам па назве драматычнага твора. (Ды і жылы мікрараён Серабранка ў Мінску, мабыць, бярэ пачатак ад козелаўскай п'есы «Над хвалямі Серабранкі»?!)

Вяртаюся ў памяці зноў і зноў у дарагі для мяне час — канец 50-х, пачатак 60-х гадоў. Для мяне, вучня першага, а затым другога класа нічога асаблівага не значыў той факт, што ў школу прыехаў працаваць новы настаўнік, а разам з ім і яго сям'я, што з дзяцей Івана Васільевіча сын Косця быў маім раўнагодкам, другі сын, Саша, на год старэйшы. Далейшы лёс звёў нас за адну парту, якраз насупраць стала настаўніка.



І аднойчы, на змену маладой настаўніцы, што захварэла, прыйшоў бацька Косці. Павітаўшыся, цёплым неафіцыйным голасам прапанаваў класу самастойнае заданне, а сам паглыбіўся ў нейкія лісты, густа спісаныя і з праўкамі зверху над словамі. Часта позірк яго быў скіраваны паверх нашых галоў, недзе на заднюю сцяну класа. Нам здавалася тады, што ён гэтаксама кантралюе работу вучняў, і стараліся не шумець. Але з часам, выканаўшы заданне, мы пачалі «сігналізаваць» настаўніку рукамі аб заслужанай перамозе ў рашэнні вызначанага для нас задання. Настаўнік не рэагаваў, нават не заўважаў нікога з нас, а вочы яго ўтрапёна глядзелі ў адну кропку. У гэты час ён быў «глуханямы» да шуму ў класе, не адрэагаваў і на званок з урока. Нам, малым, неўдамёк быў творчы стан настаўніка, бо ён у тыя хвіліны «думаў» пра сваіх герояў новага твора.

...П'еса «Над хвалямі Серабранкі». Колькі тыповых партрэтаў стварыў аўтар на падставе канкрэтных асоб — жыхароў маіх родных Ермакоў! Персанаж брыгадзіра Сцёпкі цалкам адпавядае тагачаснаму брыгадзіру Сцяпану; сям'я Шыдлоўскіх спісана драматургам з сям'і піянерважатай Ермакоўскай сямігодкі; шафёр Васіль — са старэйшага калгаснага вадзіцеля Васіля; Зоська — нагадвае нашага агранома Зоську; у вобразе Федзі я згадваю свайго бацьку, таксама першага бухгалтара мясцовага калгаса, які нярэдка ў сваёй лексіцы выкарыстоўваў выслоўе «варушыць мазгамі».

Носьбітам вуснай народнай творчасці: песень, прымавак, пагаворак, якія гаючай крыніцай льюцца са старонак п'есы, — была ермакоўская доўгажы-

харка, якую доўгімі зімовымі вечарамі слухаў і занатоўваў у свой пісьменніцкі блакнот драматург Іван Козел. Пажылая жанчына прала кудзелю і спявала пад музыку свайго калаўрота.

Пазней, калі Іван Васільевіч Козел з сям'ёй пераехаў на сталае жыццё ў Мінск, стаў працаваць у Навукова-даследчыма інстытуце педагогікі Міністэрства асветы БССР, ён шмат разоў прыязджаў у Ермакі, прыходзіў да нас. Тады бацька цепліў баню, а пасля, папарыўшыся, дапазна заседжваліся ўдвух за сталом і гутарылі пра вядомае толькі ім.

*Віталь ГАРАНОВІЧ*



## Верчыны плыты памяці

Яна цяпер у родных сценах адна. Каб не ацяпляць усе чатыры пакоі хаты, баба Вера на зіму пасялілася ў тым, вокны якога выходзяць на сад, які зімою рэдкі і праз яго відаць аж да лесу. А яшчэ любіць глядзець яна на кавалак дарогі, на якой увесь дзень шумна ад машын. Ад дарогі, якая цягнецца ўздоўж вёскі і становіцца бачнай яе падслепаватым вачам якраз пад лесам у месцы, дзе асфальт вырываецца з сутарэнняў дамбы, і паспытаўшы волі каля паўкіламетра, зноў апынаецца ў акружэнні лесу, і там ужо прастуе аж да самай Вілейкі.

Яна засталася ўдавой пяць год назад, калі яе Толя, спаралізаваны інсультавай хваробай, дажыў адведзеныя Богам гады зямнога жыцця. Пасля пахавання на дзверы хаты быў пачэплены замок, і яна ўпершыню выехала да дачкі з зяцем у горад, на Віцебшчыну, каб перабыць зіму. Затым яна яшчэ чатыры разы «кватаравала» то ў адной дачкі, то ў другой, то ў сына з нявесткай. Па вясне прасіла толькі, каб адвезлі ў свой «вугал», дзе і ясі са смакам, і спіш, бы забітая.

А сёння ёй больш за восемдзесят. І яна першы раз засталася ў сваёй хаце зімаваць. Сіл, дзякуй Богу, хапае, каб схадзіць у краму, пратапіць печку з духоўкай ды па святах наведаць сваю цэркаўку (балазе яна знаходзіцца акурат насупраць яе хаты, праз вуліцу). Такое суседства з храмам дае мажлівасць пабачыцца не толькі з малодшай роднай сястрой, якая прыслужвае пеўчай у царкве, а ўбачыцца ці пагаварыць з вяскоўцамі, якіх яна можа сустрэць гады ў рады ў час вялікіх царкоўных святаў. Такія сустрэчы як бальзам на душу для сталага чалавека.

Вось і цяпер, гледзячы на зыркія языкі полымя ў печцы, яна міжволі звярнулася ў памяці да гадоў яе дзявочай пары, калі і рака Вілія яшчэ была не перакрыта дамбай, ды і жыла яна з бацькамі на хутары ў месцы, якое сёння затоплена вадой. Што за прырода была ў гэтай мясціне! Наўкол заліўныя лугі з травастоем у пояс чалавеку, прырэчная лаза з чаромхавымі гаямі. А Вілія з незлічонымі паваротамі, ціхімі завадзямі і глыбокімі вірамі поўная ўсялякай рачной жыўнасці. У памяці нечакана ўсплылі гады, калі яны з лепшай сяброўкай былі плытагонамі на рацэ. Цяжкія былі гады, бо яны прыпалі на канец вайны і пасляваеннае паўгалоднае жыццё. Трэба было дапамагаць нейкім чынам бацькам, каб пракарміць шматдзетную сям'ю з васьмі чалавек. Работа на сплаве лесу вымагала вялікіх фізічных сіл, якіх нярэдка бракавала ў мужчын, не гаворачы пра сямнаццацігадовых дзяўчат. Але «панскі» заробак (сто рублёў у месяц) і ў дадатак адрэз тканіны па пятнаццаць метраў, з якой можна было пашыць і сукенку, і блузу са спадніцай, стымулявалі кожнага на працу. Нарыхтоўка лесу вялася ў «Жоўтым беразе» ля вёскі Камена, дзе бярвенне спускалася на ваду і дзе яго вязалі ў плыты. Усю падрыхтоўчую работу выконвалі мужчыны, а дзяўчаты з жанчынамі гналі плыты па Віліі да самай Вілейкі. Праўда, і тут без мужчынаў не абыходзілася: на «карме» самаходнага плывучага «пантона» заўсёды знаходзіўся спрактыкаваны рабочы, як і ў яго хвасце. Такое падарожжа цягнулася суткі-двое, у любое надвор'е. На плытах ставіліся буданы, дзе плытагоны па чарзе адпачывалі. На ноч «прыбіваліся» да берага, звычайна спыняліся непадалёку якой-небудзь вёскі.



Ля плытоў заставаліся дзяжурныя, астатнія ішлі ў вёску прасіцца пераначаваць на сенавале. Нярэдка ноч праводзілі на нагах, бо вяскоўцы ладзілі танцы, а група незнаёмых дзяўчат і хлопцаў была зусім не лішняй для тутэйшай моладзі. Праўда, сустракаліся вёскі, дзе не было сенавалаў, бо людзі жылі ў зямлянках, на месцы спаленых у вайну хат.

Кароткая эйфарыя ўспамінаў была нечакана парушана глухім стрэлам вугольчыка, які адначасова выпаў на прыбітую перад печкай бляху. Жанчына павольна сагнулася, рукамі ўзяла чырвоны камячок і ўкінула яго назад у суцэльны жар. Тады ёй успомніліся і не вельмі прыемныя моманты, што здараліся за сем з паловай гадоў яе плытагонства. Адразу на памяць прыйшоў выпадак, калі яе з сяброўкай пакінулі дзяжурыць на ноч ля плытоў. Быў летні жнівень, пара рабінавых начэй, калі неспадзяваная навальніца магла прыскочыць нечакана і ў любы час сутак. Яшчэ толькі бралася на вечар, і сяброўкі вырашылі распаліць зараней касцёр на беразе ракі, побач з плытамі. Было ціха, сонца толькі значылася сваімі промнямі над густымі кустамі, але ўжо над вадою павольна збіраўся рэдкімі астраўкамі густы туман. Час прыспешвала яшчэ не прыгатаваная вячэра, у час якой дзяўчаты вырашылі насмажыць дранікаў, бо зараней з дому накапалі торбачку бульбы-спешкі, прыхапіўшы бутэлечку канаплянага алею. Патэльня была адным з асноўных атрыбутаў рэчыўнага мяшка вілейскіх плытагонаў, а цёрку ў гэты раз яны ўзялі зараней дамовіўшыся. Хаця ў кожнай з іх быў «сухі паёк» з амерыканскіх мясных бляшанак, што выдаваліся ім на час прагонкі плытоў.

Дзяўчаты так занялiся справай, што не заўважылi, як насунулася разам з прыцемкамi навальнiчная хмара. Яшчэ не паспела нагрэцца патэльня, а першыя буйныя кроплi дажджу ўжо прабеглiся па плытах i густа сцебанулi па толькi што падрыхтаванай для смажання дранцы. Яшчэ хвiлiн колькi — i ад бульбяной мяздры засталося адно мутнае месiва. А яшчэ пастаянныя маланкi з громам i перунамi, якiя загналi дзяўчат у сховы рукатворнага будана. Мучыў голад, але большым страхам была тады неўтаймаваная прыродай непагадзь.

Другi выпадак меў не меншыя нервовыя ўзрушэннi для маладога арганiзма, калi ў час дзяжурства ўноч пачалi выць ваўкi. Да таго ж вочы драпежнiкаў свяцiлiся, здавалася, зусiм блiзка. I яны, мабыць, асмелiлiся б падысцi блiжэй, каб не святло ад непагаслага кастра i бесперапынны бой па вядры суком, што застаўся абвугленым, але не да канца згарэўшым. Неймаверны шум i блiзкая чэрвеньская ранiца прымусiлi звяроў адступiць, хоць для дзяўчат сама ноч была надзвычай трывожнай i цалкам бяссоннай.

Цяжэй за ўсё было молямi гнаць дрэва па Вiлii, бо тады прыходзiлася пешшу з жэрдкай у руках iсцi па беразе па цячэннi ракi, лiквiдуючы заторы з бярвення на мелкаводдзi.

Пасля такiх падарожжаў не было чуваць нi рук, нi ног, як кажуць. Нядоўгая летняя ноч здавалася тады мiмалётным раем, каб адпачыць i выспацца. У адну з такiх начэй у яе пачалася лiхаманка ад укусу малярыйнага камара. Спалi яны тады пад адкрытым небам, а гэтыя нячысцiкi сялiлiся ў балоцiстых мясцiнах, ля рэк i населеных пунктаў.



…Яна сядзела на табурэтцы, глядзела, як залацiстае вуголле павольна ператтваралася ў прысак, ад чаго ў печцы i ў хаце станавiлася цямней. Узяўшы качаргу, некалькi разоў паварушыла жар i, пераканаўшыся, што ў топцы датлела, зачынiла дзверы пáддувала i печкi. Юшку комiна, як заўсёды, засунула не да канца, каб на прамiлы бог не ўчадзець. Наперадзе была ноч, доўгая i багатая на ўспамiны.

*Вiталь ГАРАНОВIЧ*

## З дзяцінства

Я толькі пралупіў вочы, смачна пацягнуўся і прыслухаўся: у хаце нішто не выдавала прыкметаў аб тым, што хто-небудзь з бацькоў затрымаўся і яшчэ не пайшоў на працу. Толькі кот Барсік салодка спаў у маіх нагах, раз-пораз уключаючы сваё кацінае дыханне: хурлы, хурлы, хурлы. Быў першы тыдзень летніх вакацый.

Борздзенька адкінуўшы пакрывала, якім накрываўся спачатку ад прахалоды, а з узыходам сонца ад назойлівых мух, ссунуў свае ногі на чыстую падлогу, і басанож накіраваўся да стала, дзе ў саматканым ручніку маці хавала спечаныя для мяне бліны. Навобмацак яны былі даволі гарачыя, і ад іх ішоў наздраваты пах любімых мною дранікаў.

Па звычцы я падышоў да цёплай яшчэ засланкі печы і дзвюма рукамі ссунуў яе ўбок. Так, я не памыліўся: у патэльні, што знаходзілася адразу за засланкай, былі шкваркі і ўжо падсохлае па часе яйка.

Маю трапезу (а ўжо я перайшоў да мачанкі) неўзабаве перапыніла знаёмае кляцанне клямкі дзвярэй у сенцах — і на парозе хаты з'явіўся мой сябрук Юрась.

— Позна, позна снедаеш, — заўважыў ён ад парога. — На колькі мы дамаўляліся ўчора пачаць «аперацыю»? Га? Падводзіш сяброў, падводзіш.

У мяне ўжо не заставалася часу даесці пачаты блін. Наспех прыкрыўшы яго і патэльню тым самым абрусам, я кінуўся хутчэй апранацца. Уздзеў на сябе рубашку, нацягнуў вельветавыя трусы, сунуў ногі ў сандалі. У імгненне вока мы былі з Юрасём на вуліцы, дзе нас чакалі ўжо хлапчукі-аднаросткі.



Апантаныя адной думкай з прадчуваннем вялікай і адказнай справы цеснай ватагай рушылі да калгаснага гумна, дзе пад сцяной чакала прыхаваная звечара бомба. Авіябомбу напярэдадні выкупілі за 10 рублёў у Бабра Мішкі, які меў багаты арсенал (пра гэта ведала ўся вёска) падобнай зброі, якую ён збіраў доўгі час пасля вайны з мэтай выплавіць тол, каб потым выгадна прадаць яго сваім вяскоўцам, што назапашвалі на зіму карчы на новых вырубках.

Ускаціўшы так-сяк бомбу на прынесеную кімсьці з хлапчукоў дзяругу, узяўшы ўчатырох за яе канцы, рушылі да бліжэйшага лесу, што знаходзіўся за вёскай. Бомба была цяжкай, і таму даводзілася часта мяняць насільшчыкаў. Добра ўгрэўшыся і ўзмакрэўшы ад непасільнай ношкі, неўзабаве дасягнулі першага рубяжа свежай вырубкі. Трохі адпачыўшы, пачалі збіраць рэшткі карчоў, сухіх сукоў, адным словам, што магло гарэць у кастры, які думалі развесці на месцы дзяругі з бомбай.

Калі ўсё для кастра было гатова, то нечакана перад хлапчуковым «брацтвам» паўстала дылема: хто распаліць касцёр? Ніхто не згаджаўся гэта зрабіць. Кінулі, у такім выпадку, на пальцах . Выбар выпаў на самага маладзейшага з нас — Хведзьку, які пайшоў за кампанію з намі. Ці маглі мы адправіць хлапчанё на такі рызыкоўны крок, які горка заліваўся слязьмі і, як здавалася нам, мог не толькі распаліць касцёр, але і патушыць адразу яго сваімі слязьмі. Пасля чаго добраахвотна вызваўся зрабіць гэта Гэнусь, сын мясцовага трактарыста. Усе занялі свае «баявыя» пазіцыі за пнямі, за дзесяць метраў ад будучага вогнішча. Убачыўшы першую струйку дыму, усе інстынктыўна

прыпалі галовамі да зямлі, чакаючы ўзрыву бомбы. Але касцёр усё больш і больш разгараўся, а бомба «маўчала».

Было нязвыкла ляжаць, прыпаўшы галавою да зямлі, але кожны з нас баяўся высунуцца з-за пня: а раптам зараз адбудзецца выбух… Касцёр усё меншаў і меншаў, а бомба не ўзрывалася. Сонца даўно ўжо пераваліла на другі бок лесу, кішкі пачыналі «іграць марш». Першым не вытрымаў выпрабавання лёжкай Гэнусь. Па-пластунску ён асцярожна папоўз у бок кастрышча. А праз нейкі час раздаўся яго голас: «Хто смялейшы, паўзіце сюды». «Смелымі» аказаліся амаль што ўсе хлапчукі. На адлегласці гарачыні ад вогнішча мы ўбачылі бомбу ў самым яго цэнтры. Яна ляжала распаленая да чырвані, а на месцы ўзрывацеля адкрылася вялікая дзірка, праз якую тонкай струйкай прасочваўся разагрэты пясок. Нас нічуць не збянтэжыла тое, што бомба была пустацелая, што з яе ўжо даўно выплавілі тол. Наадварот, усе былі рады, што «адысея» з ёй урэшце завяршылася такім чынам.

Калі сабраліся ісці дадому, то не далічыліся Хведзькі. Ён жа, не вытрымаўшы выпрабаванняў, якія зваліліся на яго дзіцячыя плечы, соладка спаў у часовым сваім прыстанішчы за пнём. Трохі ўзбуджаныя, з адчуваннем вялікага голаду ў жываце, мы дружна рушылі дадому. І ніхто не меў крыўды на Мішку Бабра, які прадаў нам пустую бомбу. Цяпер хвалявала кожнага адно: што скажуць яны сваім бацькам…

*Віталь ГАРАНОВІЧ.*
*Красавік 2012 года*




# 1997

## Справа і слова паэта

Гэтай невялічкай кніжкай, бадай, робяцца два адкрыцці: творцы і чалавека Віталя Гарановіча.

Такой магутнай метафарычнасці радка, такой свежасці слова можна толькі пазайздросціць. Мяркуйце самі:

Пасеяў снежань белую расаду,
Марозік звесіў ногі са страхі.
Вятры снягі арфуюць у прысадах,
Закінуўшы на неба кажухі.

Або:

Разадрана зноў гаёў улонне
Крыкам сойкі, строкатам сарок.
Саракі пад парасонам поўні
Развязалі выраю шнурок.

І даводзіцца толькі здзіўляцца і шкадаваць, што паэт з такім талентам выпускае ў свет сваю першую кнігу праз трыццаць год пасля паэтычнага дэбюту на старонках рэспубліканскай перыёдыкі. І болей таго, выпускае па настойлівай просьбе сяброў.

Зусім няподаўна адзін за адным глыбоцкія паэты выдалі свае зборнікі — Марыя Баравік, Алесь Жыгуноў, Тамаш Ляшонак. Пытаюся ў Віталя Гарановіча:

— А ты што сядзіш?

— Ат! Якія там у мяне вершы? — адмахнуўся.

— Навошта пішаш тады?

— На душы неяк святлей, лягчэй становіцца…

А пазнаёміліся мы даволі нечакана. Прыязджаю ў родную вёску, прыбягае пляменніца са школы ў захапленні: «У нас новы дырэктар! Такі малады! Прыгожы! І — вельмі добры!» Кіраўскую школу выпала самому заканчваць. Наведаўся. Сустрэўся з Віталем Рыгоравічам. Каржакаваты, удумлівы, са спакойным разважлівым голасам, ён неяк адразу выклікаў сімпатыю. І асабліва ўзмацніў яе клопатамі пра родную мову.

Дарэчы, відаць, ніхто другі на Глыбоччыне не зрабіў дзеля яе адраджэння, колькі ён. Узначаліўшы неўзабаве трэцюю гарадскую школу, перавёў першыя класы на беларускую мову навучання. Не сілком, не валявым загадам. Проста здолеў пагутарыць з кожным бацькам, знайшоў чым пераканаць. Яго палохалі: «Пачакай, міне год-другі — і разваляцца твае беларускія класы!» Але такому прароцтву не выпала збыцца.

Сягоння, калі зноў-такі актывізаваліся захады да пераходу на рускую мову навучання, дырэктар Віталь Рыгоравіч Гарановіч звярнуўся да бацькоў: «Напішыце заявы, хто б жадаў, каб вашы дзеці навучаліся не на роднай мове». Напісаў толькі адзін чалавек.

Поўная душэўнай цеплыні атмасфера ў яго школе. Кожны, каму патрэбна дапамога, на воку дырэктара.

— Хлопчык адзін, сірата, не прыйшоў на заняткі! — скардзіцца пры сустрэчы.

— Дык ёсць жа класны!



— Не, тут мне самому трэба разабрацца. Паеду…

Здзіўляешся, як у такіх умовах, пры такой паўсядзённай занятасці знаходзіцца час для паэзіі. І не проста для вершаў-адпісак. Яны ў Віталя Гарановіча — частка яго душы.

Усхвалявана ўслухоўваецца яго чуйнае сэрца ў трывогі нашага складанага жыцця, шукае падмацунку Духу на спаконвечных сцежках гісторыі, жадае і верыць: Айчына годна панясе сваё старажытнае імя ў будучыню, бо агеньчыкі гэтае веры ў светлых вачах яго вучняў. Да іх непасрэдна, да кожнага з нас прамаўляе паэт:

Ад бяспомных душа абароніць
Мову нашу і род-карані,
Дзе світае меч гнеўнай Пагоні
І Грунвальда славутыя дні.

*Уладзімір САУЛІЧ,*
*драматург, член Саюза беларускіх пісьменнікаў*

## Саракі

Неба закружылася ад птушак —
Дзень вясновы ладзіць саракі.
Са шпакоўняў пух старых падушак
Вымятаюць крыльцамі шпакі.

Ды жаўрук, натрэсшыся ў разоры,
Б’ецца ў сіні, нібы матылёк.
Грак варонім стаў парламенцёрам —
Ў дзюбе носіць белы ласкуток.

Чаек бела-чорныя цяльняшкі
Тут і там мільгаюць угары.
Галкі, як маўклівыя манашкі,
Аблятаюць ціхія двары.

У гняздзе, нібы ў чалме, бусліха
Дрэмле пасля доўгай чарады.
Кулічок, як самалёцік, ціха
Сеў ля цёплай зброснелай вады.

Разадрана зноў гаёў улонне
Крыкам сойкі, строкатам сарок.
Саракі пад парасонам поўні
Развязалі выраю шнурок.



## Родны дом

Сюды сышліся ўсе дарогі,
Тут мае ростані жыцця:
Масніцы рыпкае падлогі
І зноў на покуці куцця.

Тут да драбніц усё знаёма:
І стол багаты для гасцей,
І печ, бы гаспадыня дома,
І цёплы круг бялюткіх сцен.

Пад столлю кміну пук духмяны
Ў суполлі з вязкай каўбасы,
Цыбуля жгутам саламяным
Свае звязала валасы.

Бярозы пах і пах аеру,
Глыток сцюдзёнае вады.
Трымай для шчасця насцеж дзверы,
Як і падкову — ад бяды.

## Беразвечча

Бяроз вечалле. Беразвечча,
Нібыта ўзведзены курок…
Тут лёсу горкага сустрэча,
Магілы, горасны Барок.

Ахвяр самотная паляна,
Гадамі сцёртыя груды.
Тут беларусам і рымлянам
Стаў бор, як чорны знак бяды.

На гэтым месцы ўсім балюча,
Будзь літасцівым, час, прашу.
Тут памяць, быццам дрот калючы,
Сціскае сэрца і душу.

Слязой сплыве агарак свечкі
Ў далонях стомленых людзей.
Худзенькія уздрыгнуць плечкі,
І хтосьці кветкі пакладзе.



## Матуліна вясна

Цябе ўнучка назаве бабуляй —
І разбягуцца зморшчынкі на лбе.
Старэнькая, ласкавая матуля,
Як уявіць мне маладой цябе?

Ідуць гады. Старэе сад ля хаты,
Успыхне ўзмежак белым вішняком.
Ці помніш, як садзілі вішню з татам,
А я гуляў шчаслівым хлапчуком?

Пяць год назад мы спілавалі дрэва,
Але шпакоўню ўгору ўзняў вішняк.
І кожны раз сваім сардэчным спевам
Сустрэць вясну не забывае шпак.

Ссамочуся без дому, калі доўга
Я маці радасць не вязу з дарог.
Наскрозь працята позіркам дарога,
Ацеплены надзеямі парог.

## Бацькаў успамін

Прашыты куляй рог пілоткі,
Звон кайстры ад асколкаў мін.
Ад багны рыжыя абмоткі
Сушыў вусаты армянін.

Ірвала ветрам плашч-палатку,
Сляпучы пыл у вочы лез.
Зайграла тульская двухрадка,
Паплыў з махоркай «Паланэз».

Шыпелі злосныя ракеты —
Айчыны грозная браня.
А за плячыма на паўсвету
Сінела ў небе цішыня.



## Вучням

Запомніў з вас я кожнага
У профіль і анфас,
Заўсёды засяроджаны
Вучобай мілы клас.

Над сшыткамі з надзеяй
Запозна трачу зрок,
Каб значнаю падзеяй
Быў кожны ваш урок.

Пішу адозву марам
У новыя вякі,
Каб не зляцелі марна
Гады, бы скразнякі.

* * *

Зямля мая, мая сябрына,
Край даматканых абрусоў,
Шчэ вадзяным скрыпіш ты млынам
І шэпчаш пошумам аўсоў.

Крыляюць тут, як птушкі, дзеці
Сярод гаёў і азярын.
Сюды вяртаюцца памерці
З чужых далёкіх пуцявін.

Дзе гарады, як незабудкі:
Бярэсце, Полацак, Нясвіж.
Дзе Маладзечна з Навагрудкам
І Менск прыгожы, як Парыж.

Ды чорна быль, бы Хірасіма,
І чорны цень яе крыла.
Бяда над белаю Айчынай
Сваё гняздо навек звіла.



* * *

Павуцінне коціць лістaвей,
Зацугляўшы шорсткія памежкі.
Грыбасей пачаўся, грыбасей,
Зноўку мох салодзяць сыраежкі.

Над астрыжняй скірдаў каўняры,
Грэе восень жоўтыя далоні.
Раніцы з палеткаў у двары
Туманы халодныя прыгоняць.

## Мая радасць

Колькі сэрцаў трымаю ў сэрцы сваім —
Цэлы клас!
Колькі дум абуджаю пытаннем адным —
Не злічыць!
Колькі доўгіх начэй не дасплю,
дарагія, з-за вас,
Каб маленькае кожнае сэрца
жыццю навучыць.
Адпачну я ля сшыткаў,
разгорнутых, быццам душа,
Кожны раз з хваляваннем
трымаю аловак над цёплым радком.
І азвоніцца памяць,
бы кропля-капеж з ледзяша.
І ўзіраецца сэрца
у светлыя вочы крадком.



## Глыбокае

Хто даў табе імя такое?
Не скажа час, маўчыць панура.
Струхнеў каўчэг разбіты Ноя,
Вякоў пранеслася віхура.
Сівым здаецца час далёкі,
З якога стаўся ты Глыбокім.
…Ды прыгадаю светлы ранак,
Русавалосых глыбачанак
З карзінамі суніц баровых,
Заўсёды вострымі на слова.
Кахання першага вандроўкі
Па ціхіх вуліцах Мядзёлкі,
І светлы час тае сустрэчы
Ля белых гмахаў Беразвеччы.
Драздовіч, Корсак і Буйніцкі
Пілі душой з тваёй крыніцы.
А ля ваколіц сіні лён,
І ўсюды дух наш беларускі,
Дзе колісь з арміяй французскай
Кастры паліў Напалеон.
Відны, як вочы, азяркі
З палёту вышыні Сухога.
Крыжамі ўзносішся да Бога
Усе пражытыя вякі.
Даўжэйшы твой паўночны цень.
Ды гронкай здзівіш вінаграду.
Цябе, заснежаны ў каляды,
Вітаю светла кожны дзень.

* * *

Не бойся рукі апячы аб хлеб,
Бойся горшага —
Хлеб апячы аб рукі.
Не па кніжцы
Пазнай сакрэт
Хлебаробскай бацькавай
навукі.
Без пагарды глядзі на плуг,
Каб успомніць,
Як пахне поле,
Каб табе з-за мужчынскіх рук
Чырванець не прыйшлося
ніколі.
Будзь патрэбным у справе любой,
Што зямлю упрыгожыць
працай,
Каб застацца
Самім сабой.
Чалавекам застацца…



* * *

Верасень — вера асенняя
З сумам і лёгкай тугой.
Скласці б гады, як бярвенне,
Ў зруб маладосці маёй.

Хай без страхі і без рамаў,
З ганкам-жарнавіком,
Але з маладою мамай
І татам-франтавіком.

З ростанню — не пакараннем,
З глыбокім салдацкім сном.
Шчаслівага зноў вяртаннем,
Заручын дамашнім вінам,

Ды не са струхнелай брамай,
Зарослай шыпшынай густой,
Ужо незваротнай мамай
І бацькавай лаўкай пустой.

## Прызванне

Хацеў калісь ты быць акцёрам,
А стаў шафёрам.
Ты марыў аб актрысах МХАТа —
Пайшоў к даярцы ў сваты.

І не крыклівыя рэкламы,
А пісьмы мамы.
Замест шэкспіраўскае ролі —
Два кузавы калійнай солі.



## Вякам

Упаў лісток пажоўклы на асфальт,
Не лістапад, а ліпень на пачатку.
Мо восень у купальскі заркапад
Пад ногі лету кінула пальчатку.

Магчыма, выпад позняе пары,
А раптам жарт, дзіцячае свавольства.
Ды сенны дух у чыстыя двары
Вязуць вазы, бы ў восені пасольства.

Слязінка-znічка, дочка раўчуку,
Як невідзімка, згубіцца ў лістоце.
Віхор падскоча к хмарцы на кійку,
Каб спрасці дождж на вечным калаўроце.

З дарогі жнівень ступіць на парог,
Уваліцца, нібы дзяцюк, у хату.
І лета, спёкшы на Іллю пірог,
Адорыць шчодра восенню багатай.

* * *

Чакаць бяды не трэба —
Яна, як нечаканка,
З зіхотных высяў неба
Жагнае, як маланка.

Шукаеш апантана
Вугельчыка-цяпельца.
А боль — адкрытай ранай,
І не хапае сэрца.

І чэзнуць нерваў сілы,
Рука сама ў адчаі
Нацельны крыжык з шыі
З надзеяю сціскае.



* * *

Ранак, як рамонкавы пялёстак,
Забялеў пад сонца капяжом.
Першародным быць цяпер няпроста —
Чыстым ветрам, снегам ці дажджом.

Ды няўпрост застацца чалавекам
Сярод здрады, пошласці і зла.
Не пылінкай у святле малекул —
Хоць адной малекулай святла.

Калі цяжка — мне, майму народу,
Калі лёгка — зноў з народам жыць.
Не губляць галінкі радаводу,
Першаісным да скanaння быць.

* * *

Гады — плыты Жыцця ракі
У крыгаход і навальніцу.
Душу то ўздымуць жаўрукі,
То з неба скінуць у крыніцу.

Ці фрэскі весняе пары,
Ці восеньскіх дажджоў мярэжы.
Нібы званіцам званары,
Жыццю істотай прыналежу.

І радасць велічы быцця
Каханым, вернікам ці сябрам
На кон пастаўлена жыцця,
Пазначана бясцэнным скарбам.

І лёткай ластаўкі крыло,
Мільгнуўшы сполашна над летам,
Як невідушчаму святло,
Прысніцца ў сне чароўным светам.



* * *

Пасеяў снежань белую расаду,
Марозік звесіў ногі са страхі.
Вятры снягі арфуюць у прысадах,
Закінуўшы на неба кажухі.

У цёплай шапцы бэз на паваротцы
Скубе сянцо пахучае з вазоў.
Маўкліва коні, як першапраходцы,
Ступаюць з млосным скрыпам палазоў.

І вёска, абапёршыся на плоце,
Дымком над хатай, як брывом, кіўне.
Крамяны яблык ледзянее ў роце
І набліжае да вясны мяне.

* * *

Той стаяў снег, што нам адкрыў лыжню,
Ды след яе ў маёй душы згубіўся.
І позірк твой з таемнасцю агню
На веях часу цьмяна астудзіўся.

Наш белы дом юнацтва на дваіх
Я ўсё будую шчэ ва ўзросце сталым
І абыходжу той злавечы міг,
Калі навек, было, чужою стала.

Твой позірк спапяляючы нашу
У мроях-снах, у адзінотнай скрусе.
Даруй ты мне, адзіная, прашу,
Цябе сустрэць шчаслівую баюся.



* * *

Зімой віхурна ўздыбяцца снягі,
Каб ростанню забыцца ў траўным леце.
Аддам кахання грэшныя даўгі,
Пакуль душа мядуе ў буйным цвеце.

Пярсцёнкам дрэва ацугляе год,
Рукі папросіць лістапад у веі.
Даруй, адолець столькі перашкод
Я да цябе, далёкая, не ўмею.

Кідаеш мне: «Няма ў цябе душы,
Ты эгаіст і выдумшчык бясконцы…»
Ды не зыначаць слоў звадыяшы —
Я верай той, хто прагне крыллем сонца.

Я адгукнуся на слязу-усмех,
Нібы пяршак, глыну расстання скруху.
І шчасця боль не для начных уцех,
Як крыж, нясу сягоння ў завіруху.

## Настаўніку

Добры дзень!
Дзень у дзень з табой
Носіць ранак у ранцы школьнік.
Дзе дарога, як компас твой,
Самых светлых гадоў настольнік.

У грудзях ад гаючых надзей
Першай шчырасцю і даверам
Прарастае зярняткам дзень
І радком на паперы.

На узвысях таемных мар
Плыў чаромхавы майскі вырай.
Ты настаўнік і ты шкаляр,
Хоць і бачыш свет гэты шырай.

Убярэ жоўта восень сады,
Азірнешся — міне паўвека.
А ля веснічак крок малады —
Заставайся ў ім чалавекам.



* * *

Дачакаўся вясны
І штовечар хаджу да каліны,
Мне здаецца, зямля
Адагрэе спатканняў сляды.
Мы спаткацца з табой
Чуеш, любая, зноўку павінны.
Як захмелена вабяць
Малочнай зіхотай сады!

Зноўку зможа ў душы
Прарасці зерне светлай надзеі.
Хай бунтуе ва ўсю,
Вар’яцее вясна ў крыгалом.
Веру я, што шчымотай
Абудзіцца ў сэрцы нядзеля
І не згасне кіпець
Пад паўдзённага сонца крылом.

## Прызнанне

Шчымотна бруіла каханне:
Пад бацькавым майскім акном
Чаромхі бялюткай дыханне,
Бярозы з зялёным сном.

Піў шчасця брую штовечар,
Шчаслівым быў кожны дзень,
І нават тады, калі вецер
Дажджы над страхой прадзе.

Як люцень, мяце завіруха,
Спякотай бяссільны цень.
Мне б толькі шчасліва слухаць
Малітву тваіх грудзей.

Адданыя ёй навечна,
П’ём хмельна бярозавы дым.
І горнецца Маладзечна
Маем сваім маладым.



* * *

Мае сцюдзёныя віры,
Драўлянкі-рэчачкі, крынічкі,
Дзе рассяліліся бабры
І бор усыпалі лісічкі.

Дзяцінства босыя сляды.
Дзе Ракаў ракамі багаты.
Дзе, прарастаючы з вады,
Вясёлка грэлася над хатай.

Зімоўя цнота, мая шал,
Капежкі лета, шчодрасць саду.
Разварушылася душа
Ва ўзросце самым лістападу.

А сэрца ў сталасці шчыміць.
І ў снах палохаюць прывіды.
Не мне баліць — зямлі баліць
У пастцы радыенуклідаў.

* * *

Вязуць бярозавыя дровы —
На доле рытвіны, груды, —
Вязуць праз рэдкія дубровы,
Вязуць штодня, вязуць гады.

А з імі спеў і шум гаёвы,
Звяроў гарачыя сляды
Вывозяць з лесу назаўжды…
І плачуць сцішана тады
Лясы, схіляючы галовы.



* * *

Я адчуваў сябе найбольш багатым,
Калі звінелі косы у лугах,
Калі над возам месячык гарбаты
Бы цераз грыву жоўтая дуга.

А потым, трошкі стомлены дарогай,
Забраўшыся на пахкі сенавал,
Прыемна чуў, як аціхаюць ногі,
Як мякка ў сене тоне галава.

## Першае каханне

На гарачых вуснах май
У маёй абранніцы.
Ты мяне не праганяй
Аж да самай раніцы.

Лепш, адданая, маўчы
Гонарам дзявочым,
Мне б вачыма апячы
募Чараўніцы вочы.

Мне б адчуць, як пахне бэз
На губах самлелых,
Прытуліцца да цябе
Шчырым і знямелым.



* * *

Вясны замглёны рэдкі дзень,
Ад ветру сэрца астывае.
Ты, разняволеная маем,
Такуеш цёпла ля грудзей.

Слатой няспеўна салаўкам,
Раз-пораз сонца промнем кіне…
Мая адзіная багіня
Маім даверана рукам.

На скрыжаванні твар у твар
Пад сонца ўспышкай здымак ночы:
Твае заплюшчаныя вочы,
І вусны аддаюць нектар.

* * *

Не вярнуць свайго юнацтва,
І дзяўчыны не вярнуць.
Помню ток шчаслівых пальцаў,
Як баяўся іх крануць!

А далёкае так блізка
Пламянеецца ў душы.
На сцяжыне шчасця слізка —
І завеі, і глыжы.

Сарамлівае святое.
Бы крышталю тонкі звон.
Я жыву адной табою,
Юнай памяткаю дзён.

Велікосны год адыдзе
Ў звітак часу, у «было»,
Поўня новая узыдзе
Ліць бяссонніцы святло.



* * *

Ты ў жыцці нібы тайна,
Кветка-папараць ў снах.
Пакахаў за звычайна,
Ды заспела вясна.

На пялёстках парошы
У жыццёвай імжы
Я каханне, як ношу,
Пранясу у душы.

Хай цябе заварожыць
Белы май, яблынь хмель.
Свет развеснены Божы
Шмат адкрые зямель.

Шчэ шапочуць паляны
Сонцу, ліўню, траве…
Сэрцаў двух закаханых
Ціха споведзь плыве.

## Падаюць яблыкі

Падаюць яблыкі. Ў яблыкаў сэрцы-зярняты.
Падаюць людзі ад сэрца і вечных турбот.
Што наша восень на страты сягоння багата,
Так, як ніколі, бяднее зямлі радавод.

Як на духу — у вялікім мы вечна жывыя,
Крыж на магіле і крыжык як знак нарадзін.
След на пяску першы дождж, як заведзена,
змые,
След у жыцці ўсё ж не згубіцца наш
ні адзін.



## Код кахання

На душы лагодна стала —
Ты мяне пацалавала.
Шчырасць пылкую жанчыны
Раздзяліла ты з мужчынам.
У таемным засмучэнні
Ты прасіла прабачэння.
Завяла мяне ты ў нерат,
Не пайду назад. Наперад!
Бо прыняў як пакаранне
Тваё цяжкае прызнанне.

* * *

Пад святлом Венеры-зоркі
Ткуць свой майскі паясок
Затравелыя пагоркі,
Дзе, як золата, пясок.

Веснавей, каб не сурочыць.
Узышоў маладзічок.
Беларускай белай ночы
Развязаны каснічок.

І зрываюцца з галінак
У салодкі сон гракі.
Растрывожылі маліны
Маладыя салаўкі.

Цень ад коміна за хатай,
Нібы штык той за спіной…
Ды ніяк не страшнавата
Першай кветчыне вясной.



## Каханне

Што большай моцы на свеце?
Скажуць адны — гэта вецер,
Скажуць другія — вулканы,
Трэція — акіяны.
Могуць назваць навальніцу,
Гром і змяю-бліскавіцу,
Ранак ці мо змяркание,
Стрэчу ці развітанне,
Радасць над горам балючым,
Дзень над агаркам ночы,
Лета над белай зімою,
Голас над цішынёю.
Толькі з усіх прызнанняў
Я называю каханне.

* * *

Хачу ў жыцці трывогі —
Няхай у сэрцы звоніцца:
Уноч — пасля дарогі,
Удзень — пасля бяссонніцы.

Трывогу — сэрца вернасці —
Пакуль жыву, як ношу,
Нашу пры безнадзейнасці
І ў светлы дзень харошы.



## Запаветнае

Спеўны лад — старажытныя гуслі,
На стале даматканы абрус.
Пунсавеюць дзіцячыя вусны:
Беларус,
Беларусь,
Беларус!

Ад бяспомных душа абароніць
Мову нашу і род-карані,
Дзе світае меч гнеўнай Пагоні
І Грунвальда славутыя дні.

Гарт Рагнеды і веліч Скарыны,
Старажытных плямёнаў саюз.
Залунае наш сцяг над Айчынай,
Беларус,
Беларусь,
Беларус!

Хай легенда жыве аб Каліне,
Хто адолеў вайны землятрус.
Веліч продкаў у кожнай быліне —
Беларус,
Беларусь,
Беларус.

## Пара раўнадзенства

Не хмарся, зіма, на вясеньку-нявесту,
Крыўдуй не крыўдуй, а рыхтуй каравай,
Няхай падрастае вясельнае цеста
Для месяца з сонечнай назваю Май.

Распусціць вясна між бярозаў пралескі —
Глядзіць месяц вокам з-пад ночы брыва, —
Прымерае заўтра дажджу занавескі,
І зелена-порстка падскочыць трава.

У небнай сінечы святочна-ўрачыста:
Пара раўнадзенства на шалях вясны —
І ранак ад сонца з крылом залацістым,
І гром па-над хатамі з пахам лясным.



* * *

Шчэ месяц жніўны на календары,
І кожны дзень вяскоўцу у ахвоту.
І не даймаюць зумам камары,
І мёдам перапоўненыя соты.

Вясёлкі зняўшы ўвечары сіло,
Тыднюе поўня зноў на небазоры.
Падворак матчын, бацькава сяло,
Давайце зноў пра восень пагаворым…

## Мае Налібокі

Гісторыя роднага краю
У пушчаў дыханні жыве.
Я голасна лес свой вітаю,
Ён рэхам у госці заве.

Зайду. Мудры мой летапісец,
Лагодна раскрыеш душу.
І я у падвоблачных высяў
Замовы ад згубы прашу.

Знікалі звяроў пакаленні,
З-пад снегу ўсплывалі імхі.
Варылася ў хатах варэнне,
І пахлі грыбамі мяхі.

Хавалі лясоў леснічоўкі
Ад сцюж і нашэсцяў заўжды,
Дрыжэлі купальскія зоркі
На плыні крынічнай вады.

Калі ж ад хвароб ратавацца —
Сачылі жывіцу і сок.
І цеслі мазольную працу
Увенчваў на зрубе вянок.



* * *

Вядзі мяне, дарожка-сцежка,
Ў абдымку родных туманоў,
Да тых аселіц і узмежкаў
Без лебяды і палыноў.

На старадрэвінах шпакоўні
Даўно ад часу пагнілі.
Ды маладыя ўсходзяць поўні,
Дзе мы малечаю былі.

Дакорам стрэне двор сірочы,
Як быццам тут і не жылі.
Агонь слязы прапаліць вочы —
Магіла мамы на зямлі.

Не бацькаў дом — чужая дача,
І новы ў хаце гаспадар,
І ўсё расстаўлена іначай
І ператворана ў тавар.

Мой родны дом, якой кляцьбою
Караць мне лёс за гэты здзек?!
Мне быць асуджаным табою
За здраду сынаву навек.

### * * *

Белыя заплаткі
Конь-мароз скубе.
Коцікі-зярняткі
Пухнуць на вярбе.

Ў ледзяша з застрэшша
Нос зусім пацёк.
З клёну саладзейшы
Сакавіцкі сок.

У хлявах — прыплоды,
Ў хатах — сырадой.
Пахнуць агароды
Бульбай маладой.

Гімн складаюць пеўні
Сонцу і вясне.
Раўчуку ўжо спеўна
У лядовым сне.

Нібы рукавіцы,
Кіне вечар цень.
Сэрцу надзівіцца
Выпала за дзень.



## Мая просьба

Народзе, прашу: не формай салдата,
Не срэбрам адкупнай багатай рукі,
А праўдай і мужнасцю адваката
Мову сваю зберажы на вякі.

Слова Скарыны і песню Купалы,
Мову-салоўку, гаворку-брую
Абарані ад знішчальнай навалы,
Ўклаўшы у слова душу сваю.

Змове шыпячых, глухіх, выбуховых
Поўнагалосся струной загучы.
Толькі ад гэткага наступу мовы
Ў цень пападуцца ўсе крумкачы.

## Дуб Гётэ

У канцлагеры Бухенвальд фашысты падвешвалі вязняў за ногі на дрэве, пад якім калісьці часта адпачываў вядомы нямецкі паэт Гётэ. Палонныя ад такіх катаванняў паміралі.

Праходжу праз турэмныя вароты:
Вось гэта дрэва — дуб любімы Гётэ,
І тут яго юначыя сляды…
«Вады… Вады…»
Калючым чорным дротам
Смяротнік лагера падвешаны канаць
І харкае адно крывавым ротам.
Зноў цішыня…
І Гётэ малады…
Зноў дуб хавае светлыя гады
Асеннім часам, лісця пазалотай
Свабодных думак неўміручых Гётэ…
Глухі удар хлыста і цяжкіх ботаў,
За смерцю смерць,
І стогну больш няма.
Для ката не занятак, а работа,
Звярыная прафесія — вайна…
Стаю маўкліва я на сцежцы вузкай
Ля свежых руж і памятнай пліты:
Журба Хатыні нашай беларускай
І Бухенвальда абеліск святы…



## Плач Бухенвальда

Ненажэрная печ,
Сэрцаў колькіх магіла,
Ты крывёю гарыш,
Сэрца паліш агнём.
Дужка шэрая плеч,
Дзве рукі на паўсілы,
Пасівелая маці
З нямым дзіцянём.

Што так спраўна чадзіла,
Цяпер жа астыла.
Шэры попел як снег,
Ды не тае вясной.
Ты нянавісць ўва мне,
Маладым, спарадзіла,
І любоў да жыцця,
І пакуту навек.

## Сафійскі сабор

На кручы над плынню Дзвіны
У белле вечнае ўбраны
Стаіш, чысты цуд даўніны,
Як помнік святы палачанам.

Як ветразь спакойнай ракі,
Ўлюбёны ў высокае неба.
П’юць ранку святло жаўрукі,
А ў доле скрозь лашчацца вербы.

Хоць біліся смерчы ў званы
І сцены жагналі маланкі,
Цапы малацілі вайны, —
Твой дзень пачынаўся світанкам.

Узносіш надзею людзей
На шчасце, на годнасць па праву,
Што з’явіцца твой Чарадзей
І верне здабытую славу.

Ты ў свеце — Сафійскі сабор,
Сафійка — у Полацку стольным.
Як твой беласценны убор
На твар Беларусі падобны!



## Аб хлебе

У хлеба святая памяць аб маці
І Ленінградзе.
Нібы ў пятлі, заціснуты горад.
Голад.
Людзі збіраюць крошкі.
«Яшчэ б трошкі!..»
Вось-вось захліпнецца
    сэрца ў дзіцяці.
Маці!
«Ма-м-а-а!»
Тваімі рукамі засеяна поле.
«Хлеб-а болей…»
«Сынок, памаўчы, мілы…» —
    ужо над магілай.
Круцяцца жорны.
Белы і чорны.

## Вечар сустрэчы

Люцень не дужа халодны, дарэчы.
Вечар сустрэчы, месца сустрэчы.
Школа, ты Меккай сапраўднаю стала,
Месца паломніцтва — школьная зала.
Слёзы на зрэнках, бы іскаркі свечкі.
Вечар сустрэчы, радасць сустрэчы.
Шал маладосці, мудрасці веліч.
Шчасце сустрэчы, памяці вечар.



## Прадаўжэнне

Дзядулю
Скасіла куля пад Берлінам.
Трымаю немаўлятку сына,
Трымаю ўнука.
А можа, зноў працягне
бацька рукі
І, як мяне, сыночка панясе.
І будуць слізгаць цені
па расе.
Пад сонцам
Шчаслівыя бясконца
Я, сынок і тата…
Няпраўда, што ў сэрца
з аўтамата!
Вось пісьмы ўсе яго,
Знаёмы почырк…
І дзедавы у сына вочы,
І родная радзімка на шчацэ,
Рука ў руцэ.

* * *

Дажджу жадаюць — не клянуць,
І кропля кветачкаю стане.
Травінка ўзыдзе, каб глынуць
Расіцы чыстай у тумане.

Так і народная душа
Не звяне ў пошласці і глуме,
Калі зачэрпае спярша
Жывой вады ў крынічным шуме.

Дажджынка ў камень пападзе,
І разляцяцца светла пырскі.
Маіх дзяцей, маіх надзей
Вятры не выкінуць з калыскі.



## Альма-матар

У бярозкі жоўты ліст у косах,
Верасень у сонечным двары.
Літары свяжуткія, як росы,
На старонцы ў белым буквары.

Тут маленства пружыстыя крокі,
Ад дзяцінства да юнацтва след.
Зазвініць вясна кляновым сокам,
І кахання ўспыхне першацвет.

Дзень у дзень, і школьны век,
як тыдзень,
Прамільгнецца спешліва ў жыцці.
Калі «пяць», то на душы Вялікдзень,
Калі «два» — настроем папасці.

І шчыруе школа, як планета,
Адпраўляе вырай кожны год,
Каб вачамі юнага паэта
Зноў прывеціць верасня прыход.

## Пасля дажджу

І адплывала навальніца
З дажджом, бы ветразем, за бор,
Нібы пруткамі, бліскавіцай
Карункаў вяжучы узор.

Павылезшы з-пад крылаў маткі,
Стаялі ціха на страсе
Ў гняздзе двайняткі-бусляняткі
І абсыхалі пакрысе.



* * *

Усё цяжэй пчале знаходзіць кветку
Сярод сіўцоў, не кранутых касой.
Паплыў павук да восені ў разведку
Услед за самалётнай паласой.

І лес, здалося, верасню паверыў,
Надзеў бярозам космы-парыкі.
А за дажджамі праразаюць шэры,
Размоклы дол ізноў баравікі.

## Да лета

Скаціўся дзень у сонечным клубку
За небакрай. І вечар па-старэчы
Кладзе туману белую руку
На цёплы луг, як на зямныя плечы.

Венера-зорка, быццам альбатрос,
Штурмуе высі над маўклівым дубам.
Цікаўны месяц вытыркае нос,
Кусае ноч свае нямыя губы.

Пра восень забываеш і зіму,
Хоць на палях каўнерык жоўты жніўня…
Я шапку перад хмараю зніму
І захлынуся нечаканым ліўнем.




2002

## Святло блакіту

Лугавымі фарбамі палескімі
Зацвілі пялёсткамі пралескі,
Каб пасля святло свайго блакіту
Перанесці на валошкі ў жыта.

Свечкамі успыхнуўшай гарлянкі
Засініць з расы наймітку ранкам.
Зазвінець раскрытымі званкамі
Ды паплыць купальскімі вянкамі.

Луннікам пад поўняю лілеяць,
Зубніца дзе бэзава сінее,
Сверцыя, сон лугавы, гарычка
Свецяцца запаленай газнічкай.

Касачы раскрытаю далоняй
Жужаля на цёрн калючы гоняць.
Шчурка з прыгажуняй-страказой
Хмеляцца балотнай дзеразой.

Сінькаю пральецца неба ў лён,
Каб лагодна ўзяць душу ў палон.

* * *

Сумуе сонца днём па леце,
Ніжэй схіляе галаву.
І зоркі, месяцавы дзеці,
Зноў скачуць весела ў траву.

Прытупне гром ўгары абцасам.
Міргне маланка перуну.
Разгладзіць хмара, нібы прасам,
Вясёлкі цёплую спіну.

Па жніўню справіўшы памінкі,
Запрэгшы раніцы вазок,
Махае верасень галінкай
На лета бабіна знарок.



* * *

Вочапам захад над бруйнай ракой
Сонца вядзерца трымае.
Вечара летні густы спакой
Далеч ва ўладу прымае.

Сосны, як свечкі, пагаслыя днём,
Вогнікам зорак успыхнуць.
Месяц у рэчку нырне акунём
Спіну пярэстую выгнуць.

Цемрадзь аплавіць узвышшы-груды
Поўначы чорнаю магмай.
Коўш свой нахіліць — зачэрпне вады
З рэчкі Мядзведзіца прагна.

## Летам

А час, як знічка, праімчаў,
І чэрвень ноч скруціў у скатку,
І месяц стомлена маўчаў,
І додня прарасло зярнятка.

Не высыпалася пчала,
І багацелі птушак зыкі.
Ды дзераза ў барах цвіла,
Вусы раскінуўшы, як лыка.

І срэбрам ранішнім лугі
Ад росаў і сіўцоў бялелі.
А з-пад вясёлкавай дугі
Маланкі спіцамі звінелі.

Зязюляў менела. Каршун
Вышэй да сонца падымаўся.
І доўга спачываць пярун
У хмары восені не клаўся.



## На восень

Свецяць белай лускою бярозы,
Туманы ля кустоў як папар.
Ноч пад раніцу ўехала возам
Напрамкі ў непраходны гушчар.

Цені мокнуць, нібы рукавічкі,
У прапахлай зноў мохам расе.
Промні сонца, нібыта лісічкі,
Прарастаюць між дрэў пакрысе.

Па гадзінніку цёплага лета
Прачынаюцца шчэ мурашы
За сезонам птушыных канцэртаў
Ладзяць дружна свае кірмашы.

Толькі дуб адзінокі святыняй
Жалудамі уверсе звініць.
Ды асіна пад купалам сінім
Сірацінаю горкай стаіць.

* * *

Апошні снег зімы-вяртанкі,
Цяжкі, бы восеньскі туман.
А ў згадках юнай глыбачанкі
Вясны прачытаны раман.

Плыве дзявочы капялюшык
І асвятляе сумны дзень.
Снег ахінае белым плюшам
Цяпло прабіўшыхся грудзей.



## Крэскі вясны

Злятаюць з коцікаў пялёнкі,
Вісіць туману ручнічок.
Скідае воблакаў валёнкі
З нагі сваёй маладзічок.

Спраўляе красавік абноўкі —
Красуе рунню зноў ралля,
Пралесак сінія галоўкі,
Пялёсткі крыльцаў матыля.

Праклюнуў песняю вясенняй
Надзем’е зморaны жаўрук.
Іграе дзяцел на вяселлі
Вясны — звініць струною сук.

Рыбачыць першы раз вясёлка,
З вярбы прыладзіўшы кручок.
Прамокла радасная пчолка,
Пад дождж папаўшы, бы ў сачок.

## Позняе

Лебедзя крылом туман махае,
Сонца блісне рожкамі смаўжа.
Зноў на клёне лета дагарае
І на бэзе квецені іржа.

Прасігналіць чарадою галак
Вецер на паўмокрым бальшаку.
Хвалі пачынаюць, нібы валак,
Церці, як каноплю, асаку.

Апрануўшы жоўтую манішку,
Лес успыхне свечкамі бяроз.
Трушчачы ялін сухія шышкі,
Па калдобах прагрукоча воз.

Журавін пара ізноў адыдзе,
На чарнічнік ляжа свежы снег.
І зіма у вобразе-прывідзе
Аб сукі праколе белы мех.



* * *

Які магічны паварот,
Бы часу знойдзена падкова.
Цябе сустрэў праз столькі год
У навальніцу выпадкова.

Калі маланку, нібы меч,
Хаваў вясенні гром у хмару,
Калі на плёс жаночых плеч
Дажджынкі скочваліся з твару.

Здалося, слухаў двух багоў.
І лёс мне быў як пакаранне
Ад неба за маю любоў
І звышчаканае каханне.

Я сніў дзяўчыну ў светлых снах,
Сустрэў жанчыну ў срэбры ліўня.
Мая далёкая вясна
Пярсцёнкам празвінела жніўня.

## Пад паўночнай зоркай

Куток бацькоўскі пад паўночнай зоркай,
Сурвэт снягоў і сцятасць маразоў.
Травеюць тут красавіком пагоркі,
І колаў грук на змену палазоў.

Як кінуць вокам — бачны габелены
Гаёў малочных, залатых бароў.
Тут захаду прасмаленыя сцены
Астуджаныя ружаю вятроў.

Ты на зямлі маленькая радзімка,
Радзімы край, адкрыты мне ў жыцці.
Хай апынуся ў вечнасці ў абдымках —
Застанешся валошкаю цвісці.



## Нараджэнне вады

Ручай, як з яйка птушаня,
Праклюнуў шкарлупу-ільдзінку.
Спачатку ў след папаў каня
І затрымаўся на хвілінку.

Счакаўшы поўных берагоў,
Гулліва збег па каляіне
У вір настоеных снягоў,
Каб растварыцца ў мутнай ціне.

Як свежай рошчынай з дзяжы,
Луг захлынуўся зноў вадою.
Са стрэх цурчэлі капяжы,
Нібы струмені сырадою.

### * * *

Заносіць пяском парог
родней хаты.
Вокны як краты.
Астыглая сажа
у дымаходзе,
Галкі не родзяць.
Саржавелы гадзіннік
з мядзведзямі,
Стол шашалем з'едзены.
Нібы пратэзы,
у чалесніку вілы,
Подпал прагнілы.
Павуціннем зацягнуты
жорны,
У плесні столь чорнай.
Зеўраць без дна кашы,
Хата без душы.



## За год да XXI стагоддзя

Хоць студзень з люценем даўгі
Шчэ не вярнулі поўным возам,
Снягоў не складзены стагі
І не адліты ў лёд марозы.

Пакуль ручай, як каснічок,
Не развязаўся пад нагамі,
Не перакінуў праз плячо
Вясёлку дзень ўгары над намі.

Ды будзе вуснамі каса
Расой атавы наталяцца,
І прыйдзе час у каласах
Зярняці сілайналівацца.

Бы з лапцяў, сплеценых з лазы,
З буслянак вернуцца у вырай
Буслы, і ў рэчках ментузы
Нырнуць да лета ў бездань віру.

Як здзівіць снежня першаслед,
Каб сведкам веку і прыродзе
У поўнач стаць, як ступіць свет
Зноў на мяжу тысячагоддзяў.

* * *

Чаўны, чайкі, час шыпшыны.
Снежань, веяю сняжыць.
Пчолы рады канюшыне,
Сані ў полі труць глыжы.

Шэпча мятлік ў сонным лузе.
Ў белым панцыры палі.
Паплавы як шчасця вузел.
Валак зебрыцца раллі.

Лета душнага ўспаміны.
Памяць бомаў пад дугой.
Сонцам паленая гліна.
Сэрца ранена тугой.



## Дачы на Нарачы

Стары нарачанскі сад
Карэннямі цягнецца к возеру,
Зусім маладзенькі салдат
Глядзіць Куляшовым позіркам.

Трымае гадоў тугу
Ў малінніку дачны дворык,
Дзе вішня на самым рагу
З грушай Лынькова гаворыць.

Дзе праз паркан і мяжу
Сцежка крадзецца да ганка,
У вокны, бы ў вочы, гляджу
Дачы Максіма Танка.

У хвалях вады неспакой,
Хутка канчаецца лета.
Знічкай, нібыта рукой,
Ноч блаславляе паэтаў.

## Завіруха

Сняжынкамі, як вейкамі,
Міргнула цішыня.
І веі-белазмейкі
Нікому не стрымаць.

Б’ючыся аб таросы
Чарнеючай раллі,
Кладзе віхор пракосы,
Гудзе, нібы чмялі.

У гушчарах сарокі —
Прыцэламі хвасты —
Кідаюць меткім вокам
У шорсткія кусты.

Сукі нібыта рыльцы
Спалоханых дзікоў.
Чакае пагаліцца
Лес зноў маладзіком.



## Сёстрам

Я вам пакуль не прысвяціў радка,
Хаця жыцця ўжо стрэхі абамшэлі.
Пайшла і хата наша з малатка,
Якую доўга мы цяплом не грэлі.

Падстрэлены гадамі журавель
Хіснуўся ўбок сваёй жалезнай дзюбай.
Вядзерца днішча, як стары рубель,
Журботна пракацілася па зрубе.

І бацькі франтавыя медалі,
І маці вышыванкі-рукатворы
Мы падзяліць,
як грошы,
не маглі
Пад абразом,
знямелыя ад гора.

## Пачатак зімы

Вецер арфуе насыпаны снег,
Ля плота збівае валёнкі.
Спуджаны голас залётных кунег,
Вей белакрылыя гонкі.

Чорным арэхам шпакоўня ўгары
Ў інеі кроны імгліцца.
Ў рызах слупы, як зімы святары,
Выйшлі на лета маліцца.

Вечар каўтае клубчаты дымок,
Конь снег натрушаны месіць.
Ноч прымярае, нібыта канёк,
Ў неба да воблака месяц.

Снежань нямы апячэ далягляд
Поўнач раскошаю зорнай.
Першы мароз, як з пад'ёму салдат,
У лесе агучыцца горнам.



* * *

Бераг. Вечар. Кастроў веча.
Іскрын-светлін выдых зорны.
Жалудамі, бы карцеччу,
Абстраляны плёс азёрны.

Як салдацкая пілотка,
Што зляцела з галавы,
Ў белай пене стыне лодка,
Два вяслы — два рукавы.

Ад агню над цішай сцежкі
Калыхнецца смуглы цень.
Дагараюць галавешкі,
Рассыпаюць зор ірдзень.

## Рабінавы дзень

Нібы туман, страсаюць стрэхі
Спякоты летнюю нуду
Кідае лівень, як арэхі,
Цяжкія кроплі у ваду.

Жытоў бурштынінкі-зярняты
З калосся сыплюцца на дол.
Грамы, захмарныя гарматы,
Грымяць нязмушана наўкол.

Ілля зажынкам ладзіць лазню.
Над парасонамі стагоў
Маланка зырка вокам гляне,
Нібы шукаючы каго.

Ды галавы падняць не можа
Прамоклы вецер ад травы.
З шнура фартух кароўкай божай
Імкне ў абдымкі крапівы.

Пагаслыя у траўні свечкі
Агнём успыхнулі рабін.
Каштаны, як жаўткі з яечка,
З крывёй змяшаліся калін.



## Змена квадры

Лязо маланкі у зямлю,
Бы нож у бохан хлеба.
Гром працінае цішыню
Па кроквах, як па рэбрах.

І лезе хмара — вясны дар,
А галава — у плечы.
Зямля дажджу адкрыла твар
У красавіцкі вечар.

І разгавеецца прастор,
Каб аджывіцца жытам,
Жывіцу пусціць смольны бор,
І лівень скончыць квіты.

Залевы ранняе святло
На сподзе неба дужкай.
І забялее зноў сяло
На туманах-падушках.

## Дома

Кветка кожная прывеціць,
Зорка радасна ўпадзе —
Не сустрэць вясны у свеце
І зімы такой нідзе.
За сцяжынкаю — дарога,
За крыніцаю — рака.
Тут сяброў сустрэнеш многа
І нярэдка — сваяка.
Слова чуеш гаваркое
З вуснаў хітрых байдуна:
То душэўнага спакою,
То як выбух перуна.
Дзе не маюць загатовак,
Пашкадуюць жабрака,
Дзе аднолькава нязломак
З правай левая рука.
Дзе над кожнаю труною
Спавядаецца душа…
Дзе пад раніцу вясною
Нараджаюцца спярша.



* * *

Вырай — растрывожаны вулей.
Мытнік першы раз бездапаможны:
Легіён бязвізавых гусей
Пралятае мытню асцярожна.

Шыю цягне стомлены важак
На званочак жаўрука ляснога.
Як з сямейства рэдкага вужак —
У бярозах чорная дарога.

А буслянак, як капелюшоў,
Быццам час вясновых каранацый.
Дождж-сявок прысадамі прайшоў,
Пакалоўшы аб ігрушу пальцы.

Хмары, нібы крылы ветрака,
Развярнуў на поўнач цёплы вецер.
Вераб'ёў вясёлых талака
Атрасае ад макрэчы вецце.

## Экватар зімы

На поўдні шчэ хаваюцца грамы,
Рапірамі маланак ў небе звонячы.
У нас на колах поўні паўзімы
Адвезена на край далёкай поўначы.

Ужо дзяніцца ўсмешкаю раней
Прасвечвае паўснежныя узмежкі.
Дарога, бы наждачка, для саней
Выкочвае груды, як галавешкі.

У садзе груша, бы ад ветру ёрш,
У ледзяшоў адліжная падсочка.
Адхуквае сонца усё больш
У студні замарожанае вочка.

Глытае вечар з дымам туманы,
Ды, зрэдку папярхнуўшыся марозцам,
Пячэ па снезе прэсныя бліны
Ў разоры чорнай, як на скавародцы.

Ў бярозы наліваецца кара,
Нібы да родаў маладыя грудзі.
Ігліцу, як іголкі, у барах
Прашыць грыбніцу,
        вострыць цёплы студзень.



* * *

Зноў конікаў цырульня
Адкрылася ў траве.
Шпакі праводзяць гульні
Прад выраем свае.

Туманам, як балотным
Самшоны мохам дзень.
І надвячорак кротам
Крадзецца па градзе.

Маланку зацугляўшы,
Ад'ехалі грамы.
Заплача ноч, счакаўшы
Прысуд зямлі нямы.

Парэпаныя сцежкі.
Ваколіца. Сухмень.
Бы лета галавешкі,
Ралля, дзе быў ячмень.

## Фантазіі вясны

Звісаюць абоймай са стрэх ледзяшы,
Ляжаць, нібы ток, агароды.
На яйках галубка ў застрэшным кашы
Звярае гадзіннік прыроды.

А вецер, сарваўшы ўсе звязкі свае,
Зноў флюгера жэстам гаворыць.
Старая, патупаўшы, снег абаб’е
І вокны ад сонца зашторыць.

І выедзе дзед на яловым кійку
На лаву з ацепленай хаты.
Падсобіць падковаю конь ручайку,
Разбіўшы лядовыя краты.

На вока — зіма не зіма на двары.
Ды весняе чуйна ў прасторы.
Гракі мак таўкуць, нібы ў май камары,
Мароз ледзьве дыхае, хворы.

Дзень цень, нібы лыжы, да дрэў прывязаў,
Куст бэзу пад сонцам распяты.
Слуп, быццам на прывязі ў садзе каза,
Трымае свой гонар рагаты.



## Вачамі мастака

Лета сухмень. Паазер’е. Заранка.
Парыста бераг залье малаком.
Шчоўкае ветру ў чаротах марзянка,
Сонца з чаўна устае галяком.

Браслаў, нібыта юнак зухаваты,
Будзе па следу зары веславаць.
Быццам дзяўчыну, абдыме Дрывяты,
Каб патаемна туліць-мілаваць.

Вуліцы горада нібыта межы.
Тут раздзяляе азёры плато.
Колькі ў Навята, Святца, Бярэжа
Той прыгажосці дзівоснай, святой.

Коскай забытая звечара лодка.
Бераг жаўцявы — бясконцасць радка.
Поле свабоды да самай Слабодкі
Змесціць на золку мальберт мастака.

* * *

Быў. Ёсць. Буду.
*У. Караткевіч*

Быў. Ёсць і буду. Дзе асеў народ
Блакітнавокі, русы, ў краі белым,
Дзе крышыць сонца красавіцкі лёд
І лён звініць у полі ў жнівень спелы.

Дзе вышынёй натоліцца жаўрук,
Пчала не раз напоўніць мёдам соты.
Дзе шчасце цэняць не з вяльможных рук,
А з зрэб'я, накрухмаленага потам.

З часоў Гусоўскага жывуць яшчэ зубры,
Дзе Лань-рака лясная п'е крыніцы.
Для гонкіх мачтаў вартыя бары,
Прасмаленыя, як чаўны, жывіцай.

Час даўніны хавае палімпсест,
І дзірванеюць курганы пад небам.
Народным святам вернікаў тут фэст
І ў сябрах душэўная патрэба.

Расце хай жыта і жыццё цячэ
Ў краі шыпшыны, кветкі Беларусі.
Ён быў. Ён ёсць, каб вечна быць яшчэ,
Дзе распраўляе вольна крылы бусел.



* * *

Паўночны край. Глыбоччына. Радзіма.
Адна у свеце, дзе мой родны дом,
І самы чысты снег, нібы крыніцы, ў зіму,
І самы звонкі першы над Беразвеччу гром.

Дзе Свіліца дала імя сваё Падсвіллю,
Дзе у бясхмарны дзень сустрэне шэптам Шо.
Дзе Аржаніца-рэчка з ячменным пахам піва
І вечна юны Мосар з трывожнаю душой.

Галубіцкая пушча барамі ў Налібокі,
Ля азярын гаючых аселі Азярцы.
Тут думаецца ўсім глыбока у Глыбокім,
Ды бальшакі вядуць у розныя канцы.

Хоць загваздкі даўно мянялі у Гваздове,
З дружынай Чарадзей ў Чарневічах хадзіў.
Татарын, старавер зямлі удзячны, мове,
Што роднымі для іх сягоння з нарадзін.

Жыццё, бы у вулей, сабрала тут паэтаў,
Разьбяр, каваль, мастак тут слынны не адзін.
І неба вышыня адразу на паўсвету,
І ў дар куток бацькоўскі ад самых нарадзін.

## Навальніца

Нёс вецер хмару ў рэзгінах з маланак,
Губляючы саломінкі дажджу.
Хістаў валошкі ў кіпцюрах канянак,
На летні дзень надзеўшы паранджу.
І сонца, нібы вылівак птушыны,
Трымцела перад прыпекам агню.
Мядзяны рой над возам канюшыны
Спадаў пад ногі лёткаму каню.
Свістала пуга у руцэ з ляйчынай —
Такім кароткім здаўся хлопцу дзень.
Прыпол сукенкі светлая дзяўчына
Аберуч прыціскала да калень.



* * *

Нібы плугам, сум разганю,
Што у сэрцы ляжыць папарам.
Абвяшчу веснавому дню
Дзень вясёлкі над цёмнай хмарай.

Кволым крыльцам махне лісток
Ў жабурынні бялюткім каліны.
Пабяжыць зноў зялёны ток
Па зямлі і па дрэў галінах.

Разгавеецца сонцам душа.
Паласуе маланка неба.
Мне б пражыць лістапад спярша,
Пражыць лістапад мне трэба.

* * *

Красуе ў Беларусі жыта.
І стан ад гэтага душы,
У асвячэння час нібыта,
Хоць сэрца ўласнае сцішы.

У кожным коласе малочным
Зямлі схаванае цяпло,
І зорак незлічоных вочы,
І сонца летняга святло.

Бальзам дажджоў і віхраў свісты,
Спеў жаўрука і звон пчалы.
Расінак цяжкія маністы
І бляск маланкі, як стралы.

І чорны бохан на абрусе,
Жаданы ў хаце кожны дзень.
Красуе жыта ў Беларусі,
А значыць, і жыццё ідзе.



## Двое ў лузе

Загарае твар дзяўчыны
На падушцы з дзьмухаўца.
Луг зялёнаю пярынай
Стаў таксама для хлапца.

Двое ў лузе, двое ў свеце
Шчаслівейшыя адны.
Ад кахання сэрцы ў цвеце,
Ды з гаркотай палыны.

Вусны юныя спакусай,
Ідзе кругам галава.
Для дзяўчыны дотык вусаў
Нібы першая трава.

Пах салодкай канюшыны,
Быццам дыхае зямля.
Каб з травы устаць дзяўчынай,
А жанчынай стаць пасля.

## Пасля дажджу

Ноччу скончыўся сухмень
(Аж да додня палівала).
Сонца, кінуўшы прамень,
Баравік пацалавала.

Падасінавік з асінай,
А чашчэвік пры бярозе.
Не баяцца ног ласіных,
Зрэдзь паселі на дарозе.

Вабяць яркімі самбрэра
Ў лясным танцы сыраежкі.
Мухаморы-кавалеры
Побач топчуцца ля сцежкі.

Сонца стрэне парасонік,
З травы вылезшы, цыбаты.
Абляпілі ўскрай сасоннік
Маслякі, як парасяты.

Махавік, як цвік, у моху
Шляпку жоўтую хавае.
Ды, прыжыўшыся патроху,
Рыжык гонар свой трымае.

Чаргой мокрыя радоўкі
Навылёт зямлю прашылі.
Воку рэдкія вясёлкі
Нагам лапцікі пашылі.

Чага з губкай старадрэвін
Цесна ствол акальцавалі.
З-пад іглiцы, як са шчэлін,
Нос лісічкі паказалі.




2007

## Акварэлькі вясны

Зноў вясна адзывае ўсіх птушак,
Як прызначаных ёю паслоў.
І грамы, як з зараджаных пушак,
Б'юць маланкамі ў грудзі лясоў.

Цёплы вецер смакуе ільдзіны,
Смагу ўсё не натоліць ніяк.
Сонцу першым падставіўшы спіну,
Нерастуе ў затоцы шчупак.

Туману забялеюць мярэжы,
Додзень бы рукатворны калаж.
Як прычасцем, кляновікам свежым
Адгаўляецца першы мураш.

Ды крыло матыля, як вясёлка,
Мільгане між пасохлай травы.
І рухавая, зумкая пчолка
Хабатком п'е няктар сінявы.

* * *

Ах, якія зоры!
Млечны Шлях разорай,
Скопішчы Плеяды,
Россыпы Гіяды,
Ззянне Андрамеды,
Лебедзя прыкметы.
Ля Малой Мядзведзіцы
Коўш Вялікай свеціцца.
Голуб небны зорыцца,
Заяц Псу не скорыцца…

Ды з кутка Радзімы
Найчасцей глядзім мы
На месяц і сонца,
Што гараць бясконца,
Каб расла травіца,
Ззяла бліскавіца,
Не мялелі рэкі,
Век імкнуў за векам
І расло карэнне
Новых пакаленняў.



## Нечаканы антракт

Цыклон. Халодны дождж. Агарак лета.
І мокры дзень пасля гарачыні,
І град сарваных бураю ранетак,
Хоць Спаса шчэ не наступілі дні.

Прырода ўся пад парасонам неба,
І вільчык хаты, і гняздо бусла.
І грае дождж па лодкі тонкіх рэбрах
І па лязу, сцякаючы, вясла.

Ды выхадны упершыню у пчолаў
І перамір'е ў пеўняў на мяжы.
Адзін вятрыска малады у голлі
Раз-пораз ладзіць зноўку куражы.

І не праб'ецца голас летняй птушкі,
І не засвецяць крыллем матылькі.
Ды толькі моху мокрую падушку
Праклюнуць зранку зноў баравікі.

* * *

Мядзведзіцы жоўты вазок
Цягне па небе поўня.
Знічкі начной лязо
Успыхне халодным промнем.

Светлай здаецца ноч,
Слепле акно ў фіранцы.
Цені адны наўзбоч
З дрэвамі ў белым танцы.

Голас падасць цягнік,
Быццам бы птушка каня.
Новай вясны сакавік
Першай пралескай гляне.



## Ідылія

Віруюць ластаўкі асцём
Пад неба пазалотай.
Ды сонца сочыцца святлом
Паўкруг праз ніты плоту.

Нібы падвешаны, жаўрук
Звініць над росным полем.
Трымае дзюбу, як муштук,
Бацян у лёце кролем.

Як самалёцік, каршучок
Высока дзень завершыць…
І лета жнівеньскі радок
Застанецца у вершы.

* * *

Дарагое, як сон. У той хаце
Наздраваты пах кіслых бліноў.
На мадонну падобная маці
Рэжа бохан духмяны ізноў.

Сырадой бы кіпіць. Маслабойкі
У крышталіках першых — крыжы.
І на лусце жаўцявыя долькі,
Саладуха, хоць пуп развяжы!

А кісель-аўсянец! Елі посны,
Як раскоша каляднай куцці.
У начоўках праз хату да кроснаў
Я і сёння гатовы плысці.

Каб скародзіць за хатаю поле,
Вяршыць копы з бярозавых дроў.
…Ды Парыж еўрапейскі ніколі
Лепш не будзе маіх Ермакоў.



* * *

Жанчына гаворыць
Вачыма,
Калі ў іх святла
Не стае.
Жанчыну
Пакрыўдзіў
Мужчына,
Пазбавіўшы
Шчасця яе.

Жанчына гаворыць
Вачыма.
У радасці ці у бядзе
Кароткім ці доўгім,
Магчыма,
Ёй здасца
Ад гэтага дзень.

Жанчына гаворыць
Вачыма.
Зусім не паглядам
Нямым.
Жанчына гаворыць
З мужчынам
Пра толькі вядомае ім.

## Не арэхавы год

Садам зайздросцячы, арэшнік,
Нібы пакрыўджаны з вясны,
У санцапёк, нібыта грэшнік,
Хаваўся ў гушчары лясным.

Наўкруг яго дубы звінелі
У завушніцах жалудоў,
Ад гаркаты штодня хмялелі
Каліны ў чырвані пладоў.

Паляны ў пацерках суніцаў,
Ў сухіх сіўцах баравікі.
Хваіны ў золаце жывіцы.
І пах чабору ля ракі.

Гарачыня без навальніцы,
Гаючы рэдкі дождж-сявок.
Сіло сатлелай бліскавіцы,
Туману восеньскі дымок.



## Зыход лета

Хвалі, як бенгальскія агні,
Блікі дагараючага лета.
Адыходзяць сонечныя дні,
Салютуюць залпамі ранетак.

Неба зацяжарала дажджом,
Справіць хутка восень нарадзіны.
І глядзяцца ледзь не ў кожны дом
Гронкамі ружовыя рабіны.

Сіла лета перайшла ў зямлю,
І жаўцее лісце зверабою.
Зажурыла восень цішыню
Туманом, як пенай сырадою.

Ды жаўрук не пырхне з-пад нагі,
Толькі бусел прагне ў небе волі…
Павуцінне, быццам ланцугі,
Да снягоў скавала наваколле.

## Канец дня

Дзень, сваё адгаварыўшы,
Адшумеўшы, аддажджыўшы,
Апускаецца на дол.
Цені, як сляпыя мышы,
Распаўзаюцца вакол.

Адвячорак нібы певень:
Захаду чырвоны грэбень,
Крылы-промні убакі.
Ластаўкі як стрэлы ў небе,
Хмараў лёгкія вянкі.

Сонца, поўні здаўшы змену,
Пакідае хатаў сцены,
Тоне, нібы карабель.
Вырываецца, бы з тлену,
Ноч бухматая, як чмель.

Толькі зноў на агародзе
Невідушчы крот скародзіць,
Узрывае цалікі.
Ды запальвае на ўсходзе
Лета зоркі-светлякі.



## Прэлюдыя восені

Прыскочыў вецер-невідзімка,
Скрануць не здолеўшы раллю.
Страху, бы лёгкую хусцінку,
Сарваў і кінуў на зямлю.

Гнуў дрэвы ўсе з мядзведжай сілай,
Рваў хмары, нібы ласкуты.
Падняў капежку, як на вілы,
Каб зноў скруціць з яе жгуты.

Скакаў праз нізкія парканы,
Узгоркі, цёмныя яры.
Ды часам, быццам воўк загнаны,
Кідаўся ў вузкія двары.

І змогшыся пад самы вечар,
Слабець пачаўшы на вачах,
Зрабіўшы спробу ўсцяж пабегчы,
Падняўся пылам і зачах.

Ўгары ізноў свяцілі зоры,
І ліўся поўні жоўты свет.
Гаілі сонныя прасторы
Віхуры ўтаймаванай след.

## Пакровы

Зямлісты неба колер
І ні жывой пражылкі.
Нясуць вятры ў прыполе,
Нібы святло, сняжынкі.

Паўвосені ў прыродзе,
Прапахлі пуні летам.
Зіма на падыходзе,
Дажынак песня спета.

Рудое ржышча ў полі,
Счарнелы лапік лёну.
На павуцінні ў голлі
Званочкам лісцік клёну.

Густы сівец туману
Глыне ля рэчкі вечар.
І пад шулы паркану
Падставіць мякка плечы.



* * *

Выжарыны спаленых хат,
Пустыя шпакоўні.
Саду здзічэлы пагляд
Пад сонцам, як поўняй.

Чэрвеня безгалосы дзень
Ад ранку да вечара.
Вайны рукатворны агмень
Бязлітаснай сечай.

Асвечаны морам слёз,
Перажыты гадамі.
Радзімы пакутны лёс,
Ды не сталі рабамі.

У памяці цяжкі грэх
Асуджанага пакалення.
Часу імклівы бег,
Пробы высокай сумленне.

## Крывічанка

Як да твару, табе да твару
Саламянае жніўня святло.
Капялюшыка вабныя чары,
Броў дзявочых жывое сіло.

Зоркі яркай таемны позірк,
Неруш вуснаў, вясна грудзей.
Не скрадзе маладая восень
Першацвету шчаслівы дзень.

На Ядвісю калючай ігрушкай
У каханні падобнай быць.
Лёсу мележаўскай Чарнушкі,
Закаханай, не раздзяліць.

І купалаваю Паўлінкай
Слова роднае шанаваць.
Еўфрасінні святой галінкай
Ў радаводзе крывіцкім стаяць.



* * *

Возера нібы капейка,
Блікі сонца на вадзе.
Качак шустрая сямейка
Разбівае дзюбай цень.

А яшчэ: нібы на троне,
Лебедзь белы — на вадзе,
Ціха у святла на ўлонні
Сустракае кожны дзень.

Прыгажуняю заранка,
Месяц-серп на галаве.
Зноў Мядзведзіца на санках
Ўноч па возеры плыве.

Ды штораніцы гняздзяцца
Ў кожнай лодцы туманы.
Прахалоды ўжо баяцца
Безгалосыя грамы.

* * *

Раніцы раздзьмуханы касцёр,
Захаду сівыя галавешкі.
Зноў свідруе восеньскія сцежкі
Джалам з лісця малады віхор.

Днём вясёлкі летнюю касу
Да вясны закіне гром за хату.
Пасадзіўшы месяц на лапату,
Кіне ў зорнасць і пралье слязу.

Мо таму кароткі стане дзень.
Што святло на крылах белых гусі
Панясуць у вырай…
Толькі цень
Застанецца тут, у Беларусі.



## Па крыві

Мы па крыві з табой — браты,
Дзе з небам шэпчуцца жыты.
Дзе я шчаслівым быць хачу
І мазалём за ўсё плачу.
Дзе бальшакі вядуць у свет,
Ледавіка азёрны след.
На валатоўкі, курганы
Святыні льюць свае званы.
Дзе znічкі сыплюцца бурштынам
Ў Дзвіну, што бачыла Скарыну.
Дзе белы снег сярод бяроз,
І травы белыя ад рос.
Дзе дзень з мільярдаў дзён — адзін
Завецца часам нарадзін.

* * *

Зноў зіма бы язык прыкусіла,
Не чутно ні завей, ні віхур.
І вясна, не растраціўшы сілы,
Расцягнула вясёлкавы шнур.

Ўшыркі дзень разрастаецца спора,
Сакавік распачаў саракі.
Гнёзды-лапці лазовай аборай
На бярозах шнуруюць гракі.

Ды папар падстаўляе там плечы
Пад вятрыска, каб снегу растаць,
Цень стрыножыўшы, ў хованкі вечар
З поўняй будзе да ранку гуляць.



* * *

Бацькоўскі дом, як карабель у моры,
Дрэйфуе ў белай роскашы снягоў.
Вясною тут хвалююцца разоры,
І толькі ўлетку штыль вакол яго.

Увосень пенай жоўтай лістабою
Аздобіцца ягоны ціхі двор.
Дзяцінства дом плакучаю вярбою
Глядзіць самотна у нямы прастор.

Панік старэча згорбленай страхою,
І ганак — як стаптаны чаравік.
Не фыркне конь з рыпучаю сахою,
Як ранак зноў абвесціць маладзік.

Ды пасля клёпу ў маладой атаве
Каса не будзе бавіць сенны час.
Як вочы, вокны ў ставеньках-аправах
Жывуць надзеяй светлай кожны раз.

* * *

Ты знічка схованкі-сустрэчы,
Ільняных касаў вадаспад.
Мне дараваў спакусны вечар
Далоняў лёгкіх лістапад.

І стану цёплага вяночак,
І неруш спуджаных грудзей.
Кароткі цень пад поўняй ночы,
Падковай згубленаю дзень.

Зарослай сцежкаю да хаты
Дарог скрыжалі маладых.
Цвітуць вяснушкамі дзяўчаты,
Нібы пялёсткамі сады.



* * *

Варон маўклівых чараду
Зноў гоніць вечар да начлегу.
І кураслеп пад шапкай снегу
Глядзіцца ў золкую ваду.

Дзень скручвае рупліва плед
І ветрыкам прасуе сцежкі.
І поўні юная усмешка
Успыхвае на небе ўслед.

І промняў тонкія атосі
Нібыта цягнуць воз цяжкі.
На цені, на начныя восі
Туману скінуты мяшкі.

* * *

Прамільгне зноў зіма, і вясна адзавецца
Ручаём, што, атулены сонцам, звініць.
Адгукнецца пралесцы зноў молада сэрца,
І адтае душа, каб кахаць і любіць.

Ледзяшоў дзіды сонейка вострыць у поўдзень,
Мо кальчугай зазвоніць апоўначы лёд.
Ды няўцерп кожным днём пчолам жыць
у калодзе —
На пухнаціках вербаў зноў сочыцца мёд.

Колюць вочы калючкі сухога дзядоўніка,
Што на снег сыпле попел сатлелых сцяблін.
Паплывуць хмары ўдаль, нібы тыя паломнікі, —
Адагрэцца з зімы ля гарачых краін.

Пройдзе злосць маразоў. Снегіры і сініцы
Адлятуць ад людзей ладзіць гнёзды свае.
У эфіры жывым чысты голас крыніцы
Зноў паўторыць у май малады салавей.



## Жыццё

Усмешцы варта загуляць на твары —
І чалавек, бясспрэчна, зажыве.
Яго ўладарна раскашуюць мары,
І думкам лепшым цесна ў галаве.

Ён — у захапленні ад зямнога:
Не наталіцца чуйная душа
Ні пахам кветак лугу веснавога,
Ні музыкай сухога скавыша.

Гатоў мяняць ён сцежкі на дарогі,
Рукой пакратаць блізкі небакрай.
Тварыць жыццё да стомы і знямогі,
Каб потым сціпла папрасіцца ў рай.

За не адно пасаджанае дрэва,
За родных дзетак, іх шчаслівы час,
За ўласны дом, ад ветру і залевы
Што дабрынёй сагрэе кожны раз.

* * *

У просінь звузілася восень,
Падстрыгла крылы страказе.
Астатнік бусел сонца просіць,
Замёрзлы на адной назе.

Ляцяць лісты, нібыта стрэлы,
З-пад жоўтай цецівы галля.
Туман пад вечар пенай белай
Разліўся густа на палях.

У поўнач поўня неба ўздоўжкі
Захоча мераць, як цалік.
Ці доўга?.. Зноў пакажа рожкі
Над хатай новы маладзік.

## Нарадзіны верша

Вецер праваруч паўднёвы,
Сонца нібы вершнік.
Зноў з душы ірвуцца словы —
Нарадзіны верша.

Вобраз спее ў думках-мроях,
Ўсё ясней здаецца.
То расчуліцца спакоем,
То як птах заб'ецца.

То сягае… У вышыні,
То прастор скародзіць.
І ў радок блакітна-сіні
З-пад пяра пяройдзе.



## Ігнату Буйніцкаму

Дваранскі род і гонар крывічан,
Ды лад жыцця тамтэйшых беларусаў.
Адзін з вядомых ў свеце глыбачан
І уладар шляхецкіх пышных вусаў.

У дождж і снег, на колах ці санях
Вёз радасць у батлейцы простым людзям.
Ды пугай, паганяючы каня,
Спяліў надзею: жыць тэатр будзе.

Цярпеў за мову ад улад папрок,
Строй беларускі быў заўжды ў пашане.
Ад Вільні і да самых Празарок
Віталі Гната ўдзячныя сяляне.

Духоўным бацькам называў народ,
Тэатра бацькам стаў сваёй Айчыне.
Гады сукае веку калаўрот,
Ды памяць не губляецца аб сыне.

* * *

*А. С. Майсеенку*

Ніхто нам, сябар, не заменіць
Ні аркуш белы, ні мальберт,
Калі з душы святло праменіць,
Бо ты — мастак, а я — паэт.

І цудадзейна, з Божым дарам
Уточак выведзе рука
У фарбах, дзе іскрыцца Шчара
І помніць нас дваіх рака.

Дзе кожны дзень, нібыта свята,
Дзяцінства ў Свяціцы гады.
Парог пакліча роднай хаты,
А ты ужо не малады…




# 2011

* * *

У лета твар зялёны ў чэрвень,
Лугоў квяцістых сарафан,
І сонца як гаючы крэмень,
Чаромхі белай дурнап'ян.

Ўпляце істужку ліпень скора,
І лета макаўка міне,
Калі прагрэтыя азёры
Люляюць зоркі ў ноч на дне.

Ды ветразь-хмарка ціхаходам
Паўз неба ў жнівень праплыве.
І ступіць восень у прыроду
З маладзіком на галаве.

## Дзве радзімы

Там радзіма мая, ў маладым Маладзечне,
Ды Глыбоччына — ў сталым мой спадчыны кут.
Беларусі маёй узмужнелыя плечы,
Сховы кожнай душы ад трывог і пакут.

Дзе палі выспяляюць валошкі і жыта,
І спяваюць грамы ў мікрафоны бяроз.
Дзе вясёлка, нібы Беларусі арбіта,
Бліскавіцы-касы адышоўшы пракос.

Вязы Вязынкі, рэй дзе Купалавай мовы,
Тут Драздовіч з Буйніцкім хадзілі ў народ.
Ў глыбачан, маладзечанцаў роднае слова
Мела вечна і мець будзе добры ўмалот.

Тут і там зацвітае зноў папараць-кветка,
Як вулканы, кастры ажываюць тады.
Дзве радзімы мае, як сябрыны-суседкі,
Зноў на лёс паварожаць у век малады.

Пад каронай нябёсамі ўзнятаю поўні
Ці у сонечны дзень зноў з жыцця пуцявін
Я вяртаюся ў думках да кожнай нароўні,
Не парушыўшы клятвы ў любові, як сын.



## Маладзечна

Ты мой астравок маладосці,
Юнацтва майго успамін.
Наведаў цябе я не госцем,
А як маладзечанец-сын.

Мне блізкае, мілае сэрцу
Цяпло тваіх вулак, сцяжын.
Калісьці удоўжкі, здаецца,
Іх вымераў крокам адзін.

Крынічкай Купалава слова
Струменіць у сховах жытла.
Дзе родная матчына мова
Заўсёды ў пашане была.

Шыкуеш ты сёння дамамі,
Дзе вечна сцяліўся папар.
Здалося: я ехаў да мамы,
Ды ў двор да князёўны папаў.

На Віленскім тракце спынюся,
Даруюць хай мне Ермакі.
Я нізка табе пакланюся,
Каб быў маладым на вякі.

## Грамніцы

Грамніцы мне напомнілі пра лета,
Пра жніўня арабінавыя ночы,
Хоць б'ецца ў вокны заляжалым ветрам
Зіма і люты снегам сыпле ў вочы.

А дзень шырэе, і яснее захад,
І разлівае ўсход свой вінны колер.
Ды сакавік спрабуе зблытаць карты,
Адлігай прыйдзе цёплай, як ніколі.

Ды, як вясну, вітаючы грамніцы,
Я птушцы рады у прадонні неба.
Ўжо ледзяшы звіняць, як завушніцы,
Чубы і гусі лапкамі цярэбяць.

І хоць далёка шчэ да бліскавіцаў
І першых гукаў маладога грому,
Вясна зімы адолее граніцы,
Зазелянее траўкай каля дома.



## Родная мова

Дзень слова, свята мовы,
Узведзены ў закон.
Ты скрыпкай адмысловай —
Поўнагалосся звон.

Ты спраўдзіла з дзяцінства
Мяне і ў свет вяла.
Крыніцаю празрыстай,
Гаючаю была.

Я піў цябе глыткамі,
Сухменем — піў нагбом.
І быў удзячны маме
За мой радзінны дом.

Што ён сярод аселіц
Радзімы, дзе мой кут.
Дзе роднае вяселіц,
Дзе жыць жадаю тут.

Бурштынам слова свеціць
І як крышталь звініць.
Ты лепшая у свеце,
Я веру: будзеш жыць!

## Віцебск

На скрыжалях шляхоў старажытных,
Там, дзе Віцьба ўпадае ў Дзвіну,
Ты паўстаў у красе самабытнай,
Перажыўшы вайну не адну.

Называюць паўночнай сталіцай,
Віцяблянам — куток дарагі.
Б'юць фантаны, нібыта крыніцы,
Дзе масты, дзве вясёлкі-дугі.

Скверам, помнікам, новым кварталам
Прыгажэеш, наш Віцебск, штогод.
Ты ў карцінах бяссмертных Шагала,
Ў назвах вуліц твой мужны народ.

Залатых рук майстроў і рабочых,
Мастакоў і паэтаў ты, наш
Віцебск родны, убраннем святочны,
Калі ладзіш «Славянскі кірмаш».

Слаўся, Віцебск, у сэрцы адзіны,
Як жыццё, непаўторны наш лёс.
Ты часцінка вялікай Радзімы
Пад шчаслівым сузор'ем нябёс.



## Восень залатая

Пажухлы круціцца лісток,
Нібы ў цыгарку-самакрутку.
Ды вецер дзьме, бы у свісток,
І белы след па першапутку.

Дзяўчына ўзросту як вясна
Хавае нехаця калені.
Прыходзіць лета ў прымхах-снах,
І карацейшы дзень асенні.

Губляе свежасць жоўты пляж,
І выгляд возера убогі.
І на зімовы макіяж
Пяройдуць людзі і дарогі.

І будзе ўзрушана душа
Зноў Новым годам, несумненна.
Усё апранецца спярша
Ў марозу цёплае адзенне.

* * *

Мастака гэты вобраз яркі,
Ганарыцца выявай свет.
Беларусачку — маці-сялянку
Мне напомніў Мадонны партрэт.

Чаравала ты кожны ранак,
Ў белым вэлюме з туману,
Як ступала нагой на ганак,
Як паклон адбівала дню.

Ў полі хлебным, на лузе росным
З працы рук сваіх жыла.
Для дзяцей заўжды меданоснай
Пчолкай шчыраю была.

Прамільгнуў час адной хвілінай,
Зажурыўся вачэй пагляд.
Ды расчульвае салаўіны
Пошчак маці, як год назад.



* * *

Студня ля хаты на ціхі вулкан
Кожнай вясною падобна. Паводка
З шумам калі зносіць з месца паркан.
У цамбравіны паўзе верхаводка.

Брудам прынесеным змуціць ваду
Жылы крынічнай, што тахкае пульсам.
Так і ў жыцці, на людскую бяду,
Быць першародным не ў час беларусу.

Дзень верхаводкі, як талых снягоў,
Сыдзе. Крынічнае дно заіскрыцца…
Будзе ірвацца сіло ланцугоў,
Каб глыбінёй кожны змог прычасціцца.

## Вясна жанчыны

Як на вярбе раскрыецца пухнацік,
З-пад снегу голас зноў падасць ручэй,
Прыходзіць свята з імем родным — маці,
Праменіць сонца ўсмешкаю ярчэй.

Вясна жыццё дае, нібы жанчына,
Калі прырода, быццам немаўля,
Спавітае празрыстай аблачынай,
Якой калыскай родная зямля.

Маланкі бліск і спеласць навальніцы
Пазней, як снег да сходу прывядзе,
Дзе хмар разлёт, бы бровы чараўніцы,
Якой вясна даруе цэлы дзень.

Прымерыць поўня з зорак завушніцы,
Слязою цёплай знічка упадзе.
Шлюбуе ноч, каб толькі да дзянніцы
З туману ўзбіць падушкі на вадзе.

Час абуджэння — для душы прычасце,
А можа, сэрца споведзі пад стаць.
Сустрэць вясну — жанчыны кожнай шчасце,
Каханай быць і каб самой кахаць.



## Па формуле вечнасці

Парасонам над крыніцай
Распаўзлася навальніца.
Убакі, нібыта спіцы,
Колюць неба бліскавіцы.
А крынічка, нібы сэрца,
Пад дажджом халодным б’ецца…
У сусвеце з’явай вечнай,
Як і Шлях у небе Млечны.
Як світанкі і змярканні,
Як сустрэчы і расстанні.
Як само жыццё бясконца
Ад пылінкі аж да сонца!

## Без вайны

У вачах стаіць воблік жанчыны на лаўцы:
У гумовіках-ботах, у рванай фуфайцы,
У выцвілай хустцы, з сівой галавою,
З апірышчам старцаў — сухой кавялою.

Сіўцоўператлелых пад колер паглядам,
З адвечнай высновай: « Я, Божанька, рада
Жыццю, што дарована сённейка мне…
Мой муж на апошняй застаўся вайне.

Не зведала шчасця дзяцей мець, сям'і,
Цяпер дажываю свой век на зямлі.
Хаціна мая — не цяперашні мур,
Жыву без вайны, без вайны і памру…»

Я верыў жанчыне у шчырасць тых слоў,
Ды шмат супярэчлівых думак расло…



* * *

Адспяваў май салаўямі
І адснежыў цветам.
Густалістымі гаямі
Зашумела лета.

Новым мёдам канюшына
Зноў частуе роі.
Мерыць промнем, як аршынам,
Сонца жыта ў полі.

Ажываюць агароды
Сеяным насеннем.
Зноў жаданай прахалодай
Раскашуюць сені.

Цераз край у гнёздах яйкі.
Птушак пакаленне
Пырхне ў неба новай стайкай
У адлёт асенні.

Перад ноччу вечар ў жмуркі
Доўга з днём гуляе.
Месяц, нібы кот з пячуркі,
Мкне з-пад небакраю.

# Асенні дождж

Асенні дождж, нібы абдымкі
Непажаданыя, калі
У цябе ў запасе ні хвілінкі,
Трымаюць, бы ў палон ўзялі.

А кроплі, нібы з лука стрэлы,
Пасланы цецівой нябёс.
Страляюць у азёраў цела
І шротам сыплюцца на плёс.

Ды ручаі, падобна магме,
З гразёй сцякаюць напрамкі.
Раллёй ваду глытаюць прагна
Палёў счарнелых астраўкі.

І дзень ад холаду пагасне,
І вечар прыйдзе ў кожны двор.
Ды ноч пасля асенняй лазні
Ад росаў вырасце да зор.



* * *

Мне б параўнаць цябе з вясной,
Што кожнай птушачцы і зёлцы,
І муравейку, і лясной
Даеш жыццё ты дзікай пчолцы,
Мне б параўнаць цябе з вясной.

Мне б параўнаць цябе з вясной,
Ад сонца цёплага дыхання
Бярэцца ў сілу зверабой,
Дзень нараджаецца з світання.
Мне б параўнаць цябе з вясной.

Мне б параўнаць цябе з вясной,
Парою светлай і жаданай,
З дзяцінства роднаю зямлёй.
Жыцця ты сімвал, мая мама.
Мне б параўнаць цябе з вясной.

Мне б параўнаць цябе з вясной,
Ды толькі гэты час далёкі
Ужо не вернецца з табой.
Ты там, дзе вечнасці аблокі,
Дзе свет бяздонны і спакой.

## Лета 2010 года

Распавяду сваім нашчадкам
Пра дзень-сухмень і лета жар,
Як вецер біўся у прыпадку
І раздзімаў агмень-пажар.

Нібы лязом, агнём галіцца
Збіраўся ліпень, як вар’ят.
На крок ніводнай навальніцы
Не падпускаючы, аднак.

І апускаўся смог балотны
Туманам чорным на людзей,
І выступаў гаркавым потам,
Атравай едкай для грудзей.

Аслеп бы месяц, з кожнай ночай
Знікалі зоркі ў вышыні.
Ўладарна змей-гарыныч крочыў
І сеяў гора дзень пры дні.

Палі гарэлі, сена копы —
Ўсё нішчыў крыважэрны звер.
Травой зарослыя акопы
Чарнелі шрамамі цяпер.

У рэшце рэшт як непрыяцель
Прад сілай спасаваў людской.
Дарыла сонца кожнай хаце
Жыццё надзею і спакой.



* * *

Азерца поўнае вады,
Бы чарка зноў на пасашок.
Дажджы грыбныя ў халады —
Цыклон па восені прыйшоў.

Хоць верасень, заняўшы трон,
У лета бабіна ідзе,
Дзе дрэў зялёны парасон
Ўсё летнім колерам радзей.

Ніжэе неба да зямлі,
Блакіт губляе светлы свой.
І прыбаўляюць зноў палі,
Нібыта рошчынай, раллёй.

Надзене белы кажушок
Туман густы на паплавы.
Ноч лёгкі месяца ражок
Не скіне з чорнай галавы.

## Год белай чаплі

Чапля белая
і вялікая —
Птушка смелая,
хоць і дзікая.
У глушы жывеш,
дзе вады спакой.
Адзінокай лепш
ў балаціне той.
Дзе куп'ё, і мох,
і сыпчак-пясок.
Дзе адбітак ног
як жыцця радок.
Чаплянятак род
прадаўжаецца.
Птушкі белай год
не канчаецца…



## Гімн вадзе

Мой абярэг, мая крыніца,
Парой дзяцінства што напіцца
Мог часам душным і спякотным,
Такім далёкім, незваротным,
Дзе маладою маці помню
І рукатворную жвіроўню,
Дзе час свой бавілі, гулялі
І стаць дарослымі жадалі.

Ў вачах і зруб драўляны студні,
У пік вячэрні месцам людным
Было заўсёды, ды не шумным.
І, як студзёнае прычасце,
Паўнюткі вёдры, бы на шчасце,
І карамысла, быццам вагі,
Заўжды было для раўнавагі.

Малому быў калодзеж дзівам,
Адкуль вадзіцу для паліву
Пазней у бочкі налівалі,
Пад сонцам летнім награвалі.
І пара, як бальзам, у лазні,
Ад духу веніка з бярозы
Ў траву кідаўся, нецвярозы.

Ды з вышыні жыцця арбіты
Раблю свой вывад самавіты,
Што хлеб асновай сілы служыць,
Запрацаваны, саматужны.
Чаго не скажаш пра ваду:
Яна ў расе, ў дажджы, ў зярнятку.
Жыцця ўсяго яна пачаткам.

## Канец зімы

Дзень раптам снегам выпаў ноччу,
І стала светла, хоць збірай
Іголкі. І чаруе вочы
І белы сон, і белы рай,

І белы храм, дзе памаліцца
Зноў прагне скутая душа.
Дзе неба зорамі іскрыцца,
Дзе ветах месяца спярша.

Мяжою лёткай прасігналіць
У цішы стоенай прастор.
І дрэвы, нібыта гусары,
Ўязджаюць ценем ў кожны двор.

Паветра, як бальзам зімовы,
Што снег фільтруе і мароз.
Вясны шчэ твар ў лядовых сховах,
Хоць са страхі лядзяш, як нос.

І белы дым над хатай свечкай,
І ніткі знічак залатых.
Кусты, як белыя авечкі,
Ў дазоры белыя платы.



## Студзеньская ноч

Стаяла студзеньская ноч,
І дрэвы — не адвесці воч,
Нібы крыштальныя, трымалі
На голлі інею каралі.
А неба зоры асвятлялі.

Мільярдам, бачным простым вокам,
Іскрынак яркіх жар высока
Мігцеў, кружыў, пераліваўся,
Бліскучым роем ў ногі клаўся
Ды ў вечным руху заставаўся.

Зямля здавалася ў палоне
Снягоў сыпчатых. На далоні
Лілася цішыня струменем,
Кусты, бы рогі у аленяў,
Трызненне лучылі ад ценяў.

Бяскрайні казачны прастор,
Дзе безгалосы цемры хор.
Паходня — месяца падсветка
Над полем белым, як сурвэтка,
Дзе усяго ты толькі сведка.

* * *

Люблю я барвы восеньскія змалку,
Цяжкога неба сонца астраўкі,
Дзе праз вясёлку, быццам бы скакалку,
Шыбуе хмара злёту напрамкі.

Свяжуткі вецер, восені паломнік,
Імклівa прабяжыцца па вадзе.
Калючкі вострыць ля платоў дзядоўнік
І чэпіцца да кожнага, хто йдзе.

Вясной ўзыходзіць пераможна траўка,
Жыццё бярэ свой векавечны рэй.
Ды лашчыць зрок зноў восенню атаўка,
І пах зямлі, вясковец што арэ.

Як чараўніца, восень залатая,
Ты зебрай хваль палоніш кожны раз.
Марудны час, як раніцай світае,
І дзень, як знічка, што ў святле пагас.



## Экватар лета

Разлілося морам лета
Ў ліпень месяц самы.
Перапоўнены палеткі
Жытам і аўсамі.

Поўны штыль, як кінуць вокам —
Даўгунца шарготкі.
Ў небе белыя аблокі,
Бы па курсу лодкі.

Матылькі — жывыя кветкі,
Крыльцамі палаюць.
Як шары, ў садах ранеткі
Ў голлі дагараюць.

## Запавет нашчадкам

Для кожнага ў свеце і сонца, і зоры,
І неба блакіт, і вятроў перазовы,
Крыніцы спатольнай сама чысціня,
Зямное імгненне пражытага дня.

Цані, чалавеча, усё на зямлі:
Снягоў сыпчакі, сілу грому з маланкай,
Бяскрайнасць пустыні, бакенаў агні,
Як толькі прачнешся штодня ты уранку.

Ты самы шчаслівы — жывеш на зямлі
І маеш сяброў, табе роўных і родных,
І мову, як водар паветра, цані,
Нашчадкам, як дар, перадай яе годна.



## Незваротнае

Здалося, ўчора плеценым кашом
Я застаўляў пад топкія навесы.
Піскур, мянтуз, нібы сапраўдны сом,
Былі маім рыбацкім інтарэсам.
Віры адны, хоць рэчкі не было,
Ды кожны памяць меў нядобрай славы.
Наводзіў страх на цэлае сяло,
А для дзятвы мясцінай быў паплавацъ.
Трымаў ўжо сонца захад на руках.
Надзеўшы коням путы для спачыну,
Ватагай дружнай мы трымалі шлях
Туды, дзе вір нёс прахалоду спінам.
Мне б скінуць разам той цяжар гадоў,
Як рэчыўны мяшок з жыцця бясцэнным грузам.
І сёння ў вір зноў кінуцца гатоў,
Ды ўжо табун не той пасецца ў лузе.

* * *

Вітаю новую вясну,
Што мільгане табе пралескай
І кураслепавым узлескам
Асвеціць елку не адну.
Ды беллю веснавых садоў
І снежным покрывам пялёсткаў,
Чаромхі з хваляй халадоў
І гронкай бэзу кожнай вёскі.
Услед шыпшыны гойны жар,
Бразготкі белыя каліны
Вясны у лета мілы твар,
Як беларусачкі-дзяўчыны.
Рабіны колеру снягоў
І куст успыхнуўшы язміну.



* * *

Вясны чакаюць птушкі і жанчыны,
Адны — гняздо пад крыламі сагрэць.
Каханнем сэрца запаліць мужчыны
І ў полымі пачуццяў не згарэць.
Жанчына птушкай ў вышыню сягае,
У марах-снах няскончаны палёт.
І толькі здрада сілы надрывае,
А ў лёсе — нечаканы паварот.
Люблю вясну, і птушак, і жанчыну
Сустрэць на радасць стомленай душы.
Хай кожны з іх у сэрцы след пакіне,
Ты толькі жыць на свеце не спяшы…

## Гімн пчале

Пчала не думае пра смерць,
Пчала пра жыццё дбае.
Ляціць, дзе кветачка цвіце,
З яе нектар збірае.

Як толькі займецца зара,
Шчэ птушкі сном спавіты,
А пчолцы ўжо ляцець пара,
Ёй шлях у дзень адкрыты.

Ды ходак ў вулей не злічыць
З пылком, бы кветак дарам.
Аддасць свой груз, назад ляціць,
І так да ночы самай.

Не завязаўся б агурок
І цвіў сад пустацветам.
Каб не чароўны хабаток,
Што каранue лета.

Пра век кароткі ёй няўцям,
Па волі пчалы-маткі
Да крыльцаў немачных яна
Працуе без аглядкі.

Ды першы раз не прынясе
З нектарам ношку ў вулей.
Яе вятрыска панясе
У рай. Хай рой шчыруе!



## Год каня

Раздольна конь пасецца ў лузе —
Мінуўся наступ табуноў.
Вясна трымала днямі ў плузе,
Каб адпусціць на ноч ізноў.

Шчэ цені вечара як путы
Для згаладнелага каня.
Ды, воляй дзікаю раскуты,
Аб высілках забудзе дня.

Адчуе ноздрамі дыханне
Зямлі, ажыўленай цяплом.
І на расу ўпадзе світаннем,
Каб прызабыцца моцным сном.

Яму прысняцца шал Пагоні
І пругкасць шпораў ваяра,
Яго гарачыя далоні
І пераможнае «ура!».

Ды зноўку норавам ціхмяным
Без цугляў лейчыну спазнаць.
У баразне стаяць слухмяным
І ціха вобземкі сканаць.

## Дуб

У дуба бархатны сезон.
Вакол у чырвані рабіны,
І толькі з жалудамі ён
На вецці, як рагах ласіных.

Ні дождж, ні рэдкі градабой
Не адарве жалуд няспелы.
Хоць папяроўкі да адной
У жнівень з яблыні зляцелі.

А ён, самотны прыгажун,
За лета верасень прымае.
Над ім запознена пярун
Маланкай неба расшывае.

Кустом бязлістым ягамосць
Арэшнік ціха вечаруе.
А дуб, нібы нязваны госць,
Ўсіх яркай зеленню чаруе.

І жоўты ліст пачне раняць,
І сыпаць звонка жалудамі,
Каб ласкі сонца не спазнаць,
Прамёрзшы снежня халадамі.



## Птушкі зімы

Ёсць птушкі, што нас пакідаюць
Асеннім няветлівым днём,
Як лісце да ног ападае,
А кроны палаюць агнём.

Мне птушкі мілей аднал юбы
І людзям, і краю свайму.
Сініцы, што ў шыбіны дзюбай
Пазвоняць не раз за зіму.

З’ яднаныя дружбай крылатай,
Ім край, як і мне, дарагі,
Маўклівыя галкі над хатай,
Вароны, што вершаць стагі.

Па леце тужлівую радасць
З сабой прынясуць галубы.
І шустрай сямейкай над садам
Вяселяць душу вераб’і.

Ды святам у холад зімовы
Здаецца імгненне пары,
Як з неба дэсант адмысловы
Свой скінуць ў мароз снегіры.

А ў лесе сарокі і сойкі
Страсаюць сняжынкі з галін.
Дупло для рахманай вавёркі
Выдзёўбвае дзяцел адзін.

## Нарадзіўся Янка

Вязы, дроў вязанка,
Вязынка-сялянка.
Хата з брылём-ганкам,
Дзе спявала Янку
Маці калыханку.

З травы тканым паскам,
Дзе зліліся краскі,
Спавівала лета
Не дзіця — Паэта.

Лёгкія вятрыскі
Гойдалі калыску.
Гаі і дубровы
Неслі гукі мовы.

Бліскавіцы струны
Рвалі ўноч пяруны.
Хмараю над полем
Слалася нядоля.

Ды радзінаў сведка —
Папараці кветка.
Каб рушыць папары
Жыцця Божым дарам.

Ды здабыць свабоду
Вершам для народа.
Каб у кожнай хатцы
Заўжды
ЛЮДЗЬМІ ЗВАЦЦА….



* * *

Нудзіцца восень. Пакідаюць
Папінкі познія сукі.
І туманы, як слімакі,
Да ўзгорка шчыльна прыліпаюць.

Азізла ўсё. І скавышы
Заціхлі ў позе нечакана.
І толькі поле свежай ранай
Чарнее мёртвае ў цішы.

Суцемак дня. А сам прастор
Падобны на рабое зрэб’е,
Дзе лісце з маладзенькіх вербаў
Сцякае ў жорнавы азёр.

Час безгалосы. Не сняжыць,
Слатою душы прыручаем…
Ізноў пачуцці хлынуць маем,
Як луг званочкам зазвініць.

* * *

Я родам з той зямлі, што стала
Радзімай песняра Купалы.
Ды блізкі той куток мясцін,
Дзе Багдановіч быў Максім.
І Ракуцёўшчыны скрыжалі,
Дзе вечна сеялі і жалі.
А Хоўхлава мястэчкам людным
Было калісьці, дзе сам Будны
Прадоўжыў кнігадрук Скарыны
У час далёкі, час былінны…
Дзе Ермаловіч з Каханоўскім
Віталі дом мой ермакоўскі.



* * *

Жнівень карануе лета
Ў небе месяца сярпом,
На зямлі — вяночкам з кветак,
На вадзе — чаўна вяслом.
Паяском тугім туману
Звяжа сенныя стажкі
Ды вясёлкай, нібы кранам,
Знясе хмараў астраўкі.
На асцё падобны восы,
Вулей — яблык наліўны,
Цень няскончаным пракосам
Падганяе сонца дні.
Вецер зранку прахалодай,
Бы намоклы ручнічок.
Толькі цешыцца свабодай
Кропкай бачнай каршучок.

* * *

Мароз учэпіста трымае
У ледзяшах карункі стрэх.
Жаўрук у небе сола грае
Пад ручаёў вясновы смех.

І волі прагне ўжо пралеска,
Прабіўшы снегу шкарлупу.
Ды восень выцвілаю фрэскай
З пагоркаў змыецца ў раку.

Вясна зноў модніцай найпершай
Жаданай прыйдзе ў раз які.
Паэты зноў напішуць вершы,
Карціны створаць мастакі.




# 2003

## Наш горад

Адвеку стаіш у абдымках азёраў,
Бароў атачэнні і гмахаў бажніц.
Гаючым дыханнем Балтыйскага мора
Асвечаны водар падземных крыніц.

*Прыпеў:*

Наш родны горад — калыска дзяцінства,
Дзе ранак іскрыцца бурштынам расы.
Нам толькі б паветрам тваім прычасціцца,
Душою адчуць першароднасць красы.

Ты Корсакаў родам і славай Сухога
Заўжды ганарышся у буднях сваіх.
Нам месца не трэба у свеце другога,
Глыбоцкі куточак адзін дарагі.

*Прыпеў.*

Заўжды да цябе мы спяшым на сустрэчу,
Табою, Глыбокае, ў думках жывём.
Табе прысягаем ля сцен Беразвеччы,
Мы памяці варту дастойна нясём.

*Прыпеў.*

Мы ўсе ад зямлі землякі-глыбачане,
Руплівыя ў працы вялікай сям’ёй.
І верныя ў дружбе, любві і каханні,
Адметныя ў свеце сваёю душой.

*Прыпеў.*



## Глыбачанка

Як сонца пазалоціць горад ранкам,
Асвеціць зноў азёраў глыбіню,
Парушыць лёгкім крокам глыбачанка
Знаёмых вуліц першай цішыню.

*Прыпеў:*

Ты ўладарка жыцця, глыбачанка,
Ганарыцца наш горад табой.
Род ідзе ад святой палачанкі,
Ад сястры Еўфрасінні святой.
Бо руплівая вечна у працы,
Казкай рук ты здзіўляла падчас.
Для цябе будавалі палацы.
Вершы і песні складалі не раз.

Ты светлы вобраз маці і каханай,
Сямейных гнёздаў вечнае цяпло.
За прыгажосцю, знешне прыхаванай,
Душы тваёй чароўнае святло.

*Прыпеў.*

Спявае гімн табе вясной прырода,
Зязюля лічыць вечнасці гады.
Дык будзь жа ты шчасліваю заўсёды
І сэрцам маладою назаўжды.

*Прыпеў.*

## Азёры Глыбоччыны

Тут прыстань спаконвечных тумаnоў
І лецішча вясёлак ў навальніцу,
Куды душой імкнешся ты ізноў,
Не здолеўшы красою наталіцца.

*Прыпеў:*

Азёры, азярыны, азяркі
Глыбоччыны — бярозавага краю,
Дзе Доўгае слязінкаю ракі
І Шо крынічкай дзень благаслаўляе.

Кароткі сон чаўноў у чаратах,
І летніх зорак ў небе завушніцы,
Дзе ў поўнач месяц на ваду, як птах,
Штоноч з вандроўкі стомлена садзіцца.

*Прыпеў.*

Ў час безгалосся снежнае зімы
Здзіўляеце глыбінямі сваімі.
Да вас прыходзім белым полем мы,
Каб заставацца сэрцам маладымі.

*Прыпеў.*



## Глыбоцкае танга

Нідзе прыгажэйшай
Мясціны не знойдзеш,
Хоць ўсю Беларусь
Ўдоўжкі, ўпоперак сходзіш.
Дзянніцы азёраў,
Як вочы дзяўчыны,
Дзе шчасця падкову
Час людзям пакінуў.

*Прыпеў:*

Запальвае месяц
Зноў свечкі каштанаў.
Глыбоцкае танга
І майская тайна.
Дзе шэпчуцца сэрцы
У бэзавы квецень,
Дзе казкай здаецца
Каханне на свеце.

Сіло весляра —
Вясёлка на ўдачу.
Душа званара
У званіцах тут плача.
І Копцеўкі сум,
Бору вечная скарга.
Глыбоцкае танга,
Глыбоцкае танга.

*Прыпеў.*

Мой горад старынны,
Без вуліцаў шумных.
З узростам былінным
І поглядам юным.
Снуе кожны род
Свае кросны надзеі.
І горад штогод
На вачах маладзее.

*Прыпеў.*



## Глыбоцкі вальс

Глыбачанам ты горадам родным
У жыцці і у песні адзін.
Дык крыяй белым ветразем годна
Між азёраў для ўсіх з нарадзін.

*Прыпеў:*

Горад шчырых людзей,
Дзе гасцям дзверы насцеж адкрыты.
Горад светлых надзей,
Закаханых сапраўдных сяброў.
Дзе каваль, і мастак,
І спявак, і пісьменнік масціты
Славу множаць тваю
Непадзельна са славай сваёй.

Тут пад квадраю новай стагоддзі
Раскідалі ўздоўж вуліц муры.
Б’юць крыніцы жывыя на сподзе
З незапамятнай даўняй пары.

*Прыпеў.*

Над святынямі голасна чайцы,
Шлюбна звоняць бажніцаў званы.
Шпіляў цягнуцца белыя пальцы,
Дзе аблокаў плывуць дываны.

*Прыпеў.*

Ля фантана дзень доўжыцца ўлетку,
Вечарує у парках зіма.
Вясна з восенню прыйдуць у кветках,
Лепш Глыбокага ў свеце няма.

*Прыпеў.*



## Першая настаўніца

Па школьнай вуліцы штодня
Ідзе, усмешка свеціцца.
І людзі ўсе нібы радня,
Яна ім сэрцам верніца.

*Прыпеў:*

Каралева кожнай раніцы —
Наша першая настаўніца.
Светлавокая, чарнабровая,
Жоўтым вераснем зачаравана,
Белым маем закаханая,
І жаданая, і чаканая.

Мадонна школьная мая
Багіняй стала дзецям.
Нам постаць сціплая твая
Заўжды святой здаецца.

*Прыпеў.*

Цячэ урок, нібы ручэй,
Звініць званок, як жаўранак.
І не шукаеш, дзе лягчэй,
Ад Бога ты настаўнік.

*Прыпеў.*

На аркуш белага ліста
Зімовы змрок лажыцца.
Начэй бяссонных ты сястра,
Заранaчка-зарніца.

*Прыпеў.*

## Белая ноч

Пад святлом Венеры-зоркі
Ткуць свой майскі паясок
Затравелыя пагоркі,
Дзе як золата пясок.

*Прыпеў:*

Веснавей каб не сурочыць,
Узышоў маладзічок.
Беларускай белай ночы
Развязаны каснічок.

І зрываюцца з галінак
У салодкі сон гракі.
Растрывожылі маліннік
Маладыя салаўкі.

*Прыпеў.*

Цень каліткаю за хатай,
Бы ў каралях ад расы.
Вербы ніцыя — дзяўчаты
Распусцілі валасы.

*Прыпеў.*

Клён, бы хлопец той нясмелы,
Закахана шле пагляд.
Засыпае самы белы
Першацвет вясновы сад.

*Прыпеў.*



І бялее зноў каўнерык
Туману над азярком.
Белай ночы насцеж дзверы
Адчыняе кожны дом.

*Прыпеў.*

## Майскае свята

Безыменных герояў няма,
Ёсць героі, героі, героі.
Вострым болем скрамсала вайна
Сэрцы матак ў маўчаннях сыноўніх.

*Прыпеў:*

У душы і на сэрцы зноў май,
Незабыўнае ў памяці свята.
Услаўляе радзімы наш край
Пераможны ў вайне сорак пяты.

Без бацькоў расцвітаюць сады,
Без дзядоў падрастаюць унукі.
Цішынёю вясновай гады
Праліліся праз нашыя рукі.

*Прыпеў.*

Час далёкі дыхне старыной —
Ад салдата пажоўклым канвертам,
Што дасланы апошняй вайной
З лепшай весткай пра мір ўсяму свету.

*Прыпеў.*



## Змест

Гарановіч Віталь Рыгоравіч ........ 5

**Ён будзе жыць у памяці нашчадкаў**

Незабыўны ........ 9
Яго Беразвечча ........ 12
Яго прызванне — быць паэтам ........ 14
Бярозавік Віталя Гарановіча ........ 16
Настаўнік, прафлідар, паэт ........ 17
Віталь Гарановіч — у вершах і песнях застаўся ........ 19
Да Дня пісьменства, Віталь Гарановіч, 2012 год ........ 22
Святочная песня ........ 23
Віталю Рыгоравічу ........ 24
В. Г. Горонoвичу посвящается ........ 25
* * * Вам дарована Вашым лёсам… ........ 26
Памяці В. Р. Гарановіча ........ 27
Як гасціў! ........ 28

**Вершы, якія не ўвайшлі ў зборнікі**

Ва ўнісон зіме ........ 31
Малады снежань ........ 32
* * * Вясны закончана прэм’ера… ........ 33
* * * Калі жыццё звяло у нерат… ........ 34
* * * Пабыць стоўпнікам у святы… ........ 34
* * * У завіруху бабінага лета… ........ 35
* * * Ноч змусіла усё жывое… ........ 36
Камета веку ........ 37
* * * Бы з крэсіва ўспыхваюць знічкі… ........ 38
* * * З развагай пачварнаю вораг… ........ 39
* * * Светлая ноч, не заснуць, не спачыць… ........ 40
* * * Калі зялёная галінка… ........ 41
* * * Адплыло сцягамі павуцінне… ........ 42
* * * Зімовы дзень, нібы луска, бліснуў… ........ 43
Па крузе жыцця ........ 44
Ад восені да вясны ........ 45
* * * А ў памяці дзяцінства, нібы ранне… ........ 46
Вачыма рыбака ........ 47

* * * Вясна з зімой у пацягушках… 48
* * * Пабыць на Нарачы увосень… 49
* * * Астравок асакі… 50
Вераб’іная ноч 51
* * * Ратоўны круг — мая надзея… 52
* * * Я стрываю ад холаду… 53
* * * Цяпло сяброўскае рукі… 54
* * * Нялёгкай справай ягамосці… 55
* * * Чалавек на дабрыню як донар… 56
* * * Заблытаюся ў валасах дзявочых… 57
* * * Калені твае, нібы свечкі… 58
* * * Ты мяне кахай… 58
* * * Ты сказала: «Бывай»… 59
* * * Хмелем маладым… 60
* * * Твае валасы — залацістая ноч… 61
* * * Лона ракі, як жаночае лона… 62
* * * Прадкажы мне, зязюля, гады… 63
* * * Сэнс жыцця ў прыроды нязменны… 64
* * * У моцнага ветру — моцны дух… 64
* * * Калі чалавек нараджаецца… 65
* * * Без спасылкі, што малады… 66
Фантазія зімы 67
Дырэктар 68
* * * Першы восеньскі дзень… 69
* * * Урок роднай мовы… 70
* * * Тут мова матчына саткала… 71
* * * Набіў аскому я бананам… 72
* * * Быў маладзейшы — тост за Любу… 72
Нарач 73
Маё Глыбокае 74
Беларусь 75
* * * Беларусь! Ты завеш… 76
Лес і лёс 77
Вясна і вайна 78
Першага верасня 79
Антырэквіем 80
Крыўскае слова 81
Хатынь 82
* * * Прыходзіць восень залатая… 83



Жанчынам 84
Хрэсніцы 85
Жаніцьба Цярэшкі 86
На гары Маяк 87
Мелодыі вясны 88
* * * Мелодыю душы спраду… 89
* * * Мой народ — як дзічка ў полі… 90
* * * Нібы заяц… 91
* * * У гэты дзень, у гэты час… 92
Будслаўская пілігрымка 93
Вясенні вальс 94
Вясна — пара кахання 95

**Нарысы**

Белы лебедзь 99
Па хвалях маёй памяці 104
Верчыны плыты памяці 107
З дзяцінства 112

**1997**

Справа і слова паэта 117
Саракі 120
Родны дом 121
Беразвечча 122
Матуліна вясна 123
Бацькаў успамін 124
Вучням 125
* * * Зямля мая, мая сябрына… 126
* * * Павуцінне коціць ліставей… 127
Мая радасць 128
Глыбокае 129
* * * Не бойся рукі апячы аб хлеб… 130
* * * Верасень — вера асенняя… 131
Прызванне 132
Вякам 133
* * * Чакаць бяды не трэба… 134
* * * Ранак, як рамонкавы пялёстак… 135
* * * Гады — плыты Жыцця ракі… 136

* * * Пасеяў снежань белую расаду… 137
* * * Той стаяў снег, што нам адкрыў лыжню… 138
* * * Зімой віхурна ўздыбяцца снягі… 139
Настаўніку 140
* * * Дачакаўся вясны… 141
Прызнанне 142
* * * Мае сцюдзёныя віры… 143
* * * Вязуць бярозавыя дровы… 144
* * * Я адчуваў сябе найбольш багатым… 145
Першае каханне 146
* * * Вясны замглёны рэдкі дзень… 147
* * * Не вярнуць свайго юнацтва… 148
* * * Ты ў жыцці нібы тайна… 149
Падаюць яблыкі 150
Код кахання 151
* * * Пад святлом Венеры-зоркі… 152
Каханне 153
* * * Хачу ў жыцці трывогі… 154
Запаветнае 155
Пара раўнадзенства 156
* * * Шчэ месяц жніўны на календары… 157
Мае Налібокі 158
* * * Вядзі мяне, дарожка-сцежка… 159
* * * Белыя заплаткі… 160
Мая просьба 161
Дуб Гётэ 162
Плач Бухенвальда 163
Сафійскі сабор 164
Аб хлебе 165
Вечар сустрэчы 166
Прадаўжэнне 167
* * * Дажджу жадаюць — не клянуць… 168
Альма-матар 169
Пасля дажджу 170
* * * Усё цяжэй пчале знаходзіць кветку… 171
Да лета 172



**2002**

Святло блакіту 175
* * * Сумуе сонца днём па леце… 176
* * * Вочапам захад над бруйнай ракой… 177
Летам 178
На восень 179
* * * Апошні снег зімы-вяртанкі… 180
Крэскі вясны 181
Позняе 182
* * * Які магічны паварот… 183
Пад паўночнай зоркай 184
Нараджэнне вады 185
* * * Заносіць пяском парог… 186
За год да XXI стагоддзя 187
* * * Чаўны, чайкі, час шыпшыны… 188
Дачы на Нарачы 189
Завіруха 190
Сёстрам 191
Пачатак зімы 192
* * * Бераг. Вечар. Кастроў веча… 193
Рабінавы дзень 194
Змена квадры 195
Дома 196
* * * Вырай — растрывожаны вулей… 197
Экватар зімы 198
* * * Зноў конікаў цырульня… 199
Фантазіі вясны 200
Вачамі мастака 201
* * * Быў. Ёсць і буду. Дзе асеў народ… 202
* * * Паўночны край. Глыбоччына. Радзіма… 203
Навальніца 204
* * * Нібы плугам, сум разганю… 205
* * * Красуе ў Беларусі жыта… 206
Двое ў лузе 207
Пасля дажджу 208

## 2007

Акварэлькі вясны ........ 211
* * * Ах, якія зоры!.. ........ 212
Нечаканы антракт ........ 213
* * * Мядзведзіцы жоўты вазок… ........ 214
Ідылія ........ 215
* * * Дарагое, як сон. У той хаце… ........ 216
* * * Жанчына гаворыць… ........ 217
Не арэхавы год ........ 218
Зыход лета ........ 219
Канец дня ........ 220
Прэлюдыя восені ........ 221
Пакровы ........ 222
* * * Выжарыны спаленых хат… ........ 223
Крывічанка ........ 224
* * * Возера, нібы капейка… ........ 225
* * * Раніцы раздзьмуханы касцёр… ........ 226
Па крыві ........ 227
* * * Зноў зіма бы язык прыкусіла… ........ 228
* * * Бацькоўскі дом, як карабель у моры… ........ 229
* * * Ты znічка схованкі-сустрэчы… ........ 230
* * * Варон маўклівых чараду… ........ 231
* * * Прамільгне зноў зіма, і вясна адзавецца… ........ 232
Жыццё ........ 233
* * * У просінь звузілася восень… ........ 234
Нарадзіны верша ........ 234
Ігнату Буйніцкаму ........ 235
* * * Ніхто нам, сябар, не заменіць… ........ 236

## 2011

* * * У лета твар зялёны ў чэрвень… ........ 239
Дзве радзімы ........ 240
Маладзечна ........ 241
Грамніцы ........ 242
Родная мова ........ 243
Віцебск ........ 244
Восень залатая ........ 245
* * * Мастака гэты вобраз яркі… ........ 246



* * * Студня ля хаты на ціхі вулкан… ........ 247
Вясна жанчыны ........ 248
Па формуле вечнасці ........ 249
Без вайны ........ 250
* * * Адспяваў май салаўямі… ........ 251
Асенні дождж ........ 252
* * * Мне б параўнаць цябе з вясной… ........ 253
Лета 2010 года ........ 254
* * * Азерца поўнае вады… ........ 255
Год белай чаплі ........ 256
Гімн вадзе ........ 257
Канец зімы ........ 258
Студзеньская ноч ........ 259
* * * Люблю я барвы восеньскія змалку… ........ 260
Экватар лета ........ 261
Запавет нашчадкам ........ 262
Незваротнае ........ 263
* * *Вітаю новую вясну… ........ 264
* * * Вясны чакаюць птушкі і жанчыны… ........ 265
Гімн пчале ........ 266
Год каня ........ 267
Дуб ........ 268
Птушкі зімы ........ 269
Нарадзіўся Янка ........ 270
* * * Нудзіцца восень… ........ 271
* * * Я родам з той зямлі, што стала… ........ 272
* * * Жнівень каранue лета… ........ 273
* * * Мароз учэпіста трымае… ........ 274

## 2003

Наш горад ........ 277
Глыбачанка ........ 279
Азёры Глыбоччыны ........ 280
Глыбоцкае танга ........ 281
Глыбоцкі вальс ........ 283
Першая настаўніца ........ 285
Белая ноч ........ 286
Майскае свята ........ 288

*Літаратурна-мастацкае выданне*

ПАГАВАРЫ СА МНОЙ

*Памяці Віталя Гарановіча*

Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*
Рэдактар *А. Спрытніч*
Вёрстка *Л. Ваўчок*
Карэктар *А. Спрытніч*

Падпісана да друку 23.12.2014. Фармат 84×108 $^{1}/_{32}$.
Папера афсетная. Рызаграфія. Ум. друк. арк. 15,96.
Ул.-выд. арк. 6,68. Наклад ??200 ас. Зак. .

ПУП «Кнігазбор».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюдніка друкаваных выданняў № 1/377 ад 27.06.2014.
Вул. Я. Лучыны, 38-93, 220112, Мінск.
**Тэл./факс (017) 207-62-33,**
**тэл. (029) 772-19-14, 682-83-86.**
E-mail: bkniha@tut.by

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка ў ААТ «Аргбуд».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюдніка друкаваных выданняў № 2/167 ад 1.10.2014.
Вул. Берасцянская, 16, 220034, Мінск.